Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва

Кафедра этналогіі і фальклору

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры

_________В.В.Калацэй
20красавіка2017 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта

__________Н.У.Карчэўская
27 красавіка2017 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# МЕТОДЫКА АРГАНІЗАЦЫІ ФАЛЬКЛОРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*для напрамку спецыяльнасці*
*1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор)*

Складальнік: Т.А. Пладунова, старшы выкладчык установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 23 мая 2017 г.
пратакол № 9

**СКЛАДАЛЬНІК**

*Т.А. Пладунова, старшы выкладчык установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Рэцэнзенты:**

*кафедра тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;*

*Г.А. Барвенава, загадчык аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт*

**Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:**

*кафедрай* этналогіі і фальклору ўстановыадукацыі «Беларускідзяржаўныўніверсітэткультурыімастацтваў» (пратакол ад 20 красавіка 2017 г. № 9);

*саветам факультэта* традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановыадукацыі «Беларускідзяржаўныўніверсітэткультурыімастацтваў» (пратакол ад 27красавіка 2017 г. № 9);

*саветам* установыадукацыі «Беларускідзяржаўныўніверсітэткультурыімастацтваў» (пратакол ад 23 мая 2017 г. № 9)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: А.У.Рагуля

Адказны за выпуск: Т.А.Пладунова

**ЗМЕСТ**

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ………………………… 4

2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ..……………..……………. 8
2.1 Канспекты (тэксты лекцый)……………..…………… 8

3.ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ …....……………………… 150
3.1 Вучэбныя выданні, афіцынийна рэкамендаваныя МА 150

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ……...……………… 151
4.1 Пытанні да семінарскіх і практычных заняткаў……… 151
4.2 Заданні для кантралю самастойнай работы………… 168
4.3 Пытанні да заліку………..…………………………… 170
4.4 Пытанні да экзамену…..……………………………… 171
4.5 Пытанні да выніковай атэстацыі……………………… 173
4.6 Тэматыка рэфератаў, курсавых і дыпломных работ… 174
4.7 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнта 177

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ..………………….………… 180
5.1Тыпавая вучэбная праграма па дысцыпліне, вучэбная праграма УВА па вучэбнай дысцыпліне………………………… 180
5.2 Рабочы тэматычны план па дысцыпліне..……………… 181
5.3 Методыкі выкладання дысцыпліны……..……………… 185
5.4 Метадычныя рэкамендацыі……………………………… 191
5.5Пералік выданняў і інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў для вывучэння дысцыпліны……………………… 193
5.6 Інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы...……………… 197

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс «Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці» распрацаваны для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-05 Народная творчасць (фальклор).

Дысцыпліна “Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці” разглядае шляхі і сродкі па засваенні і рэвіталізацыі беларускіх абрадавых і пазаабрадавых традыцый у сучасным культурным жыцці, выпрацаваныя айчыннымі фальклarыстамі, этнапедагогамі, рэжысёрамі народных свят; выяўляе міждысцыплінарныя сувязі з дысцыплінамі “Вусная народная творчасць”, “Міфалогія”, “Этнаграфія”, “Фальклорны практыкум”, “Этнафанічны практыкум”, “Прафесійная педагогіка і методыка выкладання спецдысцыплін” спецыялізацыі “Этнафоназнаўства”; аналізуе формы і метады ўвасаблення функцыянальна-семантычнага і эстэтычнага зместу традыцыйных абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык беларусаў у аматарскай фальклорнай творчасці і разглядае акутальныяпадыходы іх укаранення у сучасным культурным жыцці грамадства.

Атрыманыя на занятках веды, уменні і навыкі дазваляюць студэнтам авалодаць асновамі фундаментальных і практычных ведаў у галіне мастацка-практычнай фальклarыстыкі, рыхтуюць іх да напісання курсавых і дыпломных работ,навуковых артыкулаў, а таксама да самастойнага ажыццяўлення рэжысёрска-пастановачнай работы па рэвіталізацыі народнай творчасці.

*Мэта вучэбна-метадычнага комплекса* – узбагачэнне будучых спецыялістаў па фальклоры тэарэтычнымі ведамі і практычымі навыкамі па засваенні і рэвіталізацыі каляндарных і сямейных абрадавых свят, пазаабрадавых побытавых практык шляхам іх мастацкага рэканструявання на рэгіянальнай дакументальнай аснове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Задачы вучэбна-метадычнага комплекса:*

– фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу, эстэтычныхкрытэрыяў і творчай матываванасці да вывучэння і ўвасаблення абрадавых і пазаабрадавых традыцый у рэчышчы іх мастацкага рэканструявання;

– авалоданне асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй, звязанымі з вывучэннем каляндарных і сямейна-абрадавых цыклаў, пазаабрадавых побытавых практык і прымеркаваных да іх танцавальна-гульнёвых, бяседных дзей;

– раскрыццё функцыянальна-семантычнага зместу, жанравага саставу каляндарных і сямейна-родавых свят і абрадаў;

– асэнсаванне працэсаў устойлівасці і пераемнасці, эвалюцыі і сучасных трансфармацый каляндарных і сямейна-родавых свят, пазаабрадавых побытавых практык беларусаў;

– выпрацоўка практычных уменняў і навыкаў арганізацыі і правядзення каляндарных і сямейна-абрадавых свят і дапасаваных да іх рэкрыяцыйных дзей у сучасных умовах;

– фарміраванне аналітычнай кампетэнцыі і творчага мыслення на даследчым, сцэнарна-праектным і арганізацыйна-рэпетыцыйным этапах мастацкага ўвасаблення каляндарных і сямейна-родавых абрадаў, пазаабрадавых побытавых дзей, танцавальна-гульнёвых і фальклорна-тэатралізаваных відовішчаў.

Студэнты павінны *ўмець*:

– праводзіць фальклорную палявую практыку;

– фіксіраваць на лічбавых носьбітах, расшыфроўваць і архівіраваць экспедыцыйныя матэрыялы;

– арыентавацца ў жанравых асаблівасцях фальклорнай спадчыны беларусаў;

– аналізаваць мастацка – вобразную сістэму фальклорных жанраў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– арганізоўваць і кіраваць працэсам развучвання традыцыйных спеваў, гульняў, танцаў;

– улічваць этнафанічныя асаблівасці традыцыйных спеваў пры стварэнні канцэртных праграм, сацыякультурнай дзейнасці, дзейнасці па этнакультурным выхаванні;

– самастойна аналізаваць каляндарныя і сямейна-родавыя абрады, выбудоўваць архітэктоніку дзеі паводле іх структурных элементаў (кодаў);

– праектаваць сцэнарый на аснове акцыянальных кодаў абраду з улікам яго тэмпаральнага, лакатыўнага, персанальнага, атрыбутыўнага, музычна-вербальнага, музычна-інструментальнага, пластычнага кодаў; складаць рэпертуарныя зборнікі фальклорных матэрыялаў;

– арганізоўваць і ўвасабляць абрадавую дзею, рэкрэацыйныя, гульнёвыя практыкі ў рэчышчы іх мастацкага рэканстуявання на дакументальнай аснове;

– ажыццяўляць рэпетыцыйны працэс з гуртамі-ілюстратарамі фальклорнай мастацкай дзеі;

– арганізоўваць працу па якаснаму тэхнічнаму забеспячэнню фальклорнай мастацкай дзеі;

– карыстацца навуковай і прафесійнай літаратурай па пытаннях дысцыпліны;

– прымяняць набытыя веды, уменніі навыкі ў сваёй прафесійнай дзейнасці.

З ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі ведаў у галіне мастацка-практычнай фалькларыстыкі і фарміраванні ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

– тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– метад этнаграфічнага даследавання;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– метад уключанага назірання;

– рэпрадукцыйныя метады (расказ, тлумачэнне, круглы стол, прэзентацыя,гутарка, дыскусія, лекцыя, дэманстрацыя кіна- і аўдыязапісаў);

– праблемныя (праблемнае выкладанне, пошукавы метад);

– метады самастойнай работы студэнтаў (работа з першакрыніцамі, расшыфроўка аўдыя- і відэаматэрыялаў, складанне абрадавай карты свята, напісанне сцэнара і распрацоўка рэжысёрскага праекта фальклорнага мерапрыемства);

– кантрольна-ацэначныя метады.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае вывучэнне асобных тэм і раздзелаў дысцыпліны з выкарыстаннем метадычных рекамендацый і літаратуры, рэкамендаванай выкладчыкам. Кантроль самастойнай работы студэнтаў адбываецца перыядычна падчас аўдыторных заняткаў.

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці” усяго прадугледжана 622 гадзіны, з якіх 302 гадзіны – аўдыторныя заняткі (60 гадзін – лекцыі, 120 гадзін – практычныя заняткі, 122 гадзіны – семінары).

Рэкамендаваныя формы  кантролю ведаў студэнтаў – залік і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ВМК

## 2.1 Канспекты (тэксты лекцый)

(у прадстаўленых тэкстах лекцый выкарыстаны матэрыялыМ.І.Талстога, С.М.Талстой, З.Я Мажэйка, М.А.Козенкі, В.В.Калацэя, П.А.Гуда, А.Я.Камінскага, Н.В.Пятуховай, Т.А.Пладуновай )

## УВОДЗІНЫ

Пытанні

1. Прадмет і задачы курса
2. Збіральніцкая і даследчая праца
3. Рэвіталізацыя фальклору

Літаратура па тэме:

1. Беларуская вусна-паэтычная творчасць : падруч. для студэнтаў філал. спец. ВНУ / / К.П. Кабашнікаў, А.С. Фядосік, А.С. Ліс іінш. – Мінск, 2000.

2. Белорусская этномузыкология : Очерки истории (XIX – XX вв.) /З.Можейко, Т.Якименко, Т.Варфоломеева и др.; под ред. З.Можейко. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 254с.

3. Восточно-славянский фольклор : словарь науч. и нар. терминологии / редкол. : К.П. Кабашников [и др.] – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.

4. Круглов Ю.Г. Фольклорная практика: Пособие для студентов пед. ин-тов по спец. №2101 "Рус. яз. и лит." – 2-е изд., дораб. – М.: Просвещение, 1986.

5. Рэкамендацыі па ахове, захаванні, пераемнасці і папулярызацыі беларускага аўтэнтычнага фальклору // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. – Мінск, 2001. – 12 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Хвир, Н. Состояние и проблемы охраны нематериального культурного наследия Республики Беларусь / Н. Хвир // Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання : зборнік навуковых прац удзельнікаў III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29 – 30 красавіка 2009 г.) / БДУКМ ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2009. – С. 34 – 35.

Дысцыпліна "Методыка арганізацыі фальклорнай дзейнасці" разглядае шляхі і сродкі па засваенні і адаптацыі беларускіх абрадавых і пазаабрадавых традыцый у сучасным культурным жыцці, выпрацаваныя айчыннымі фальклярыстамі і этнапедагогамі.

Раздзелы дысцыпліны закліканы ажыццяўляць асноўныя палажэнні па ахове, зберажэнні і пераемнасці беларускіх абрадавых і сацыяльна-побытавых традыцый у сучаснай сацыякультурнай прасторы[1], аналізуе формы і метады ўкаранення іх у кантэкст сучаснай мастацкай культуры ў якасці эстэтычна арганізаванай традыцыі, якія назапашаны ў XX-XXI стагоддзях і выбудоўваюцца сёння ў рамках прафесійнай і аматарскай этнакультурнай дзейнасці. Дысцыпліна прадстаўляе розныя падыходы айчынных і замежных спецыялістаў у галіне мастацка-практычнай фальклярыстыкі, этнапедагогікі і аматарскай творчасці па ўвасабленні традыцыйных абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык беларусаў у аматарскай фальклорнай творчасці, а таксама шляхі і сродкі іх ўкаранення у сучасным культурным жыцці грамадства.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – узбагачэнне будучых спецыялістаў па фальклоры тэарэтычнымі ведамі і практычымі навыкамі па засваенні і рэвіталізацыі каляндарных і сямейных абрадавых свят, пазаабрадавых побытавых практык шляхам іх мастацкага рэканструявання на рэгіянальнай дакументальнай аснове.

[1] Закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь"; Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Аб зацвярджэнні Канвенцыі аб ахове header нематэрыяльнай культурнай спадчыны" ад 29.12.2004 г. №627.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Задачы вучэбнай дысцыпліны*:

- фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу, эстэтычных крытэрыяў і творчай матываванасці да вывучэння і ўвасаблення абрадавых і пазаабрадавых традыцый у рэчышчы іх мастацкага рэканструявання;
- авалоданне асноўнымі паняццямі і тэрміналогіяй, звязанымі з вывучэннем каляндарных і сямейна-абрадавых цыклаў, пазаабрадавых побытавых практык і прымеркаваных да іх танцавальна-гульнёвых, бяседных дзей;
- раскрыццё функцыянальна-семантычнага зместу, жанравага саставу каляндарных і сямейна-родавых свят і абрадаў;
- асэнсаванне працэсаў устойлівасці і пераемнасці, эвалюцыі і сучасных трансфармацый каляндарных і сямейна-родавых свят, пазаабрадавых побытавых практык беларусаў;
- выпрацоўка практычных уменняў і навыкаў арганізацыі і правядзення каляндарных і сямейна-абрадавых свят і дапасаваных да іх рэкрыяцыйных дзей у сучасных умовах;
- фарміраванне аналітычнай кампетэнцыі і творчага мыслення на даследчым, сцэнарна-праектным і арганізацыйна-рэпетыцыйным этапах мастацкага ўвасаблення каляндарных і сямейна-родавых абрадаў, пазаабрадавых побытавых дзей, танцавальна-гульнёвых і фальклорна-тэатралізаваных відовішчаў.

Фарміраванню навуковага падыходу ў засваенні фальклорнага мастацтва, пошукавых інтэнцый у галіне мастацка-практычнай фалькларыстыкі будучых спецыялістаў па фальклоры прысвечаны заняткі па вывучэнні навукова-даследчага і метадычнага фальклорнага фонду, а таксама правядзенні экспедыцынай фальклорнай працы.

Найбольш змястоўныя фалькларыстычныя выданні:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- ***Беларуская народная творчасць***
- ***Традыцыная мастацкая культура Беларусі***
- ***Беларускі фальклор: жанры, віды, паэтыка***
- ***Беларускі фальклор у сучасных запісах***

Праблема захавання і трансляцыі ў пакаленнях каранёвага этнічнага мастацтва як адной з гістарыка-культурных каштоўнасцей народа падаецца асабліва актуальнай у сучасных урбанізаваных умовах.

На Беларусі яна даўно пастаўлена на дзяржаўным узроўні, вырашаецца збольшага, дзякуючы культурна-асветніцкай дзейнасці фалькларыстаў, педагогаў і кіраўнікоў фальклорных калектываў, аматараў традыцыйнай культуры. Матывацыя гэтай дзейнасці нараджаецца не толькі з эстэтычнай патрэбы і прагі хараства яе завадатараў, але і з пасіянарнага пачуцця адказнасці за фарміраванне этнічнай свядомасці дзяцей і моладзі – будучыні нашай краіны. У пошуку шляхоў развіцця грамадства Беларусі як цэласнай этнакультурнай супольнасці айчынныя навукоўцы, спецыялісты культурна-адукацыйнай галіны вынаходзяць пэўныя методыкі ўкаранення ў сучасны культурны кантэкст яшчэ захаваўшыхся, альбо рэканструяваных этнаідэнтыфікацыйных стэрыятыпаў паводзін, здольных паўплываць на кансалідацыю і духоўную еднасць народа.

*Этнічны стэрыятып паводзін* – сістэма навыкаў паводзін, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне праз навучанне і выхаванне шляхам падражання (імітацыі). Этнічны стэрыятып ёсць схематызаваная мадэль паводзін, якая уяўляе сабой абагульнены, эмацыйна афарбаваны і надзвычай устойлівы вобраз этнічнай супольнасці, на аснове якога яна штораз пражывае сваю еднасць і самабытнасць. Найбольш трывалымі яшчэ дагэтуль застаюцца такія этнічныя мадэлі паводзін як свята, рытуал, танцавальна-гульнёвае ігрышча, штодзённыя трапезы і святочнае застолле, інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працэс актуалізацыі этнакультурных каштоўнасцей беларусаў на сучасным этапе неадназначны. Прымаюцца законы і нарматывы па ахове і трансляцыі традыцынай культуры тытульнага этнасу Рэспублікі Беларусь, на фальклорных і педагагічных канферэнцыях выносяцца слушныя прапановы па этнакультурнай скіраванасці адукацыйнага і вучэбна-выхаваўчага працэсаў, але “на месцах” яны не заўсёды маюць актыўны водгук.

У апошнія часы актуальнай для многіх фальклрыстаў-практыкаў становіцца тэма ***рэвіталізацыі фальклору*** – як аднаго са шляхоў самаідэнтыфікацыі народа. Асноўным прынцыпам т.зв. рэвіталізацыі з’яўляецца зварот да традыцыйных народных практык, якія выяўляюць асноўныя этнічныя стэрыятыпы паводзін – з мэтай іх актуалізацыі ў сучасным грамадскім жыцці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел I. Метады мастацка-практычнай фальклрыстыкі па завасваенні і рэвіталізацыі традыцыйных абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык

### 1. Абрадавая практыка як арганізацыя мыслення і паводзін традыцыйнага грамадства

Пытанні

1. Абрадавыя традыцыі беларусаў
2. Каляндарныя і сямейна-родавыя абрадавыя практыкі
3. Класіфікацыя і функцыянальнасць традыцыйных абрадаў.

Літаратура па тэме:

1. Аникин, В.П. Теория фольклора. Курс лекций./ В.П. Аникин – М.: МГУ, 1996. – 408с.

2. Барташэвіч, Г.А. Беларуская народная паэзія веснавога цыкла і славянская фальклорная традыцыя / Г.А. Барташэвіч. – Мінск,1985.
3. Беларуская міфалогія: энцыклапедычны слоўнік / склад. С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск: Беларусь, 2004. – 592 с.
4. Беларускі народны каляндар / уклад. А.Ю. Лозка. – Мінск : Полымя, 1992. – 205 с.
5. Беларускі фальклор: жанры, віды, паэтыка: у 6 кн. / рэдкал.: А.С.Фядосік (гал. рэд.) [і інш.], АН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн.: Бел. навука, 2001–2006. – Кн. 1: Каляндарна-абрадавая паэзія / А.С.Ліс [і інш.]. – 2001. – 515 с.
6. Калацэй В. “Сонечны крыж” і вытокі каляндарнай абраднасці беларусаў // Вясна на Беларусі: Рэпертуарны зборнік. – Мн.: НЦТДіМ, 1988.
7. Каляндарна-абрадавая паэзія / А.С. Ліс [і інш.]; навук. рэд. А.С. Фядосік. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 515 с.
8. Камінскі, А.Я. Рэжысура традыцыйнага абраду: вучэб.-метад. дапам./ А.Я. Камінскі.– Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009.– 112с.
9. Казакова, І. В. Беларускі фальклор: курс лекцый. Навуковае выданне. – Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. 2007 – С. 59.
10. Ліс А.С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў. С. 183.
11. Ліс, А.С. Каляндарна-абрадавая творчасць беларусаў: сістэма жанраў. Эстэтычны аспект / А.С. Ліс. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 188 с.
12. Ліцьвінка, В.Д. Святы і абрады беларусаў / В.Д. Ліцьвінка. – Мінск : Беларусь, 1997. – 123 с.
13. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 247 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. Паэзія беларускага земляробчага календара /Уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. І камент. А.С.Ліса - Мн., 1992. С.126-127.
15. Санько С. Штудыі з кагнітыўнай і кантрастыўнай культуралёгіі. – Менск: БГАКЦ, 1998.

Драматургія абрадавых свят беларускага народнага календара нагадвае своеасаблівы дыялог, які чалавек безперапынна вядзе з наваколлем – як жывой зменлівай істотай, незразумелай і таямнічай. Але гэты дыялог з боку чалавека "гучыць", а з другога – трансцэндэнтнага боку – моўчкічуе! Праявы гэтай сакральнай камунікацыі мы бачым у абрадах і звычаях, традыцыйным мысленні і паводзінах чалавека як прадстаўніка грамады і часткі прыроды, тоеснай з ёю.

Камунікацыя – адзін з найважнейшых складальнікаў культуры. Каб арыентавацца ў наваколлі, яго трэба асэнсаваць. Усё, што немагчыма зразумець, звычайна выклікае занепакоенасць, пачуццё жаху. Каб забяспечыць сабе існаванне ў пэўным асяродку, трэба яго вытлумачыць і наладзіць з ім кантакт. Гэта абумоўлена нейрафізіялогіяй – акалічнасцямі функцыявання чалавечага мозгу. Таму адна з самых вялікіх патрэб чалавека – патрэба ў зносінах.

Зносіны, кантакты людзі ажыццяўляюць шляхам абмену інфармацыяй. *Абмен інфармацыяй* – **к а м у н і к а ц ы я** . *Яе* заўсёды ладзяць паміж двума бакамі. Бок, які транслюе (перадае) інфармацыю – **адрасант**, які інфармацыю засвайвае (прыймае) – **адрасат.**

Асаблівасці беларускай традыцыі – сведчанне спецыфічнай камунікацыі яе заснавальнікаў. Гэта – рэшткі іх культуры, якія захаваліся дагэтуль. Найвялікую колькасць адбіткаў пакінулі найбольш жыццяважныя формы камунікацыі. Гэта – перадусім сакральная* камунікацыя: зносіны

---

*С а к р а л ь н ы – не будзённы, святочны, які знітаваны са звышнатуральным.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паміж чалавекам і сіламі, якія, па яго разуменню, уплывалі на ўмовы яго жыцця: сязоннасць, дабрабыт, долю. Да такіх праяў перш-наперш дапасуюць каляндарную, працоўную, сямейна-бытавую абраднасць.

Песні, дзеянні, рытуалы, музыка, вербальныя сімвалы – сродкі камунікацыі паміж людзьмі традыцыі і сіламі, якія, па іх разуменню, ўплываюць на сезоннасць. У такіх зносінах: чалавек (традыцыйная грамада) – *адрасант*, прыродны цыкл – *адрасат* камунікацыі. Гэткія кантактаванні здзяйсняліся па прынцыпу «выклік-адказ»[2]. Калі той ці іншы "выклік" (песня, найгрыш, дзеянне) служыў сродкам эмацыянальнага інфармавання аб нейкай незвычайнай, жыццёва абвостранай сітуацыі традыцыйнай абшчыны, абумоўленай прыроднымі і жыццёвымі цыкламі.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[2]«Выклік-адказ» – культуралагічная апазіцыя, ўведзеная англійскім гісторыкам, сацыёлагам IXX ст. Тойнбі для тлумачэння прынцыпа руху гісторыі: "Выклік" Бога – "Адказ" чалавека / Тонби А.Дж.. Постижение истории.-М.,1995/. Наша пераасэнсаванне гэтай апазіцыі, як рухавіка цыклічнасці гісторыі, у змяшчэнні акцэнтаў спрацоўкі гэтага механізма: "Выклік" чалавека (соцыума) – "Адказ" Бога (звышнатуральных сіл). Так мы разглядаем прынцып кантактавання чалавека (соцыума) з наваколлем і звышнатуральнымі сіламі, ад якіх залежыць збалансаванасць, дабрабыт і плённасць жыцця чалавека, соцыума.

“Выклікі” да Боскай сілы (Лёсу) здзяйсняліся традыцыйнай супольнасцю на двух планах існавання-камунікацыі: сакральным і перыфірыйным (міжасабовым), якія, адпаведна, адлюстраваны ў абрадавам і пазаабрадавам фальклоры.

“Выклік” сезонна-цыклічнай (Вясна-нараджэнне/Лета-сталенне/Восень-угасанне/Зіма-скон), альбо родава-цыклічнай сітуацыі (радзіны/шлюб/пахаванне) здзяйсняўся у межах сакральнай камунікацыі са звышнатуральнымі сіламі - зямнога, надземнага і падземнага свету (адпаведна тром узроўням мадэлі “Сусветнага Дрэва”) .




Сродкі эмацыянай камунікацыі паміж людзьмі на перыфірыйным (будзённым) плане адлюстраваны ў пазабрадавым песенным комплексе, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сведчыць пра багаты жыццёвы, гуманістычны вопыт традыцыйнага грамадства. Дадзены від камунікацыі – міжасабовы – здзяйсняўся паміж чалавекам і соцыумам, чалавекам і чалавекам “напрамкі”, у гумарыстычным (прыпеўкі, жартоўныя песні), альбо ў светасузіральным ключы, і ў вельмі напружаных эмацыйных стасунках (песні пра жаночую долю, сіроцкія, жаўнерскія) - з “адсылам”-паратункам да звышнатуральных сіл (Бог, Лёс, Доля). Драматургія каляндарна-абрадавай цыклічнасці гадавога кола цалкам адпавядае цыклічнасці жыцця чалавека як індывіда і часткі грамаскай супольнасці і прадстаўляе сабой так бы мовіць бясконцую п’есу Боскага наканавання ў чатырох дзеях: 1. Нараджэнне; 2. Рост, росквіт; 3. Сталенне, прадуцыраванне, здабытак 4. Увяданне, смерць як пераход да новага жыцця.




«Слоўнік» мовы зносін у такіх акалічнасцях складзены з тыпавых напеваў, інтанацыйна-рытмічныя і тэмбрава-дынамічныя паказчыкі якіх у народнай свядомасці адлюстраваны ў паняцці “голас”[3]. Так аднымі, альбо

[3]Феномен «голасу» разглядалі многія даследчыкі-этнамузыколагі ў тым ці іншым культуралагічным ракурсе. Гэта: “голас”- як “нязменны знак-сімвал, з якім у народнай свядомасці звязваецца замацаванасць той ці іншай песні “за сваім сезонам”(З.Мажэйка), блізкае да яго паняцце “вобраз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вельмі падобнымі напевамі (“голасам”) беларусы сустракаюць Вялікдзень, Юр’я, суправаджаюць Жніво, іншыя пераходныя этапы ў каляндарна абумоўленай жыццёвай *сітуацыі* грамады і чалавека.

Адпаведна часовай класіфікацыі каляндарныя песні падраздзяляюцца на зімовыя, веснавыя, летнія, восеньскія. **Функцыянальна** – на прызывы («загуканні»), заклінанні («прыгаворы»), віншавальна-велічальныя(«абыходныя»), лірыка-эпічныя выказванні і гульнёвыя песні. Функцыянальнасць песень каляндаранага цыклу гаворыць аб ступені іх сацыяльнай значнасці для грамады, таму іх сэнсавая нагрузка, у адрозненні ад песень познетрадыцыйнага пласта (паззабрадавых, умоўна-прымеркаваных) значна большая. Па вызначэнні Мажэйка, раздзяленне песень позняга (пазаабрадавыя) і ранняга (абрадавыя) гісторыка-стылявых пластоў праходзіць па функцыянальна-апазіцыйнаму прызнаку: «песня і *не зусім песня*», «песня і *больш чым песня*». Калі непрымеркаваныя лірычныя, жартоўныя песні функцыянальна накіраваны на задавальненне эстэтычна-рэкрэатыўных патрэб грамадства, каляндарна-абрадавыя песні адрозніваюцца значнай поліфункцыянальнасцю.

Гэта стабільныя *дамінуючыя функцыі*: нарматыўна-рэгламентуючая; сугестыўна-інсперацыйная; знакова-апазнавальная.

***Сугестыўнасць*** уласціва ўсім абрадавым песням і служыць дзвюм мэтам: рэгуліраванню ўзаемаадносін чалавека з прыродай (“Ой, вясна, ой, красна. Ды што ж ты нам прынясла?”), альбо чалавека з чалавекам(“Пара, маці, ячмень жаці”). Яна надае напеву спецыфічныя рысы імпульсіўнасці, своеасаблівай “завостранасці”. Гэта своеасаблівасць і была акрэслена З. Я. Мажэйка выразам - “*больш чым песня*”.

---

інтанацыя”(З.Эвальд), “голас” як транцэндэнтны дыялог (А.Чэканоўская)[10, с.13], традыцыйны гукаідэал (Фр.Бозе), як інтанацыйна-тэмбравая мадэль пэўнай этнічнай культуры, якая абагульняе спецыфічныя элементы яе вакальных і інструментальных стыляў[3, с.158], “гукаідэя” як акустычны код матываванага дзеяння (А.Залатарог))[10, с.44-50].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Знакава-апазнавальная функцыя*** абрадавых спеваў праяўляецца ў “абстрактна-рэфлекторным значэнні сімвалічных асацыяцый”, якім у кожную гістарычную эпоху адпавядаюць свае “знакавыя” паняцці. Калі пэўныя формульныя напевы на поўначы Беларусі выступаюць як “знак” купалля, а на поўдні як “знак” вясны. У музычнай фалькларыстыцы сутнасць гэтых “знакаў” змешчана ў паняццях, якія раскрываюць той ці іншы падыход у іх вывучэнні (гл. вышэй: “голас”).

Гэтым галоўным прыкладным функцыям, якія вызначаюць вытворчае значэнне каляндарна-земляробчых песень спадарожнічаюць ***эстэтычная*** і ***псіхалагічна-рэкрэатыўная***функцыі. Перавага гэтых функцыйназіраецца ў большасці пазаабрадавых (любоўных, жартаўлівых, тужлівых) песень. Пазаабрадавыя творы эвалюцыйна нарадзіліся з псіхалагічна-рэкрэатыўных патрэб абшчыны, і большасць з іх разлічана на душэўныя шчыраванні і індывідуальнае пачуццёвае асэнсаванне рэчаіснасці, з акцэнтам на яе эстэтызацыю, альбо драматызм яе ўспрыняцця.

Цікавым падаецца ў гэтым кантэксце прапанаваны рускім вучоным В.П. Анікіным падыход да тлумачэння спецыфікі фальклорнай творчасці народа.Ён разумее фальклор не толькі як з’яву культуры і мастацтва, але і як спосаб – метад – самарэгулявання абшчыны ў працэсе адаптацыі ў наваколлі праз духоўнае абагульненне яго складнікаў - рэальных і ўяўных (трансцэндэнтных).

Паводле Анікіна, метад — гэта спосаб ўсталяваць суадносіны паміж рэчаіснасцю і яе адлюстраваннем у мастацтве.***Творчы метад фальклору*** складваўся паступова, яго фарміраванне працякала, у рэчышчы пераемнасці вуснай традыцыі. Паэтычны вопыт народа назапашваўся з стагоддзя ў стагоддзе.Фальклор — мастацтва буйных абагульненняў, якое валодае вельмі высокім узроўнем тыпізацыі. Ён спалучае прамое адлюстраванне жыцця з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

умоўным. Фальклору ўласцівы асацыятыўнасць, мысленне па аналогій, сімвалічнасць.

Творчы метад фальклору В. П. Анікін прапанаваў назваць ***“сублимирующим”.*** Вучоны пісаў: “Лацінскія словаsublimare – «ўзносіць» выкарыстана тут метафарычна. У спецыяльным тэхнічнай мове яно азначае непасрэдны пераход цвёрдага цела пры награванні ў газападобны стан. Звычайны пераход на газ суправаджаецца прамежкавым вадкім станам. Сублімацыя дазваляе з цвёрдага рэчыва перайсці ў газ, абыходзячы стан вадкасці. Аналагічным чынам фальклорнае мастацтва ў працэсе ўсведамлення фактаў абміне стадыю праўдападабенства, пераходзіць на ўзровень гэтак шырокага абагульнення, што праўдападабенства становіцца для яго абцяжарваючым момантам. Тут няма абавязковага адлюстравання жыцця ў форме самога жыцця, дапускаецца ўмоўнасць»[2].

❖ Такім чынам, “сублимирующий” метад — гэта асаблівы мастацкі погляд на свет, які спараджае асаблівы спосаб тыпізацыі жыццёвых з’яў. Творчая думка народа адсякае ўсё лішняе. Шлях узыходжання ад жыццёвых фактаў да іх абагульненню быў кароткім, без прамежкавых звёнаў. Паэтычныя абагульненні набывалі ў фальклоры універсальныя ўласцівасці.Узнаўляючы рэальнаю жыццё, народ-мастак зьмяняя яе ў духу свайго ідэалу.

Звычаі, абрады, рытуалы суправаджаюць чалавек на працягу ўсяго жыцця - ад нараджэння да смерці Узніклі яны глебе веры, працоунай дзейнасці і побыту людзей. Тыя, што дайшлі да нас, маюць сінкрэтычны характар і ўвабралі элементы язычніцкай, хрысціянскай і свецкай культур. Народныя традыцыі не ўзнікаюць і не знікаюць хутка. Неабходны дзесяцігоддзі, а можа і стагоддзі, перш чым абрад ці звычай набудзе агульнанацыянальны характар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У побыце - сельскім і гарадскім, старым і сучасным - жыццё людзей развівалася і развіваецца цыклічна. Кожная значная падзея або новы цыкл ў жыцці чалавека і навакольнага яго асяроддзя выклікае неабходнасць дзеянняў, якія ў сілу іх рэгулярнай паўтаральнасці здзяйсняюцца ў звыклым, асвечаным векавым звычаем складзе і традыцыйнай паслядоўнасці. Такім чынам, абрад - гэта сукупнасць устаноўленых звычаем дзеянняў, звязаных з бытавымі народнымі традыцыямі або з выкананнем рэлігійных прадпісанняў. У аснове абраду заўсёды ляжыць абрадавае дзеянне. Рацыянальныя практычныя дзеянні неаддзельныя ад дзеянняў эстэтычных, адухаўляе і пераўтваральных дзеянні практычныя ў своеасаблівыя мастацкія вобразы.

Абрадавае дзеянне таксама ёсць комплекс сімвалічных, магічных, дэманстратыўных і гульнявых элементаў. Пры магічных абрадавых дзеяннях, якія стымулююць і аберагаючых, жаданы вынік ўмоўнага абазначаюць пэўным дзеяннем або словам. Так, напрыклад, у якасці вербальнай (славеснай) магіі выкарыстоўваецца слова (замовы, абрадавыя песні). Акрамя абрадаў стымулюючых і аберагаючых, існуюць так званыя магічныя абрады, то ёсць варожбы.

Дэманстратыўна-сімвалічныя дзеянні звязаныя з народнымі традыцыямі. Так, напрыклад, маладых садзяць разам, п’юць яны з аднаго кубка і да т.п. У наш час магічная функцыя абрадавых дзеянняў аслабла, і за яе кошт развілася функцыя дэманстратыўна-сімвалічная і гульнявая. Акрамя таго, абрадавыя дзеянні могуць насіць індывідуальны (варожбы дзяўчат), калектыўны (завіванне вянкоў, бярозак на Сёмуху), альбо масавы характар (абход вёскі, агульны карагод на Купалле ці Пахаванне стралы, інш.).

Калі ***абрад*** - гэта паслядоўнасць цалкам пэўных бытавых абрадавых дзеянняў, то ***рытуал*** - сукупнасць абрадаў, якія суправаджаюць які-небудзь сацыяльны, палітычны, воінскі, рэлігійны акт і складнікаў яго знешняе афармленне, гэта значыць, рытуал - гэта форма таго ці іншага акта, а сукупнасць і пэўная паслядоўнасць абрадавых дзеянняў - яго змест.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Цырыманіял***, як і рытуал, ёсць таксама пэўны парадак ажыццяўлення абрадавых дзеянняў. Але цырымонія можа не суадносіцца з традыцыяй і мець разавы характар.

***Святочная культура-*** частка духоўнай народнай культуры, шматузроуневая сістэма святочных трады-цый, звычаяў, абрадаў, цырымоній, якія адлюстроўва-юць працоўную дзейнасць чалавека і бытавыя норавы соцыуму ў яго гістарычным развіцці.

***Традыцыя-*** тэта генетычная памяць нацыянальнай культуры кожнага народа, якая ахоплівае вялікае кола з'яў і праяўленняў, характэрных для ўсіх сфер са-цыяльнага жыцця. Традыцыя разглядаецца як меха-нізм перадачы сацыяльна значнага вопыту індывіду-ума або калектыву ад пакалення да пакалення.

У сучаснай святочнай практыцы адбываецца працэс ***рэвіталізацыі***, ***рэстаўрацыііі******трансфармацыі*** рэштак культурнай спадчыны розных гістарьгчных напластаванняў якія здольнья інтэграваць паміж сабой, пераўтвараючыся ў навацыйныя элементы традыцый і культурнага фонду нацьп. Але згодна тэоры вечнага руху прыроды і грамадства любая навацыя абавязкова мадыфікуецца ў традыцыю.

Чалавек, яю нараджаўся і жыў у арэоле бытавання традьщыйных архаічных форм культуры, цалкам падпарадкоўваўся яе нормам і законам, пачынаючы ад глабальна-абстрактных (усведамленне агульнай карціны свету, погляды на рэлігію, тэорыю нараджэння ізнікнення суб'ектаў сусвету), заканчваючы канкрэтнымі бытавымі правіламі штодзённага апранання, харчавання, працы, святкавання і інш. У архаічным абшчынна-вясковым соцыуме традыцыя існавала як працяглая ўстойліва-нязменная і недатыкальная форма быцця, своеасаблівая сістэма каштоунасцей з міфічнай першаасновай, з апорай на земляробчы калдяндар (святы “Сонечнага крыжа”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На стадыпі ўзнікнення і першапачатковага існавання народная святочная традыцыя заусёды прасякнута сакральнасцю і непарушальнасцю, дзейнічае пастулат яе вечнасці, неўміручасці. Але непрыметна для чалавека яна пастаянна ўдакладняецца із цягам часу пераўтвараецца ў эпізадьгчны сегмент *трансфармаванага свята*.

***Традыцыя*** як феномен вызначаецца катэгорыяй агульнага - комплексам элементау і з'яу, якія аб'яд-ноўваюць народ. Адначасова агульнае можа існаваць як асобнае, уласцівае толью пэўнаму этнасу, рэгіёну, мясцовасці, здольнае вылучаць дадзеную групу сярод іншых. Аб’яднанне элементау культуры асобных локусаў у адну схему ўспрымаецца як *агульнанацыянальная традыцыя*, якая з цягам часу пры захаванніш знешняй формы страчвае свой першапачатковы змест, аўтэнтычнасць. Вядомы рускі фальклapыст К.Чыстўу адзначае, што ў працэсе этнічнай кансалідацыі сучасных нацый і фарміравання нацыянальнай самасвядомасці ўзнікае тэндэнцыя да стварэння культурнай аднароднасці, у выніку чаго з’яўляюцца ўмоўна традыцыйныя, абагуленыя, агульнанацыянальныя формы, якія не супадаюць з існуючымі лакальнымі і становяцца *сімваламі нацыянальнай культуры*.

Адной з унікальныхякасцей традыцыі можна назваць яе ***варыятыўнасць*** (ад лац. variation — відазмя-ненне другарадных элементаў пры захаванні асноўна-га) - здольнасць адаптавацца да новай сацыякультур-най сітуацыі, змяняцца і у той жа час заставацца самой сабой. Імправізацыя ў вербальнай сістэме перадачы абрадавага тэксту, рэалізацыі структурна-кампазіцыйных схем і сюжэтаў рытуальньгх комплексаў і асабістыя якасці іх выканаўцаў з'яуляюцца асноўнымі прычынамі трансфармацыі традыцыі.

У народным лексічным бытаванні паняцце “традыцыя”трапляе пад катэгорыю “заканамернага”і таго, што падтрымлівае заканамернасць. Парушыць тэту абумоўленасць можа толькі выпадак - спарадычная гульня, нявызначаныя, непрадказальныя паводзіны моладзі. Па законах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зрытмізаванасці іцыклічнасці быцця абедзве з’явы - спрадвечнае “неабходнае”іхаатычнае “выпадковае” з цягам часу аб’ядноуваюцца у адзіную абрадавую дзею.

У заканамерных паводзінах чалавека побач з пазітыунымі абрадавымі дзеяннямі існуюць і негатыўныя. Прычым дрэннае не ўспрымаецца як выпадковае. У святочнай культуры беларусау, акрамя рэгламентаваных паводзін, кожны індывід валодаў пэўнай свабодай у асобных рытуальных эпізодах. У якасці прыкладу варта прыгадаць масленічныя пераапрананні жанчын у маскарадныя эратычныя касцюмы і купальскую карнавальную ўседазволенасць моладзі, якая часам мела агрэсіўна-разбуральны характар. Галоўная функцыя масак у мінулым - стварэнне атмасферы святочнага іншабыцця, што неабходна чалавеку для псіхалаічнай разгрузкі і адключэння ад аднастайных штодзённых клопатаў.

У народным бытаванні лексема “традыцыя” ужываецца ў аднолькавым кантэксце са словамі“звычай”, “рытуал”, “абрад”. Навукоўцы трактуюць ***традыцыю*** як шырокае (родавае) паняцце, іcтытут, які характарызуюць некаторыя прынцыповыя асаблівасці: па-першае, выбарачнасць - звязанасць з каштоўным культурным матэрыялам для пэўнага соцыуму; па-другое, паўтаральнасць, неабходная для замацавання мастацкага, этнаграфічнага матэрыялу ў межах гістарычнай дыстанцыі; па-трэцяе, яе практычны характар.

***Звычай*** - адна з ідавочных і зменлівых праяўрэалізацыі традыцыі, якая ахопліваеўсе сферы жыцця чалавека і абмяжоўваецца праяўленнем стэрэатыпных нормаў поводзін індывідуума ў штодзённым жыцці грамадства ці сацыяльнай групы.

*Абрад* - гэта ўсталяваная звычаем сістэма сімвалічных дзеянняў, якія афармляюць важныя падзеі грамадскага і асабістага жыцця чалавека. Пры змене традыцыі адбываецца трансфармацыя абраду. Некаторыя з цягам часу становяцца народнай гульнёй, забавай, варажбой, арганічна ўваходзяць у



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

структуру новага святочнагаформаўтварэння і набываюць накіраванасць на рэалізацыпо іншай функцыісацыялізацыіграмадства.

Абрад як форма увасаблення рэлгійных вераванняў не універсальны. Ён толыа адзін з існуючых сродкау, пры дапамозе якога вера ўвасабляецца ў канкрэтнае дзеянне. У той ці іншы гістарычны перыяд па пэўных прычынах уяуленні чалавека могуць і не атрымаць сімвалічнага і фізічнага афармлення ўвогуле або атрымаць яго аднабаковае выяўленне. Найбольп важным, найбольш істотным і разам з тым найбольш устойлівым элементам абраду на розных этапах развщця аказваецца яго ***функцыя***. У гісторы абраду форма яго змяняецца, а функцыя пры гэтым часцей застаецца, хоць часам і тлумачыцца на новы лад.

Вылучаюцца наступныя ***цыклы абрадаў***: каляндарныя, рэлігійныя, аказіянальныя, грамадзянскія, абрады жыццёвага цыклу.

***Каляндарны*** цыкл уключае абрады па пэўных рухомыхі нерухомых датах народнага календара і падзяляецца на зімовыя, веснавыя, летнія, восеньскія, прымеркаваныя да сельскагаспадарчых работ. Каляндарныя абрады - поліфункцыянальныя. Даследчыкі вылучаюць у іх магічную, камунікатыўную, цырыманіяльную, гульнявую, геданістычную, эстэтычную, рэлігійную, сатырычную функцып.

***Рэлігійныя***абрады - калектыўныя дзеянні, якія скіраваны на звышнатуральныя ілюзорныя аб’екты і выступаюць як спосаб рэалізацып адносін паміж гэтымі аб’ектаміі чалавекам. Першакрыніцай рэлігійных абрадаў з’яуляецца магія. Старажытныя магічныя абрады ьылі цесна звязаны з матэрыяльнай практыкай, адпаведна якой можна вылучыць наступныя *віды магіі*: лячэбную, любоўную, аграрную, промыслава-гаспадарчую, магію навядзення шкоды.

Правядзенне аказіянальных абрадаў адбываецца пры крытычным становішчы ў грамадстве (крызісныя) ці для магічнага выклікання падобнага

крызісу (выкліканне дажджу пры засушлівым надвор'і), пераадольвання прыроднага, грамадскага ці асобаснага крызісу (антыкрызісныя).

Да ліку ***грамадзянскіх***абрадаў адносяцца вытворчыя, сямейныя, дзяржаўныя, палітычныя, прафесійныя. У залежнасщ ад складу выканауцаў грамадзянскія абрады падзяляюцца на асабовыя, групавыя, абшчынныя. Па гендэрнай іўзроставай прыметах вылучаюцца дзіцячыя, падлеткавыя, маладзёжныя, дзяво-чыя, жаночыя, мужчьнскія абрады.

Абрады ***жыццёвага цыкла***часцей называюць ***сямейнымі***. Галоуным аб'ектам гэтых дзей з'яўляецца канкрэтны чалавек на пэўнам этапе яго жыцця. Пры гэтым у абрадах у большасці удзельнічаюць сям'я, род, магічныя інемагічныя спецыялісты, святары, а у некаторых выпадках і вясковая абшчына (рэкруцкі абрад).

***Рытуал***(ад лац. ritualis - абрадавы, ад ritus - рэлігійны абрад, урачыстая цырымонія) - рэгламентаваная і рэгуліруемая паслядоўнасць дзеянняў, якія не змяняюць сітуацыю у фізічным сэнсе, а вядуць толькі да яе сімвалічнай перамены.

Рытуал трэба адрозніваць ад ***цырымоніі***(ад лац. caerimonia - культавы абрад), у аснове якой больш дэталёвая паслядоўнасць некалькіх рытуальных дзеянняў. Акрамя таго, цырымонія заўсёды мае сацыяльны характар.

## 2. Эстэтычная і этнаэкалагічная аснова засваення абрадаў і пазаабрадавых пабытавых практык у вучэбна-выхаваўчай і сацыякультурнай дзейнасці

Пытанні

1. Эстэтычная самадастатковасць і сугестыўнасць фальклорнай традыцыі
2. Этнаэкалагічны патэнцыял беларускіх абрадавых і пазаабрадавых традыцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Выхаваўчая роля народных традыцый у сучаснайвучэбна-выхаваўчай і сацыякультурнай дзейнасці

4. Эстэтычная канцэпцыя рэканструявання народных мастацкіх традыцый метадамі мастацка-практычнай фалькларыстыкі

Літаратура па тэме:


1. Гусев, В.Е. Эстетика фольклора / В.Е.Гусев. – Л. : Наука, 2007. – С. 154 – 200.

2. Конан, У.М.. Выбранае / уклад. М.А. Козенкі; прадм. М.А.козенкі. – Мінск: Смэлтак, 2009. – 536 с.: іл. – (Выдатныя постаці Беларусі).

3. Кухаронак.Т. Роля традыцыйнай культуры беларусаў у сучасным выхаваўчым працэсе / Т. Кухаронак// Народная спадчына Бацькаўшчыны/ укл. М.Козенка.-Мінск: Чатыры Чвэрці, 2002.-с.54-59.

4. Кухаронак, Т.І., Кухаронак, В.Г. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў: вучэб.-метад. дапам. / Т.І. Кухаронак, В.Г. Кухаронак. Мінск: БДПУ, 2005. – 108 с.

5. Петухова, Н.В. Эстэтычнае ўспрыманне прыроды ўдзельнікаў аматарскіх фальклорных калектываў / Н.В. Петухова // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2009. – № 6. – С. 27–31.

6. Петухова, Н. Этнакультурнае выхаванне ў дзіцячых фальклорных гуртах і пытанні этнаэкалогіі / Н. Петухова // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып. 2.: Матэрыялы IV Рэсп. навук.- практ. канф. (2 – 3 крас. 2008 г., г. п. Акцябрскі) | аўт. Праекта і ўклад. М. А. Козенка. - Мінск: БелДІПК, 2008 . 296 с.

7. Пладунова Т.А. Фальклор як экасістэма культуры (да пытання этнакультурнага выхаваня дзяцей і моладзі) // Матэрыялы фальклорных


РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

чытанняў “Народная спадчына Бацькаўшчыны”. – Мінск:”Чатыры чвэрці”, 2002. – С. 18-24.

8. Пладунова Т.А. Шляхі і перспектывы пабудовы мадэлі этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі //Пазашкольнае выхаванне, 2005’11. – С. 55-58.
9. Сучкоў, І.І. Фальклорны тэатр і выхаванне асобы / І.І. Сучкоў. – Мінск: НІА, 2001. – 176 с.
10. Этычная педагогіка беларусаў / В. С. Болбас. – Мн.: Бел.навука, 2004. – 175 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калі ўлічыць сацыяльныя праблемы еўрапейцаў апошняга часу (дэмаграфічныя, экалагічныя, культурныя, этнаэкалагічныя) беларусам XXI стагоддзя проста неабходна актуалізаваць – кожнай асобе-частцы этнасу і этнасу цалкам (як сацыякультурнай адзінке міжнароднай супольнасці) – уласнае месца ў ландшафце і свеце. Педагогам, дзеячам культуры і адміністратарам прыйшоў час усвядаміць, што гэта магчыма праз захаванне этнаэкалагічнага светасузірання і адпрацаваных (гуманістычна, этнапедагагічна, эстэтычна) стагоддзямі яго форм-маніфестацый у якіх яго адначасова можна прывіць – міфарытуалаў – свят народнага календара (экспплікацыі каранёвага светапогляду этнасу). Вядома, што тут не абысціся без забеспячэння трансляцыі (абавязкова ў форме пераймання ад носьбітаў аўтэнтычнага фальклору, якія тут паўстаюць як аўтары «ініцыяцыі» традыцыяй) комплексу з’яў, непадзельна з німі знітаваных: традыцыйных спеваў, танцаў, народнага дэкаратыўна-побытавага мастацтва. Для такой актуалізацыі патрабуецца працяглы шлях, прыступкі якога:

- наданне галоўным народным святам статусу дзяржаўных,
- увядзенне этнапедагагічных практык у стандарты сучасных адукацыі і выхавання ад дзіцячага садка да ВНУ,

- юрыдычная абарона з’яў традыцыйнай культуры ад розных форм культурнага вандалізму (стылізацый, падробак, безкантрольнай камерцыялізацыі).

Вялікую выхаваўчую, этнаэкалагічную ролю ў сучаснай вучэбна-выхаваўчай і сацыякультурнай дзейнасці адыгрываюць вывучэнне і рэвіталізацыя каляндарных і сямейных абрадаў. Каляндарныя і сямейныя абрады, песні, гульні і танцы, дапасаваныя да іх развіваюць эмацыйную і кагнітыўную сферы дзіцяці, пашыраюць светапогляд і даюць адчуванне абараненасці праз адухоўленае стаўленне да прыроды, сваёй сям’і, сваіх суайчыннікаў і ўсяго існага га зямлі. Пра гэта красамоўна адзначыў у сваёй працы “Экалогія культуры” буйны расійскі вучоны, педагог і гуманіст Д.С.Ліхачоў: “Любовь к родному краю, к родной культуре, к родной речи начинается с малого - с любви к своей семье, к своему жилищу, к своей школе. Постепенно расширяясь, эта любовь к родному переходит в любовь к своей стране, к ее истории, ее прошлому и настоящему, а затем ко всему человечеству, к человеческой культуре”.

У сучасным адукацыйна-выхаваўчам працэсезначную ролю ў сістэме фарміравання эстэтычных адносін дзяцей да прыроды прызваны адыграць фальклор. Ён здольны цэласна ўплываць на інтэлект, пачуцці і волю асобы, фарміраваць светаўспрыманне, светаразуменне і агульную культуру кожнага, хто судакранаецца з яго багаццямі.Перадаваемы на працягу тысячагоддзяў з вуснаў у вусны, ад пакалення да пакалення, фальклор найбольш выразна ўвасабляе духоўны патэнцыял нацыі, адлюстроўвае непаўторны светапогляд этнасу – кропку гледжання народа на агульную сістэму з’яў і працэсаў рэчаіснасці.

Фарміраванне светаўспрымання, светапогляду беларусаў адбывалася пад непасрэдным уплывам прыроднага асяроддзя. Чалавек традыцыйнай культуры сваёй жыццядзейнасцю трывала ўпісваўся ў прыроду, угледзеўшы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў адаптацыі да прыроднага ландшафту магчымасць выжывання. Яго жыццё, побыт і праца амаль што цалкам падпарадкоўваліся асаблівасцям і рытмам прыроднага свету, таму чалавек адносіўся да прыроды па ўзоры адносін больш слабага да больш моцнага, інакш кажучы, шанаваў, абагаўляў і прасіў дапамогі ў сонца, вады, ветра, дажджу. Менавіта гэта светапоглядная акалічнасць стала падмуркам для развіцця язычніцкіх рэлігійных уяўленняў, што грунтуюцца на веры ў звышнатуральныя прыродныя сілы, якія нібыта самым непасрэдным чынам уплываюць на жыццё чалавека. Па сваёй сутнасці язычніцкія ўяўленні з’яўляюцца тыпова анімалістычнымі – старажытны чалавек быў упэўнены, што за кожнай прыроднай з’явай, стыхіяй знаходзіцца канкрэтная духоўная існасць (бог неба – Сварог, багіня глебы – Маці-Зямля, сонца – Даждзьбог, полымя – Сварожыч іінш.).

Ахінуты таямнічым светам прыроды, падуладны анімалістычнаму светапогляду, чалавек суадносіў уласцівасці прыродных аб’ектаў са сваімі пачуццямі, дзеяннямі і ўяўленнямі, адухаўляў (анімізм), ачалавечваў (антрапамарфізм) іх, шукаў першапродкаў свайго роду сярод прыроднага свету (татэмізм), што характарызавала яго імкненне да ўзаемакарыснага зближэння, яднання з прыродай, гарманічнага і бесканфліктнага суіснавання з ёй. Адсюль, ён па аналогіі ўсе з’явы прыроднага жыцця вымяраў і ацэньваў «чалавечай» меркай, гаворачы аб прыродных сілах як аб нечым, што можа свабодна дзейнічаць: «сонца ўсходзіць», «бура вые», «вецер свішча», «маланка б’е» іінш.

Усведамленне сваёй роднасці і еднасці з навакольным ландшафтам, адухаўленне і абагаўленне прыроды знайшло сваё эстэтычнае пераўтварэнне ў шматлікіх творах беларускага фальклору, для якіххарактэрна паглыбленне ў духоўны свет чалавека, перанясенне яго рысаў на прыродныя аб’екты і з’явы па прынцыпу падабенства паміж імі. Штодзённыя эмацыянальныя перажыванні чалавека, яго праца, побыт, сямейныя адносіны, сацыяльнае становішча супастаўляюцца з прыроднымі з’явамі і стыхіямі праз інтэнсіўнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстанне такіх вобразна-выяўленчых сродкаў, як эпітэт, увасабленне, вобразны паралелізм, параўнанне, метафара. Галоўнымі героямі асобных твораў з’яўляюцца надзеленыя чалавечымі рысаміі характарамі птушкіі жывёлы, якія дзейнічаюць і жывуць накшталт людзей, і, часам, прыцягваюцца да саўдзельніцтва ў жыцці героя – чалавека.

Акцэнтаванне ўвагі на гэтай акалічнасці можа стаць у педагагічным працэсе галоўным інструментамфарміравання ***эстэтычных адносін да прыроды***. У працэсе знаёмства з фальклорнымі персанажамі, іх лёсамі, унутраным светам дзеці праецыруюць пазнанае на сябе, у выніку чаго ў іх фарміруюцца ўласныя адносіны да прыгожага і пачварнага, высокага і нікчэмнага, добрага і благога (Г.П. Арлова, В.С. Болбас, Г.М. Волкаў, А.А. Грымаць іінш.). Любы фальклорны твор можа быць разгледжаны як своеасаблівы тэкст, у якім прадстаўлена эстэтычная інфармацыя, успрыманне і спасціжэнне якой вядзе да засваення асобай эстэтыкі, духоўнасціі гармоніі, закладзеных у змесце фальклорнай адзінкі (былічкі, песні, танца, гульні). Разгляд твораў фальклору вымагае эстэтычнага падыходу – яго ўспрымання, аналізу і ацэнкі з пазіцый вобразнай арыгінальнасці, жанравай разнастайнасці, ведання асноўных эстэтычных катэгорый (прыгожае – агіднае, узнёслае – нізкае, трагічнае – камічнае) і змешчаных у фальклорных творах эпітэтаў, увасабленняў, параўнанняў, метафар іінш., якія з’яўляюцца своеасаблівым інструментам інтэлектуальнага спасціжэння твора, глыбокага разумення яго эстэтычнай вартасці.

Засваенне твораў фальклору дапамагае ўзнавіць у сваім уяўленні адэкватныя прыродныя вобразы, глыбока ўсвядоміць і засвоіць іх эстэтычны змест, што спрыяе назапашванню мноства эстэтычных уражанняў і ведаў, пашырэнню эстэтычнага вопыту асобы. Так, прырода, надзвычай эстэтычна адлюстраваная ў фальклорных творах беларусаў, а таксама «чалавечы змест» яе паэтыкі крысталізуюцца ў суб’ектыўна-значную сістэму сэнсаў, якія фіксуюць еднасць чалавека і прыроднага свету, што спрыяе фарміраванню ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзяцей адносінаў да прыроды як да жывой істоты, якую трэба абараняць, ахоўваць. Разам з тым, натуральныя якасці прыродных аб’ектаў становяцца той асновай, на падставе якой уяўленне дзіцяці стварае сваё ўспрыманне аб’ектаў рэчаіснасці, што ў сукупнасці нараджае суб’ектыўныя сэнсавыя вобразы эстэтычнай свядомасці асобы. Менавіта гэта асаблівасць фальклору валодае велізарным педагагічным патэнцыялам фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды і гарманізацыі эстэтычных адносін паміж чалавекам і прыродай.

Такім чынам, на падставе вышэйсказанага мы можам сцвярджаць, што выкарыстанне фальклору ў якасці сродка гарманізацыіэстэтычных адносін людзей да прыроды патрабуе засваення эстэтычнай інфармацыі, ідэй, заключаных у паэтычным змесце твораў, якія фарміруюць ўяўленні пра прыгажосць прыроды, выклікаюць глыбокія эстэтычныя пачуцціі перажыванні пры ўспрыманні аб’ектаў прыроднага наваколля.

На гэтых падставах неабмежаваныя педагагічныя магчымасці для фарміравання эстэтычнага ўспрымання прыроды маюць усе жанры беларускага фальклору. Аднак асаблівае месца сярод іх займае каляндарна-абрадавы фальклор – адзін з самых старажытных духоўных спадарожнікаў беларуса.У ім найбольш выразна адлюстраваліся погляды чалавека на прыроду, яго гаспадарчы клопат пра ўраджай, ад якога залежыў дабрадыт сям’і. А.С. Ліс пераканаўча даказаў, што галоўная ідэя каляндарна-абрадавага фальклору «заключаецца ў імкненні захаваць свой род, сям’ю, забяспечыць працяг жыцця ў часе і прасторы. З гэтай кардынальнай ідэалагемы вынікаюць вытворныя ад яе ідэі ўраджайнасці зямлі, пакланення продкам, расліннасці». Такім чынам, у зыходнай функцыі ўзнікненне каляндарна-абрадавага фальклору было выклікана прагматычнай задачай – праз магічнае ўздзеянне на з’явы прыроды садзейнічаць ураджаю, паспрыяць гаспадару-земляробу. Аднак з развіццём цывілізацыі магічныя практыкі, уласцівыя старажытнаму светаразуменню, паступова набылі эстэтычную,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выяўленчую яскравасць і моц, што відавочна гаворыць аб страце першапачатковага значэння каляндарна-абрадавага фальклору і ўказвае на новую стадыю яго развіцця.

З асаблівай паўнатой каляндарна-абрадавы фальклор раскрываеперашаснае пазнанне чалавекам навакольнага свету і яго высокапаэтычнае ўвасабленне ў прыкметах і выслоўях, прыказках і прымаўках, песнях і гульнях, дапасаваных да тых ціншых свят гадавога кола наладжаных у прыродным ландшафце (У.А. Васілевіч, А.І. Гурскі, Р.М. Кавалёва, А.С. Ліс, В.Д. Ліцьвінкаіінш.). Не выпадкова, найбольш буйныя земляробчыя ўрачыстасці і святкаванні, у першую чаргу Каляды і Купалле, прыпадалі на зімовае і летняе сонцастаянне, дзе выразна адчуваецца характэрная для першабытнага мыслення сінхранізацыя жыцця чалавека з натуральнымі прыроднымі цыкламі абумоўленая колазваротам ў прыродзе, чаргаваннем пор года. Нездарма З.Я. Мажэйка падкрэслівае, што каляндарна-абрадавыфальклорпрадстаўляе сабою ўнікальны феномен, адбіваючы ў пэўнай меры адгалоскі «сістэмы светапогляду старажытных язычніцкіх уяўленняў … і разам з тым рэальнай, так бы мовіць, заземленай практыкі працы і жыцця ў адзіным рытме з прыродай». Мэтазгодная для земляроба паслядоўнасць чаргавання свят і будзённасці, працы і адпачынку, пастоў і баляванняў забяспечвала ўпарадкаванасць жыцця супольнасці на працягу года і падтрымку адвечнай гармоніі паміж чалавекам і прыродай.

З’яўляючыся неад’емнай часткай жыцця традыцыйнага грамадства, каляндарна-абрадавы фальклор акумуляваўшматвяковуюмудрасць народа, яго этнічныя і ***эстэтычныя ідэалы***, маральна-этычныя ўяўленні, мастацкія патэнцыі. Дзякуючы чаму ён стаўунікальнай педагагічнай сістэмай, якая забяспечвала арганічнасць і бесперапыннасць культурнага развіцця чалавека, непарыўную трансляцыю і пераемнасць мастацка-эстэтычнага вопыту. Засвойваючы пэўныя ўменніі навыкі народнага мастацтва, чалавек паволі далучаўся да культуры свайго народа, пры гэтым, працэс выхавання асобы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

згодна каляндарнай упарадкаванасці, аднаўляўся кожны год. Штогадовае пражыванне ў фальклорнай сітуацыі скрозь прызму свайго ўласнагавопыту,свёй ролі, садзейнічала, паводле этнапедагога Л.Л. Ражковай, фарміраванню ўстаноўкі на пэўны, прыемлемы супольнасцю спосаб дзейнасці, шматразовы паўтор якога прыводзіў да яго замацавання і рэалізацыі ў рэальным жыцці. Менавіта на гэтых падставах фарміравалася сістэма***эстэтычных установак***, узнікаліўстойлівыясхематызаваныя, эмацыянальна афарбаваныяпраграмыўспрыманняі мадэлі паводзін, уласцівыя для дзеянняўіўчынкаўпрадстаўнікоўпэўнайсупольнасці.

Каляндарна-абрадавы фальклор не страціў сваёй змястоўнай педагагічнай спецыфікіі ў нашы дні. Як адначасова мастацкі (эстэтычны), жыццёвы і прыродна-ландшафтны феномен, які адлюстроўвае сінкрэтычнае спалучэнне разнастайных відаў народнай творчасці, ён з’яўляецца ўніверсальным і найбольш дзейсным сродкам фарміравання ў дзяцей и моладзі эстэтычнага ўспрымання прыроды і гарманізацыі эстэтычных адносін паміж чалавекам і прыродай. Непарыўнае адзінства, спалучэнне і ўзаемадапаўненне ў абрадавых дзеяннях спеўна-размоўных формаў, музыкі, танца, пантамімы іінш., дапасаваных да таго цііншага прыроднага аб’екта, дапамагае адчуць цэласнасць і гармонію твораў фальклору і прыроднага наваколля. У выніку чаго якаснаперайначваюцца іразвіваюцца эстэтычныяпачуццііасобы, якія падымаюцца да ўзроўню ***эстэтычнага ідэала*** як меры ўвасаблення прыгажосці ў народным мастацтве, прыродзе і жыцці.

Эстэтычны ідэал становіцца галоўным пасярэднікам паміж патрэбнасцямі чалавека і канкрэтнымі спосабамі іх задавальнення і разам з тым служыць крытэрыем эстэтычнай ацэнкі аб’ектаў і з’яў прыроднага наваколля. О.В. Лармін адзначае, што эстэтычны ідэал з’яўляецца вышэйшым крытэрыем ***эстэтычнай ацэнкі*** ўсіх далейшых эстэтычных уражанняў асобы, тым «магічным крышталем», праз які чалавек разглядае, пераламляе і ацэньвае эстэтычна адлюстраваную ў ім рэчаіснасць, і рэгулюе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сваю практычную дзейнасць, накіраваную на стварэнне прыгожага. Эстэтычны ідэал, які ўзнікае ў грамадскай свядомасці на аснове складання, супастаўлення і інтэгравання эстэтычных уражанняў і мастацкіх вобразаў, выступае як рэгулятар рэгулятараў, як вышэйшая рэгулятыўная і ацэначная функцыя, якая кіруе ўсім далейшым ходам эстэтычнага пазнання і эстэтычнай дзейнасці.

Эстэтычны ідэал як фактар грамадскай свядомасці стварае ўяўленне аб крытэрыях прыгажосціі дасканаласці аб’ектаў і з’яў прыроднага наваколля. Па-за суаднясення з эстэтычным ідэалам прыродны свет захоўвае ўсю сваю матэрыяльную рэальнасць, ён пачуццёва ўспрымаецца чалавекам і спажываецца ім, але пазбаўляецца эстэтычнай каштоўнасці. Эстэтычным святлом прырода запальваецца толькі тады, калі яе ўспрыманне чалавекам злучае прыроду з эстэтычнымі ідэаламі грамадства. Менавіта ад таго, наколькі трывалая і глыбокая гэтая сувязь, залежаць наступныя эстэтычныя перажыванні чалавека, эстэтычная ацэнка прыроды – прызнанне яе прыгожай або пачварнай, узнёслай або ганебнай, паэтычнай ці празаічнай, трагічнай ці камічнай.

Эстэтычныя ацэнка прыроды замацоўваецца ў ***эстэтычных меркаваннях***, якія дапамагаюць чалавеку ўсвядоміць сэнс прыгожага і ўзвышанага, высокага і нікчэмнага, добрага і благога ў свядомасці і паводзінах чалавека, гарманічнага і стыхійнага ў прыродзе.Назапашваемаяінфармацыя паступоваарганізуецца ў эстэтычны вопыт, які рэгулюе адносіны чалавека да аб’ектаў і з’яў прыроднага наваколля. Такім чынам, эстэтычны вопыт разумеецца намі як устойлівая канцэптуальная сістэма вобразаў эстэтычнага светаўспрымання і светасветаадчування, абумоўленая культурай ўспрымання прыродных аб’ектаў і з’яў і эстэтычнай інфармацыі, атрыманай праз органы пачуццяў. Ён выступае ў якасці стрыжня гарманізацыі эстэтычных адносін дзяцей да прыроды і становіцца трывалай асновай, якая дазваляе выпрацаваць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўстойлівыя праграмы (мадэлі) ***эстэтычных паводзін*** у прыродным наваколлі.

Не сакрэт, што ў цяперашні час перад намі паўстае праблема знікнення «жывых» абрадаў і адным з рашэнняў яе з'яўляецца іх мастацкая рэканструкцыя. У рэканструяванай форме ўзнавіліся шматлікія абрады і святы, рэкрэацыйныя практыкі ў рэгіёнах і нават у гарадах[4]. Навуковым абагульненнем гэтай дзейнасці з'явілася эстэтычная канцэпцыя рэканструявання народных мастацкіх традыцый метадамі мастацка-практычнай фалькларыстыкі філосафа У. М. Конана, які лічыў неабходным актуалізаваць фальклорную спадчыну метадамі *мастацка-практычнай фалькларыстыкі* і, уласна, тэарэтычнай і метадычнай распрацоўкай гэтых метадаў у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы. Пераемнасць і актуалізацыя фальклорнага мастацтва, паводле даследчыка, павінна адбывацца ў рэчышчы ўвядзення класічных відаў народнай творчасці як развітай мастацкай сістэмы ў кантэкст сучаснай мастацкай культуры. У гэтым творчым працэсе магчыма выкарыстоўваць не толькі захаваныя ў сучасным побыце і народнай памяці фрагменты вуснай і візуальнай (абрады, харэаграфія, музыка) народнай творчасці, але ўвесь корпус запісаных і дэпаніраваных твораў фальклору з улікам яго нацыянальнай самабытнасці і рэгіянальных варыянтаў. Паводле У.М. Конанасёння патрэбна актуалізацыя каляндарна-абрадавых свят як развітой мастацкай сістэмы праз пошук метадаў увядзення іх у кантэкст сучаснай мастацкай культуры ў якасці *эстэтычна арганізаванай традыцыі*. Вось яго словы на гэты конт: “У эстэтычным полі зроку аўтэнтычная народная творчасць – не толькі мінуўшчына, але сучаснасць і будучыня; крыніца ідэй і вобразаў не толькі ў прафесійным мастацтве класічнага тыпу, але ў пэўным сэнсе – мадэрнісцкага

[4] Распрацоўцы тэарэтычных падыходаў да рэканструкцыі традыцыйных абрадаў, практыцы іх пераймання і ўзнаўлення прысвечана праца многіх фалькларыстаў-практыкаў, этнапедагогаў і аматараў фальклору Беларусі: Валянціны Якімовіч, Аляксея Галіча, Іллі Арыстава, Ларысы Рыжковай, Рэгіны Гамзовіч, Наталлі Матыліцкай, Таццяны Пладуновай, Вячаслава Калацэя, Аляксея Глушко, Ірыны Мазюк, Антаніны Абрамовіч, Лізаветы Пятроўскай, Сяргея Выскваркі, і шмат іншых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і постмадэрнісцкага. Адначасова яна захоўвае сваю эстэтычную самадастатковасць для сучаснай і будучай культуры. Фальклорная традыцыя страчвае свае сакральныя функцыі; але захоўвае сваю эстэтычную сугестыўнасць. Аўтэнтычныя абрады — гэта каталізатары фальклоратворчасці — могуць адрадзіцца ў яксці эстэтычна арганізванай традыцыі. У такім творчым полі зроку адраджэнне фальклору, яго прысутнасць тут і цяпер — не толькі мара, але і навуковы прагноз".

## 2. Збіранне і даследаванне беларускага фальклору

Пытанні

1. Агляд важнейшых публікацый і даследаванняў беларускага фальклору.
2. Асноўныя прынцыпы збірання і вывучэння народнай творчасці
3. Цэнтры збірання і комплекснага вувычэння беларускага фальклору.

Літаратура па тэме:


1. Беларуская фальклярыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская, І. К. Цішчанка, У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1989. – 332 с.
2. Белорусская этномузыкология : Очерки истории (XIX – XX вв.) /З.Можейко, Т.Якименко, Т.Варфоломеева и др.; под ред. З.Можейко. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 254с.
3. Дарашэвіч, Э., Тэорыя фальклору / Э. Дарашэвіч // У тэзаўрусе Беларусі : да 80-годдзя Энгельса Дарашэвіча. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2011. – С. 10 – 80.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Круглов Ю.Г. Фольклорная практика: Пособие для студентов пед. ин-тов по спец. №2101 "Рус. яз. и лит." – 2-е изд., дораб. – М.: Просвещение, 1986.
5. Фядосік, А.С. Прынцыпы класіфікацыі і выдання фальклорных твораў у шматтомным зводзе беларускай народнай творчасці / А.С.Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 2003. – С.18 – 24.
6. Кабашнікаў, К.П. Методыка збірання беларускай народнай вуснапаэтычнай творчасці / К.П. Кабашнікаў. – Мінск. 1978. – С. 24 – 48.
7. Программа для комплексних фольклорных экспедиций / Отв.ред. В.Е.Гусев. – М., 1971. – С. 12 – 21.
8. Савушкина Н.И. О собирании фольклора / Н.И. Савушкина . – М., 1974. – С. 34 – 42.
9. Помнікі этнаграфіі: Методыка выяўлення, апісання і збірання. – Мн.: Навука і тэхніка, 1981. – С. 120 - 132.

Фальклрыстыка - спецыяльная навука, якая займаецца зборам, сістэматызацыяй і даследаваннем фальклору. Дзякуючы фальклрыстам, якія ў фальклорных экспедыцыях фіксавалі ўзоры народнай культуры і побыту, былі выдадзены і працягваюць выданне фальклрыстычныя зборы, якія прадстаўляюць сапраўдныя помнікі народнай культуры і мастацтва.Гэта і друкаваныя зборы, і аўдыё-відэаматэрыялы, выдадзеныя ў розныя гады пэўнымі інстытутамі (НАН РБ, БДУ, БелДІПК, БДАМ, БДУКМ). Фальклрыстыка пастаянна папаўняе "банк дадзеных" тэорыі народнай мастацкай культуры аб відах і жанрах народнай мастацкай творчасці, дазваляючы на гэтай аснове выяўляць яго сутнасныя рысы і агульныя заканамернасці.

Найбольш поўным і змястоўным па колькасці твораў вусна-паэтычнай, песеннай і музычнай творчасці зяўляецца выданне серыі ***"Беларуская народная творчасць",*** распачатая ў 70-я гады ХХ стагоддзя Інстытутам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтвазнаўства. Этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі . Серыя пабудавана па жанраваму прынцыпу і здольна забяспечыць патрэбы planавання вучэьна-выхаваўчай дзейнасці фальклорныга гурат ў адпаведнасці с з сезоннай цыклічнасцю: “Зімовыя псені”, “Веснавыя песні”, “Валачобныя песні”, “Купальскія і пятроўскія песні”, “Жніўныя псені”, і г.д. Гэта ж установа працягвае выданне буйной серыі беларусазнаўства ***“Беларусы”***(у 12 т.).

Прынцып поліжанравасці і рэгіянальнасці характэрызуе буйное выданне серыі ***“Традыцыная мастацкая культура Беларусі”,*** распачатая лабараторыяй традыцыйнай культуры Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры. У гэтым выданні дадзена панарама развіцця традыцынай культуры ў этнаграфічных рэгіёнах  на сучасным этапе і змешчаны багаты матэрыял па ўсіх відах фальклорнага мастацтва: абрады і песні да іх, танцавальна-гульнёвы фальклор і інструментальная музыка, вусна-паэтычная творчасць, касцюм, народны тэкстыль і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.

Вялікую ролю ў развіцці беларускай фалысларыстыкі адыгралі даследаванні этнамузыколагаў. Пачатак вывучэнню народнай музычнай культуры палажыў В.І. Ялатаў. Этнамузыколаг З.Я. Мажэйка паспяхова даследавала рэгіянальныя асаблівасці песеннай творчасці беларусаў у кнігах: “Песенная культура Беларускага Палесся” (1971), “Песні Беларускага Палесся” (1983-1984), “Песні беларускага Паазер'я” (1981). Яна ўпершыню глыбока тэарэтычна асэнсавала і раскрыла сістэму каляндарнай песеннай творчасці, спецыфіку функцыянавання ў манаграфіі “Каляндарна-песенная культура Беларусі: Вопыт сістэмна-тыпалагічнага даследавання" (1985). Разам з Т.Б. Варфаламеевай яна надрукавала зборнік “Песні Беларускага Падняпроўя” (1999).

Музычны песенны фальклор аналізуецца ў манаграфіі Л.С. Мухарынскай. Народныя танцы характарызуюцца ў кнігах Ю.М. Чурко, а

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таксама ў шматлікіх публікацыях М.А. Козенкі. Музычныя народныя інструменты апісаны І.Дз. Назінай.

Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта дадалі ў гэты фонд свой унёсак. З 60-ых гадоў XX стагодзя яны выязджаюць на штогадовую фальклорную практыку, апошнім часам, як правіла, працуюць у родных мясцінах. Матэрыялы практыкі напачатку захоўваліся ў кафедральных архівах, а пазней у архіве ***фальклорнай лабараторыі філалагічнага факультэта.*** Значную частку студэнцкіх запісаў складалі каляндарна-абрадавыя песні: калядкі, шчадроўкі, вяснянкі, юраўскія, валачобныя, купальскія, жніўныя, восенскія і інш. Яны ўвайшлі ў некалькі зборнікаў, падрыхтаванных фалькларыстамі філалагічнага факультэта БДУ: 1) Беларускі фальклор у сучасных запісах. Брэсцкая вобласць. Традыцыйныя жанры; 2) Песні сямі вёсак: традыцыйная народная лірыка Міншчыны; 3) Песні народных свят і абрадаў; 4) Беларускі фальклор у сучасных запісах . Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць; 5) Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць. Выкарыстоўваецца і такая форма захавання каляндарна-абрадавых тэкстаў, як выданне серыі “ Метадычныя ўказанні і ілюстрацыйны матэрыял да правядзення фальклорнай практыкі студэнтаў 1-га курса філалагічнага факультэта”, дзе ілюстрацыйны матэрыял прадстаўлены папярэднімі запісамі студэнтаў і выкладчыкаў. Выйшлі з друку наступныя выпускі: Каляндарная абраднасць Іванаўскага р-на Брэсцкай вобласці ( 1997), Каляндарна-абрадавая паэзія ( 1997), Валачобныя песні (1998), Купальская абраднасць(1999), Масленічныя песні (2008), Карагодныя песні ( карагоды) (2009), Баладныя песні ( 2010). Як вядома, частку беларускіх баладных песен складаюць каляндарна-абрадавыя балады.

Сваю спецыфіку мае праца па збіранні і захаванні каляндарна-абрадавага фальклору ў БДУКіМ. ***Фальклорны фонд кафедры этналогіі і***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***фальклору*** папаўняюць экспедыцыйныя запісы выкладчыкаў і студэнтаў спецыялізацый “Этнафоназнаўства” і “Абрадазнаўства”. Істотна тое, што праца па збіранні, апрацоўцы і сістэматызацыі фальклорных узораў скіравана на іх папулярызацыю і рэвіталізацыю ў сучаснай культурнай прасторы.

Багаты архіў фальклорных запісаў захоўвае ***кабінет традыцыйных култур*** Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Апошнім часам ён стаў выпускаць капакт-дыскі ўзораў вакальнай і інструментадбнай этнафоніі серыі “Аўдыёатлас Беларусі”.

Невычэрпнай крыніцай мастацкага досведу з’яўляюцца ***ўзоры аўдыё-візуальнай антрапалогіі,*** запісаныя айчыннымі фалькларыстамі З.Я Мажэйка, і.Д.Назінай, Т.Б. Варфаламеевай. Р.С.Гамзовіч. М.А. Козенкам, т.і. Кухаронак , Л.П.Касцюкавец і інш.

**Аўдыёграфія**

Грамдыскі

1. Белорусские народные песни: Этнографический ансамбль села Ананьчицы Солигорского района Минской области / Сост. Л.Костюковец. М., “Мелодия”, 1982.
2. Белорусский песенный фольклор / Сост. З. Можейко, И. Назина, Т. Варфоломеева. Экспед. записи Фольклорной комиссии СК Белоруссии 1960-1980 гг. М., “Мелодия”, 1990. 2 грп. (Серия “Музыкальное творчество народов СССР: Антология”).
3. Белорусский песенный фольклор: Северо-восточная зона / Сост. З. Можейко. М., “Мелодия”, 1986.
4. Календарные песни Белорусского Полесья: Из собрания Фонограмархива Пушкинского Дома / Сост. Ю.Марченко. М., “Мелодия”, 1983.
5. Напевы родины Мусоргского / Сост. А.Мехнецов, Г.Лобкова. М., “Мелодия”, 1987.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Народные песни и наигрыши Псковской области: По материалам фольклорных экспедиций Н.Л.Котиковой / Сост. А.Ю.Кастров. М., “Мелодия”, 1989.
7. Песни Смоленского Поднепровья: Из собрания Фонограмархива Пушкинского дома / Аннотация С.В.Фролова. М., “Мелодия”, 1989.
8. Русская народная музыка западных, центральных областей и Поволжья / Сост. Н. Савельева, Н.Гилярова. М., “Мелодия”, 1990. 2 грп. (Серия “Музыкальное творчество народов СССР: Антология”).
9. Традиционное искусство Поозерья: Обрядовая музыка / Сост. А.Ромодин, И.Ромодина. М., “Мелодия”, 1989.
10. Традиционное искусство Поозерья: Вечериночная музыка / Сост. А.Ромодин, И.Ромодина. М., “Мелодия”, 1990.
11. Традиционные песни Полесья: Из собрания Фонограммархива Пушкинского Дома / Сост. Л. Петрова, Ю. Марченко. М., “Мелодия”, 1989.
12. Усвятские песни: Поёт народная исполнительница Ольга Сергеева / Аннотация Е.Н.Разумовской. М., “Мелодия”, б.г.

CD –дыскі

13. Аўтэнтычная музыка Беларусі: Каляды. Часткі I, II [Электронны рэсурс] / склад. Ю. Выдронак. – Мінск: Беларуская музычная альтэрнатыва, 2000.
14. Музычныя традыцыі Масленіцы Беларускага Падняпроўя [Электронны рэсурс] / склад. В.М. Прыбылова. – Электрон. дадз. (48’23’’ гуч.). – Мінск: УА “Беларус. дзярж. акад. музыкі”, 2006. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM): гуч., буклет (12 с.).
15. Народныя песні Беларускага Панямоння [Электронны рэсурс] / склад. Т. Б. Варфаламеева – Мінск: УА “Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры”, 1992. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM): гуч., буклет.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. Народныя песні Цэнтральнай Беларусі [Электронны рэсурс] / склад. Т. Б. Варфаламеева – Мінск: УА "Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры", 1992. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM): гуч., буклет.
17. Століншчына: Экспедыцыя Івана Кірчука ў Столінскі раён Брэсцкай вобласці [Электронны рэсурс] / склад. І.Кірчук – Мінск: - Беларуская музычная альтэрнатыва, 2005
18. Этнічная музыка беларусаў: у 5 дысках [Электронны рэсурс] / кір. праекта А.М.Боганева, уклад. І.В.Мазюк. – Мінск: УА "Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры, 2006. – 5 электрон. апт. дыскаў (CD-ROM): гуч., буклет.

**Кіна- , відэаграфія**

1. Голоса веков / Сцен. З. Можейко. – Белорусьфильм, ВА "Летапіс", 1979.
2. Память столетий / Сцен. З. Можейко. – Белорусьфильм, ВА "Летапіс", 1982.
3. Пранясі, Божа, хмару / Сцэн. З. Можейко. - Беларусьфільм, ВА "Летапіс", 1990.
4. Рух зямлі / Сцэн. З. Можейко. - Беларусьфільм, ВА "Летапіс", 1999.
5. Мужчынскі рой / Сцэн. Г. Тавлай, рэж. С. Гайдук - РУП "Белвідыёцэнтр", 1995.
6. Мотальскія байкі / Сцэн. і рэж. В. Пястоў - РУП "Белвідыёцэнтр", 1990.
7. Карагод / Сцэн. Н. Козенка, рэж. і апер. О. Шклярэўскі - РУП "Белвідыёцэнтр", 1995.
8. Беларускае адзенне / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА "Радавод" Белтэлерадыёкампаніі, 1998.
9. Былічкі / сцэн. Р. Гамзовіч - ТА "Радавод" Белтэлерадыёкампаніі, 1996.
10. Вяселле ў Моталі. Абрад "свахі" / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. М. Зарэмба - ТА "Радавод" Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. Жураўка / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА "Радавод" Белтэлерадыёкампаніі, 1999.
12. Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА "Радавод" Белтэлерадыёкампаніі, 1997.
13. Культ продкаў / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА "Радавод" Белтэлерадыёкампаніі, 1998.
14. Стравы на Дзяды / сцэн. Р. Гамзовіч, рэж. А. Дыбча - ТА "Радавод" Белтэлерадыёкампаніі, 1998.

Фальклор вывучаюць у наступных аспектах (падыходах): *сінхронным* (вывучэнне фальклору ў адзіны часовы «зрэз»), *дыяхронным* (вывучэнне часовых змен у фальклоры напрацягу пэўнага тэрміну), *сістэмным* (падыход да фальклору як да сістэмы элементаў), *рэгіянальным* (вывучэнне фальклору аднаго гісторыка-культурнага рэгіёну, паселішча), *функцыянальным, тэксталагічным, сацыялагічным.* Асноўныя метады, якія шырока выкарыстоўваюцца ва ўсходнеславянскай фалькларыстыцы (табл.3) – *гісторыка-геаграфічны, гісторыка-тыпалагічны, структурна-тыпалагічны.*

У XIX - пачатку XX ст. выпрацаваліся асноўныя метады запісу і вывучэння фальклору.

• **Метад «Уключанага назірання»**выкарыстоўваецца пры стацыянарнай форме збіральніцкай працы. Пры выкарыстанні дадзенага метаду ствараюцца ўмовы нязмушаных зносін падчас збору матэрыялу. Информанты складаюць натуральную камунікатыўную сераду збіральніка. Спецыфіка збіральніцкай працы складаецца ў тым, што тэксты фіксуюцца ў сітуацыі размовы, але не спецыяльна арганізаванага інтэрв'ю, таму ў такой абстаноўцы не заўсёды магчыма прымяненне дыктафоны, частка тэкстаў запісваецца па памяці. Перавагі сабранага такім чынам матэрыялу складаюцца ў тым, што тэксты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

назіраюцца ў натуральнай абстаноўцы, гутарка з информантом справакаваная толькі зацікаўленасцю збіральніка, а не пытаннямі анкеты. Пры гэтым фіксуецца кантэкст гутаркі, статутныя, полаўзроставых характарыстыкі суразмоўцаў. Да недахопаў збірання матэрыялу метадам "уключанага назірання" можна аднесці, па-першае, невялікая колькасць тэкстаў, што вызначаецца свядомай неактыўнай пазіцыяй збіральніка, па-другое, недакладнасць фіксацыі тэкстаў (аказваюцца ўпушчаныя як фанетычныя характарыстыкі, так і абазначэння рытмічных перыядаў размовы, асобныя уступныя словы, неабходныя для аналізу иллокутивных установак тэксту.

• **Статыстычны метад**(быў распрацаваны Б. К. Паэме) - праводзіцца на аснове складання карт і табліц.

- **Сістэмны (комплексны) метад** прадугледжвае ўсебаковае вывучэнне фальклору, у суадносінах з пэўнымі бытавымі, этнаграфічнымі рэаліямі.

• **Картаграфічны метад**выяўляе геаграфію распаўсюджвання тых ці іншых жанраў фальклору, вывучэнне фальклорных з'яў «ў прасторы і ў часе». Гэта стратэгічны метад, разлічаны на доўгі даследаванне. Картаграфаванне можа праводзіцца па этнічнай, тэрытарыяльнай, часоваму прынцыпам і дазваляе прасачыць распаўсюджанасць і формы бытавання жанраў фальклору ў розных народаў і этнічных груп у розныя перыяды іх гісторыі. Вывучэнне фальклору метадам картаграфавання патрабуе вялікай падрыхтоўчай арганізацыйнай і збіральніцкай працы, і, як правіла, мае патрэбу ў аб'яднанні і каардынацыі фалькларыстаў. Так, папярэдне складаецца праграма картаграфавання, праводзіцца работа па выяўленню і сістэматызацыі наяўных матэрыялаў, выяўляюцца лакуны, складаюцца спецыяльныя карты, выпрацоўваюцца прынцыпы нанясення матэрыялаў на карту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод сучасных метадаў або падыходаў даследаванні фальклору неабходна назваць **тыпалагічны**, які тлумачыць не асобныя факты, а ўстанаўлівае заканамернасці. Так, тыпалагічнае падабенства выяўляецца ў фальклоры розных народаў у спецыфічным тыпе народнай творчасці (устность, калектыўнасць, традыцыйнасць, варыятыўнасць і інш.). Тыпалагічна падобныя формы і спосабы бытавання. Тыпалогія тлумачыць тыя дзіўныя факты падабенства і супадзенняў, якія нельга растлумачыць ні запазычаннем, ні генетычным сваяцтвам народаў.

Такім чынам, разнастайнасць падыходаў у вывучэнні народнай творчасці сведчыла аб спробах якая перажывае сваё станаўленне фалькларыстыкі ахапіць увесь прадмет як складаную сістэму многіх жанраў.

У ХХ стагоддзі для шэрагу фалькларыстаў альтэрнатывай спрошчана-сацыялагічнага падыходу сталі *метады фармальнага даследавання*: **структурна-тыпалагічны метад аналіза**, які прадугледжвае выяўленне інварыянтнай мадэляў жанраў, сюжэтаў, матываў і **гісторыка-тыпалагічны метад**,які прадугледжвае вывучэнне фальклорных твораў у гістарычным і этнаграфічным кантэксце.

## 3. Методыка даследавання абрадавых традыцый

Пытанні

1. Метады даследавання абрадавых традыцый
2. Архітэктоніка абрадавай дзеі як сукупнасць раўназначных па функцыянальна-семантычнай нагрузцы кодаў
3. Сістэматызацыя кодаў абраду

Літаратура па тэме:

1. Аникин, В.П. Теория фольклора. Курс лекций. / В.П. Аникин – М.: МГУ, 1996. – 408 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка. У 6 кн. / Рэдкал.: А. С. Фядосік (гал. рэд.) і інш. – АН Беларусі., Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн.: Бел. навука, 2001–2006: Каляндарна–абрадавая паэзія: Кн. 1. / А. С. Ліс, А. І. Гурскі, В. М. Шарая, У. М. Сівіцкі. 2001. – 515 с. – Пазаабрадавая паэзія: Кн. 3 / А.І.Гурскі, Г.А.Пятроўская, Л.М.Салавей. 2002. – 563 с.
3. Купальскі спеўнік: метадычны дапаможнік // аўтар-укл. Т.А.Пладунова. – Мінск: Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 160 с. : іл.
4. Методы изучения фольклора: Сб. науч. тр. / Отв. ред.: В.Е.Гусев. - Л.: Лениздат, 1983. - 154 с. (Фольклор и фольклористика; Вып. 7).
5. Можейко, З.Я. Календарно-песенная культура Белоруссии: Опыт системно-типологического исследования / З.Я. Можейко. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 247 с.
6. Славянские древности: этнолингвистич. словарь в 5-ти томах. / под ред. Н. И. Толстого. М.
7. Толстой, Н. И. Язык и народная культура. – М.: Индрик, 1995. – 510 с. – (Традиционная духовная культура славян).
8. Толстой, Н. И., Толстая, С. М. К реконструкции древнеславянской духовной культуры (лингво- и этнографический аспект)//Славянское языкознание / VIII Междунар. съезд славистов. Загреб-Любляна, сент. 1978 г. – М.: Наука, 1978. – 469 с., 1 л. карт.
9. Толстые Н. И. и С. М. Славянская этнолингвистика: вопросы теории. — М.: Институт славяноведения РАН, 2013. — 240 с. (Материалы ко Второму Всероссий- скому совещанию славистов 5–6 ноября 2013 г.)

Метады даследавання абрадавых традыцый адпавядаюць асноўным метадам вывучэння фальклору (глядзі **Тэму 2**). Аднак асаблівай увагі варты этналінгвістычны накірунак, які ўключае складаны комплекс метадаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыёмаў розных навук. Нас цікавяць асобныя з іх, выпрацаваныя ў межах маскоўскай этналінгвітсычнай школы, створанай акадэмікам М.І.Талстым.

Аб'ектамі аналізу ў працах М.І. Талстога і яго вучняў і супрацоўнікаў з'яўляюцца славянскія міфы, рытуалы, народны каляндар, дэманалогія, павер'і, стэрэатыпы штодзённых і рытуальных паводзін, абрадавая лексіка і фразеалогія, рытуальныя тэксты (песні, замовы і г. д.), сімволіка, сістэма метафар і іншыя формы традыцыйнай духоўнай культуры славян, што знайшло адлюстраванне ў шматлікіх публікацыях (дысертацыі, манаграфіі, зборнікі артыкулаў, перыёдыка).Мова ў гэтых даследаваннях трактуецца як «натуральны» субстрат культуры, якім прасякнуты ўсе яе бакі, служачы інструментам ментальнага ўпарадкавання этнічнага светасузірання. Пры такім падыходзе бачыцца ўзаемасувязь мовы і невербальных рэалізацый культуры, калі мова не толькі адлюстроўвае культуру і апасродкаваную ёю рэальнасць, але, у сваю чаргу, аказвае істотны ўплыў на афармленне нямоўных культурных кодаў. З іншага боку, вывучэнне механізмаў моўнай эвалюцыі настойліва патрабуе выяўлення яе фактараў, якія ляжаць па-за межамі самой мовы.

Мэта этналінгвітыкі – семантычная *рэканструкцыя* традыцыйнай ( архаічнай, дахрысціянскай, міфапаэтычнай) карціны свету, светапогляду, сістэмы каштоўнасцей .І вось у гэтым кантэксце яна падаецца актуальнай як навуковы падмурак працы этнапедагога і рэжысёра. Так у іх працы па мастацкай рэканструкцыі абрадавга свята варта прадугледзіць яе даследчы этап, у якім бясцэннай падаецца ***методыка даследавання абрадаў*** расійскіх вучоных М.І. і С.М. Талстых. Разгляд любой абрадавай дзеі прадстаўлены імі як сукупнасць раўназначных па функцыянальна-семантычнай нагрузке ***кодаў***. Паводле высноў даследчыкаў архітэктоніка гэтыхкодаў выбудоўваецца наступным чынам:

1) тэмпаральны код – час правядзення абраду (свята);

2) акцыянальны код – паслядоўнасць абрадавых дзей (рытуал);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3) лакатыўны код – месца правядзення абраду (свята);

4) персанальны код – кола ўдзельнікаў, наяўнасць персанажаў, імёнаў;

5) атрыбутыўны код – выкарыстанне абрадавых атрыбутаў, адзення, маскіравання, прылад працы, інш;

6) музычны код – тыпавыя напевы з адмысловымі этнафанічнымі прыкметамі і гукаідэал інструментальнай этнафоніі;

7)вербальны – наяўнасць заклікаў, замоў, зычэнняў, праклёнаў, сваркі, жартаў, сакральнага маўчання або смеху ў абрадзе.

У сучасным культурна-адукацыйным працэсе Беларусі распрацаваная выкладчыкам кафедры этналогіі і фальклору БДУКМ Т.А.Пладуновай ***абрадавая карта*** (мал. 1) можа быць рэкамендавана этнапедагогам, кіраўнікам аматарскіх фальклорных калектываў, культарганізатарам для сістэматызацыі абрадавых кампанентаў свят як даследчы метад іх мастацкага рэканструявання.

**Абрадавая карта свята ________у рэгіёне (вёсцы)__________**

| **Акцыя-наль**<br><br>*Ход абрадавых (рытуал* | **Тэмпа-ралі**<br><br>*Час адпраўл абрадавых* | **Лакатыў-**<br><br>*Месі адпраўл абрадавых* | **Перса-нальн**<br><br>*Кола ўдзель персанаж* | **Атрыбу-тыў**<br><br>*Абрадавая атр прылады пр абсталя-в* | **Музычна-верб код**<br><br>*Песеннае і верб суправад-жэ абрадавых пс* | **Музычн інструментал**<br><br>*Інструмен-т суправа-дж абрадавых* | **Пластыч-**<br><br>*Пласты ўвасабл абрадавых* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | | | | |
| **Матывацыя і сементыка адпраўлення абрадавых падзей (рытуалаў)** | | | | | | | |

Малюнак 1 – Абрадавая карта свята (узор).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Таксама неабходна звярнуць увагу на даследаванні і навуковыя трактоўкі беларускай абраднасці айчынных фалькларыстаў і культуролагаў А.С. Ліса, З.Я.Мажэйка, У. А. Васілевіча, А.Ю. Лозкі, В. Д. Ліцвінкі, В.А.Шарай, Г.В.Таўлай, С.А.Санько, І.І.Крука, В.В.Калацэя, інш.

## 5. Аматарская фальклорная дзейнасць як фактар захавання і пераемнасці беларускіх абрадавых і пазаабрадавых традыцый

Пытанні

1. Ахова і зберажэнне аўтэнтычных традыцый у аматарскай творчасці
2. Сістэматызацыя тыпаў і форм фалькларызму па ўвасабленні фальклорнага мастацтва ў аматарскай творчасці
3. Фальклорны гурт як творчая лабараторыя па вывучэнні, засваенні і папулярызацыі народных мастацкіх традыцый, абрадаў і свят.

Літаратура па тэме:


1. Аляхновіч А.М. Народная песня ў мастацкай самадзейнасці.- Мн.: Універсітэцкае, 1991.
2. Гусев, В.Е. Фольклоризм как фактор становления национальных культур / В.Е. Гусев // Формирование национальных культур в странах Центральной и Юго-Восточной Европы.– М.:Наука, 1977. – С. 17 –25
3. Жуланава Н.И. Моладёжное фольклорное движение //Самодеятельное художественное творчество в СССР. Очерки истории. Конец 1950 - начало 1990-х годов. СПб., 1999.
4. Земцовский, И.И. О современном фольклоризме/ И.И. Земцовский // Традиционный фольклор в современной художественной жизни.– М.:Наука, 1984. – С. 4 – 15


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. Кабанов А.С. К проблеме сохранения песенной фольклорной традиции в современных условиях //Художественная самодеятельность: вопросы развития и руководства. Труды НИИ культуры. Вып.88.М., 1980.
6. Кабанов А.С. Современные фольклорные коллективы в городе. М., 1986.
7. Нарматыўнае вытворча-практычнае выданне "Нарматыўна-прававыя дакументы па праблемах арганізацыі аматарскай творчасці. Вып.4 – Мн.: БелІПК, 1999:
8. Науменко Г.М. Фольклорная азбука: Учебное пособие для начальной школы. – М.: Издательский центр "Академия", 1996.
9. Петухова, Н.В. Да праблемы актуалізацыі традыцыйнага народнага мастацтва ў дзейнасці аматарскіх фальклорных калектываў / Н.В. Петухова // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 35-годдзю БДУКМ (Мінск, 3 снеж. 2010 г.) : у 2 т. / рэдкал.: М.А. Мажэйка (старш.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – Т. 2. – С. 302–305.
10. Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах. (Методическое пособие). – М.: ВНМЦ НТ и КПР, 1984.

Не сакрэт, што сёння для беларусаў рызыка забыцця і страты сябе як народа відавочна. У гэтым кантэксце варта прааналізаваць, наколькі склаўшаяся практыка выхавання і навучання дзяцей і моладзі ва ўстановах адукацыі і культуры Беларусі мае патэнцыял пераламіць такія тэндэнцыі.

Агульнавядома, што галоўнай умовай сацыялізацыі маладога пакалення ў паспяховым, стабільным грамадстве з'яўляецца засваенне культурнай спадчыны свайго народа. І менавіта народная традыцыя з'яўляецца важнейшым каналам перадачы сацыякультурнага вопыту. Таму і дзейнасць устаноў культуры і адукацыі павінна быць накіравана на ўзнаўленне т о й часткі культуры, якая прадстаўлена ў *лепшых нацыянальных*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*традыцыях беларусаў*. І менавіта ў традыцыйнай культуры – крыніцы духоўнага імунітэту, душэўнага здароўя любой нацыі.

У сёнешняй сітуацыі разбурэння абшчыннага сялянскага ладу жыцця і ўрбанісытычных наступстваў развіцця грамадства назіраецца пэўны разрыў паміж пакаленнямі і аб'ектыўная парушанасць перадачы сацыякультурнага вопыту, якія вядуць да згубы назапашаных нашымі продкамі культурных каштоўнасцяў. І калі ў гарадской культуры шырокіх і моцных сацыяльных сувязей людзі не маюць, там ўзнікаюць адпаведныя "сервісы" – структуры і інстытуты перадачы культурнага вопыту, развіцця на яго аснове новых культурных каштоўнасцей. Такімі структурамі нам бачацца аб'яднанні аматарскай творчасці (гурткі, суполкі, калектывы, ансамблі, клубы, г.д.), якія заклікана ажыццяўляць захаванне і далейшае развіццё культуры і мастацтва ў цэлым, і асабліва нацынальнага.

Фальклорны гурт выступае як творчая лабараторыя па вывучэнні, засваенні і папулярызацыі народных культурных каштоўнасцей і мастацкіх традыцый.Такім чынам у дзейнасці сучаснага фальклорнага гурта спалучаецца некалькі задач:

1) ахова і збераджэнне аўтэнтычных традыцый;
2) пераемнасць культуры ў пакаленнях;
3) развіццё аматарскай творчасціяк з'явы і творчага патэнцыялу кожнага з яе удзельнікаў;
4) забеспячэнне якаснага культурнага адпачынку і міжасобнай камунікацыі.

Што тычыцца зместа дзейнасці аматарскага фальклорнага калектыву, то варта прааналізаваць якія тэндэнцыі мы маем у развіцці народнай творчасці, як яны адлюстроўваюць інтэнсіўнасць і якасць выкарыстання фальклорнай спадчыны, г.зн. у якім напрамку развіваецца так званы фальклярызм.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фальклarызм – гэта з’ява сучаснай мастацкай культуры, якая адлюстроўвае ўвесь спектр творчых інтэрпрэтацый фальклору. Тэрмін “фальклarызм” быў уведзены ў навуковае карыстанне французскім фальклarыстам XIX ст. П. Себіё для характарыстыкі другасных, неаўтэнтычных фальклорных з’яў (фальклор на сцэне, у мастацкай самадзейнасці, прафесійнай творчасці і інш.). Шырокае распаўсюджванне ён атрымаў ў даследаваннях 60-х гг. XX ст., што тлумачыцца навуковым асэнсаваннем масавай міграцыі вясковага насельніцтва з уласцівай яму фальклорнай культурай ў гарадское асяроддзе. Такая сітуацыя своеасабліва паўплывала на існаванне і функцыянаванне фальклору, на яго трансфармацыю ў межах урбанізаванай культуры, што знайшло сваё адметнае адлюстраванне ў навуковых працах. Уключэнне праблем фальклarызму ў лік вучэбных дысцыплін дазваляе не толькі пашырыць веды студэнтаў аб традыцыйным фальклоры і спосабах яго захавання, але і магчымасцях выкарыстання фальклору ў будучай прафесійнай дзейнасці.

Асвятленне праблемы фальклarызму ў працах сучасных даследчыкаў (Б.М. Пуцілаў, В.Е. Гусеў, І.І. Зямцоўскі, С.Ю. Няклюдаў, А. В. Захараў, А.М. Аляхновіч). Гэтыя даследчыкі і педагогі турбуюцца перспектывамі існавання і развіцця фальклору ў сучасных сацыяльна-культурных умовах, пытаннямі узаемадзеяння фальклору і сучаснай культуры, фактарамі адраджэння традыцыйнай культуры ў сучасным мастацкім жыцці краіны.

Апошнім часам назіраюцца тэндэнцыі разбурэння этнічнай самабытнасці і разам з тым мода на фальклор, бум неаязычніцтва, а таксама розныя праявы стылізацыі і мадэрнізацыі традыцыйных відаў мастацтва, псеўдафальклор.

Усе гэтыя напрамкі сёння неад’емная частка нашага сучаснага культурнага ландшафту: ад апрацовак і цытавання (М.І. Глінка,П.І. Чайкоўскі,М.А. Рымскі-Корсакаў,І.Ф. Стравінскі, Ю.В. Семяняка, У.В. Тэраўскі, Р.Р. Шырма, Г.І. Цітовіч, Г.М. Вагнер, А.Ю. Мдзівані, А.Е.

Туранкоў, Д.Б.Смольскі,А.У. Рашчынскі,Л.І. Сімаковіч, С. Манюшка, М.Карловіч і інш.), узораў "літаратурнага фальклярызму" (Я. Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч, Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, К. Каганец, М. Гарэцкі, К. Чорны і інш.) да апрацоўвак фальклору ў стылі фольк-мадэрн і фольк-фьюжн ("Палац", "Тройца", "Крыві", "Юр'я"), спадкаемцы аўтэнтычных фальклррных гуртоў працуюць у так званым рэпрадуктыўным стылі.

Значная родя ў папулярызацыі фальклору і традыцыйнай культуры сродкаў масавай інфармацыі: этнаграфічныя фільмы (З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева, І.Д. Назіна, Р.С. Гамзовіч, Т.І. Кухаронак), радыёпраграмы "Галасы стагоддзяў", "Гасцінец", "Беларуская этнафонія"; тэлецыкл "Радавод", выданні і публікацыі аўтэнтычнага фальклору ў навукова-папулярным і масавым друку. Усё гэта сведчыць пра новыя функцыі народнай творчасці: асветніцкая, адукацыйная, інфарматыўная, арганізацыйная, палітыка-прапагандысцская, забаўляльная і інш. Разам з тым ідзе пошук форм бытавання фальклору ў сучасным урбанізаваным свеце, які набывае незвычайныя рысы сімбіёзу традыцыйнай і масавай культуры.

Крызіс народна-харавога жанру ў 60-х гг. XX стагоддзя у СССР меў рэакцыю ў маладзёжным фальклорным руху савецкіх рэспублік (Расіі, Латвіі, Літве, Грузіі, Беларусі, Эстоніі) і выліўся ў фарміраванне новага навуковага кірунку – "практычная" ці "эксперыментальная" фалькларыстыка ("співаючыя музыказнаўцы"), яе ўзаемадзеянні з сацыякультурнай практыкай. Тады ўзнавіўся феномен музычна-этнаграфічных канцэртаў з удзелам аўтэнтычных спевакоў і музыкантаў, фальклорныя экспедыцыі ў гуманітарных ВНУ сталі актуальным, узнікла цікаўнасць да фальклору ў моладзі. Новыя формы практычнага засваення народнага мастацтва ў гарадскіх умовах выпрацоўваліся у рамках такіх новых абяднанняў як гарадскі фальклорны ансамбль несцэнічнага тыпу (дзейгасць Д. Пакроўскага, І.Мацыеўскага, А.Мехнецова). Цікаўнасць да сацыякультурнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эксперымента А. Кабанава па аднаўленні традыцыйных сітуацый для спеваў і сёння мае свой рэальны водгалас у сучасных святах.

Маладзёжны фальклорны рух на Беларусі 70 – 80-х гг. пакінуў памяць пра аматарскія суполкі “Майстроўня”, “Талака” і выклікаў да стварэння шматлікія сцэнічныя гурты (“Дзянніца”, “Госьціца”, “Зорачка”, “Каляханка”, “Ліцьвіны”, “Валачобнікі”, “Грамніцы”, Рунь”, “Неруш”, інш.). Сёння новая хваля моды на “этнаграфічнасць” выканання народнай музыкі (“Ветах”, “Рада”, “Маладзёвы”, “Талака”, “Гасцінец”, “Верас”, “Эсса”, шматлікія калектывы праекта “Берагіня”.

Паводле І.І. Зямцоўскага, А.М. Аляхновіча магчыма прадставіць настурную ***сістэматызацыю*** тыпаў і форм фальклярызму ў аматарскай творчасці:

1) Аўтэнтычны фальклор
2) Рэстаўраваны і рэканструяваны фальклор
3) Рэпрадуктыўны тып фальклярызму (засваенне мастацкай традыцыі рэгіёну вусным шляхам)
4) Апрацаваны фальклор з улікам рэгіянальных асаблівасцяў
5) Стылізаваныя формы ўвасаблення фальклорнага мастацтва (акадэмізаваны тып фальклярызму; фольк-мадэрн; інш.).

У кантэксце аднаўлення і папулярызацыі традыцыйных абрадаў у сучасным культурным кантэксце ўсе прыведзеныя тыпы фалклярызму мабюць права на жыццё.

❖ **АЎТЭНТЫЧНЫ ФАЛЬКЛОР** – асобая спецыфічная галіна духоўнай культуры, якая аб’ядноўвае ўсе віды творчай дзейнасці – славесную, музычную, народныя абрады, танец, народны тэатр, прыкладное мастацтва ў іх спрадвечным, адэкватным ***генетычным вытокам выглядзе*** (без якіх-небудзь апрацовак). Функцыяніруе ў натуральным вясковым асяроддзі; існуе як ***вусная традыцыя***; праяўляе сябе шматфункцыянальна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

як калектыўная свядомасць, псіхалагічна арыентаваная на непасрэдныя, нефармальныя адносіны.\

- **Носьбіты аўтэнтычнага фальклору** – асобы, якія генетычна звязаны з натуральным фальклорным асяроддзем пэўнай мясцовасці, атрымалі фальклорныя веды, творчае ўменне ад сваіх папярэднікаў ***вусным шляхам*** і такім жа шляхам перадаюць іх наступным пакаленням.
- **Аўтэнтычны фальклорны гурт** – гэта суполка, якая складаецца з носьбітаў аўтэнтычнага фальклору і дзейнасць якой ажыццяўляецца на прынцыпах самаарганізацыі і самарэгуляцыі.
- **Праява аўтэнтычнай традыцыйнай культуры** – гэта канкрэтная матэрыяльная або нематэрыяльная форма існавання данай культуры.
- **ДРУГАСНЫ (секундарны) ФАЛЬКЛОР** – розныя яго віды і жанры, прыстасаваныя для арганізаваных аматарскіх калектываў мастацкай самадзейнасці Могуць быць у апрацоўках, не неабываючы, аднак, форм уласна прафесійнай творчасці. Бытуюць у розных (пераважна сцэнічных) умовах вёскі і горада, выконваюць функцыю***рэкрэатыўную.***
- **Аматары фальклору** – асобы, для якіх ***арганізаваныя*** заняткі фальклорам – адна з форм правядзення вольнага часу. Дзейнасць аматараў фальклору арганізоўвае мастацкі кіраўнік.

## 6. Засваенне традыцыйных абрадаў і свят у аматарскай творчасці

Пытанні

1. Метады мастацка-практычнай фалькларыстыкі па вывучэнні, засваенні і ўвасабленні традыцыйных абрадаў і свят ў аматарскай творчасці
2. Этапы засваення, арганізацыі і правядзення абрадавага свята.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Літаратура па тэме:


1. Аляхновіч, А.М. Методыка асваення фальклорнай спадчыны / А.М. Аляхновіч, І.І. Сучкоў. – Мінск : Навука, 1995. – 243 с.
2. Дапаможнік для фальклорна-этнаграфічных калектываў. – Мінск : Выш. шк., 1988. – 243 с.
3. Кухаронак, Т.І., Кухаронак, В.Г. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў: вучэб.-метад. дапам. / Т.І. Кухаронак, В.Г. Кухаронак. Мінск: БДПУ, 2005. – 108 с.
4. Петухова, Н.В. Праблемы засваення народна-песенных традыцый у практыцы фальклорных калектываў / Н.В. Петухова // Серыя «У дапамогу педагогу» – Мінск : Выд. «Адукацыя і выхаванне», 2011. – С. 3–7.
5. Пладунова Т. Актуалізацыя этнафанічных традыцый каляндарна-абрадавага цыкла ў сучаснай культурнай прасторы//Фальклярыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. арт. Вып. 7 / пад навук. Рэд. Р.М.Кавалёвай, В.В. Прыемка. – Мінск: РІВШ, 2010. – 372 с. –С. 50-55..
6. Сучкоў, І.І. Фальклорны тэатр і выхаванне асобы / І.І. Сучкоў. – Мінск: НІА, 2001. – 176 с.


Станаўленне сучаснай святочнай культуры на аснове нацыянальнай спадчыны - адна з галоўных задач рэжысуры свят. Спецыфіка традыцыйных і сучасных свят, іх комплексны характар прадугледжвае стварэнне ўмоў для калектыўнай мастацкай творчасці, як формы арганізацыі вольнага часу. Нацыянальны каларыт, своеасаблівасць свят знаходзіцца ў прамой залежнасці ад выкарыстання народных традыцый.

Ідэя мастацкага рэканструявання каляндарана-абрадавых свят абгрунтавананавуковымі высновамі сучасных даслечыкаў і рэалізоўваецца ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працы фалькларыстаў-практыкаў (этнапедагогаў, кіраўнікоў фальклорных гуртоў).

Сіламі шматлікіх фальклорных аб’яднанняў краіны, а з 2004 года у рамках спецылізацыі “Этнафоназнаўства” БДУКМ распрацоўвалася ***методыка мастацкага рэканструявання*** каляндарных абрадаў на рэгіянальным матэрыяле. Яна актуалізуе форму свята, максімальна набліжаную да аўтэнтычнага арыгіналу. Пры адпраўленні таго ці іншага абраду ва ўмовах сучаснай рэканструкцыі непазбежны элементы мастацкага пераасэнсвання, аднак яны маюць на мэце падкрэсліць сэнсавыя асаблівасці абрадавага свята, не парушаючы нормаў народнай этыкі і эстэтыкі і пакідаючы месца для імправізацыі выканаўцаў.

У выніку назапашанага вопыту правядзення абрадавых свят на Беларусі магчыма прадставіць наступную ***праграму мастацкай рэканструкцыі*** каляндарна-абрадавага свята на дакументальнай аснове.

<u>Даследчы этап</u>

1) Тэарэтычны аналіз абрадавай традыцыі і яе рэгіянальных адметнасцей.

2) Збор і пашпартызацыя фальклорнага матэрыялу.

3) Сістэматызацыя фальклорнага матэрыялу паводле прыведзенай вышэй абрадавай карты.

4) Расшыфроўка, сітэматызацыя тыпавых напеваў і дапасаваных да іх песенных тэкстаў.

<u>Арганізацыйна-метадычны этап</u>

1) Афармленне падабраных этнафанічных і танцавальна-гульнявых узораў у рабочы нотны зборнік альбо ў фанатэку (напрыклад, “Калядны спеўнік рэгіёна (вёскі)”;

2) Складанне сцэнара паводле акцыянальных кодаў абрадавага свята з больш дэталёвым пазначэннем ходу абрадавых падзей і асобных момантаў свята, часу і месца іх правядзення; кола ўдзельнікаў і завадатараў свята,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абрадавых персанажаў, маскіравання і атрыбутыкі; зместу прымеркаванай да свята рэкрэацыйна-забаўляльнай часткі.Рэжысёрскае вырашэнне кожнага з эпізодаў свята.

Вучэбна-рэпетыцыйны этап

1) Фарміраванне спеўных гуртоў – ілюстратараў этнафоніі абрадавага рэгіёна (фальклорныя калектывы ўстаноў культуры і адукацыі, мясцовыя жыхары вёскі, горада).

2) Развучванне з імі песень, гульняў і танцаў з рабочага "Спеўніка".

Прэзентацыйны - творчы этап.

Адпраўленне абрадавага свята ў натуральных умовах бытавання адпаведна традыцыйнай даце і ў час, належны кожнай абрадавай падзеі, з уключэннем у святочную дзею ўсіх прысутных.

Аналітычны этап.

Аналіз зробленай мастацка-фалькларыстычнай працы, яе дакументаванне і архівацыя.

На аснове гэтай методыкі абрадавае свята магчыма адаптаваць пад рэгіянальнае (міжрэгіянальнае), ці агульнанацыянальнае – шляхам вылучэння асобных абрадавых этапаў і падбору да іх песенных узораў (адпаведна мэце правядзення свята). Па дадзенай методыцы студэнты першага набору спецыялізацыі "Этнафоназнаўства" ажыццявілі дыпломныя праекты "Купалле на Віцебскім Падзвінні", і "Беларускае Купалле на фестывалі "Берагіня" .

Не гледзячы на паступовае, нажаль, аб'ектыўнае затуханне традыцыйнай культуры ў аўтэнтычных формах яе бытавання, мастацкія каштоўнасці, назапашаныя ёю магчыма вывучаць сёння (шляхам уключанага назірання, альбо з архіўных фалькларыстычных крыніц), па-мастацку пераасэнсоўваць і актуалізаваць у другасных формах фальклору - сіламі сучасных фальклорных гуртоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метады мастацка-практычнай фалькларыстыкі па вывучэнні, засваенні і ўвасабленні традыцыйных абрадаў і свят ў аматарскай творчасці:

1. метады вуснай перадачы і ўключанага назірання (метад дэманстрацыйнай антрапатэхнікі);
2. тэхнічна апасродкаваны (аўдыё-відэа) ілюстратыўны метад;
3. метад этнафанічнага аналіза і транскрыпцыі аўтэнтычнага музычнага ўзору;
4. метад сінхроннага выканання-імітацыі музычнага, харэаграфічнага ўзору сумесна з аўтэнтычнымі выканаўцамі ( з аўдыё-відэастужкі);
5. метады паказу педагога-лідэра гурта, практыкаванняў і самастойнай работы;
6. метады эмпатыі і творчай імправізацыі.

## 7. Інавацыйныя формы і метады арганізацыі фальклорнай дзейнасці

Пытанні

1. Формы і метады ўключэння грамадства ў святочна-абрадавую цыклічнасць традыцыйнай культуры
2. Дзяржаўныя і грамадскія этнавыхаваўчыя праекты на аснове традыцыйнай народнай культуры
3. Шляхі і сродкі стымулявання творчай дзейнасці калектываў у этнакультурным рэчышчы.

Літаратура па тэме:


1. Беларускі фальклор у школе. Дапам. для настаўніка /І.І.Сучкоў, Ф.І.Таранава, Л.У.Рута, В.В. Куржалава. – Мн.: Нар. Асвета, 1996.
2. “Берагіня”. Чацвёрты рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва (2005-2006)/Аўтар-укладальнік М.А.Козенка.– Мінск: “Чатыры чвэрці”, 2006.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Камінскі А. Я. Рэжысура традыцыйнага абраду: вуч.-метад. Дапам. / А. Я. Камінскі.- МН.: Бел. дзярж. ун-т. культуры і мастацтваў, 2009. – 112 с.
4. Козенка, М.А. Вынікі фестывальных праектаў // Берагіня: чацвёрты Рэспубліканскі фестываль народнага мастацтва. Мінск: Чатыры чвэрці, 2006. – С. 142 – 173.
5. Пладунова Т. А. Этнакультурнае выхаванне дзяцей і моладзі ва ўмовах урбанізму // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі: матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 35-годдзю БДУКМ (3 снежня 2010 г.): у 2 т. / рэдкал.: М.А. Мажэйка (старшыня) [і інш.]. – Мінск: Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2011. – Т.1 – 406 с. –С. 180-185..
6. Специфика учебно-воспитательной работы в фольклорных певческих коллективах. (Методическое пособие). – М.: ВНМЦ НТ и КПР, 1984.
7. Традыцыйная культура і дзеці. Выпуск 1: Рэсп. Эксперым. праект “Танцав. фальклор і дзеці”/ Уклад. М.А.Козенка. – Мн.: БелДІПК, 2004.
8. Штудыі Рэспублікаскай сезоннай фальклорнай школы. – Мн.: БДУ культуры і мастацтваў, 2007.
9. Чацвёрты рэспубліканскі фестываль народнага танца “Беларуская полька”. Аўтар-складальнік М.А.Козенка. – Мінск: “Чатыры чвэрці”, 2000.
10. “Этнашкола” ў сучасным адукацыйным працэсе: вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / Уклад. і навук. Рэдакт. Праф. І.І.Сучкоў. – Мн.: Бестпрінт, 2004. – 255 с.

Паводле народнай педагогікі, назапашаны сацыякультурны вопыт перадаецца ў сям’і, ад старэйшага пакалення малодшаму вусным шляхам, аднак сучаныя ўрбанізаваныя ўмовы вымагаюць праектаваць інавацыйныя шляхі і сродкі яго трансляцыі. Прааналізаваўшы вопыт этнакультурнага выхавання на Беларусі, магчыма акрэсліць асноўныя **формы і метады**яго арганізацыі, перспектыўныя ў сучасных урбанізаваных умовах:

1. Аматарскі фальклорны калектыў сінкрэтычнага кірунку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Прафіліраваная фальклорная суполка (спеўная, танцавальная, музычная, тэатральная, народных рамёстваў)
3. Сямейны фальклорны ансамбль
4. Фальклорны клас у школе
5. Школа традыцыйнага мастацтва
6. Фальклорны летнік
7. Фестываль традыцыйнага мастацтва
8. Навукова-даследчая дзейнасць (этнаграфічная экспедыцыя, фальклорныя чытанні, этнаграфічны і пост-фальклорны кіналекторыі)
9. Мастацкая рэканструкцыя каляндарных і сямейных свят на дакументальнай аснове
10. Традыцыйная рэкрыяцыйная дзейнасць (гульнятэка, вячоркі, танцавальная вечарына, гасцёўня, пасядзелкі)
11. Канцэртна-спаборніцкія імпрэзы (тэматычны канцэрт, конкурс).

Вядомыя гараджанам праекты на аснове каляндарных свят музеяў у Заслаўі і Строчыцы (Масленіца, Гуканне вясны, Юр'я, Вялікдзень, Купалле, Дажынкі), мінскі фестываль сучаснага фальклору Юрася Выдронка актуалізуе асобныя святы (Каляды, Юр'я, Дзяды) і правакуе да каляндарнай творчасці як фальклорныя так і сучасныя рок-гурты.

Амаль нормай стала засваенне ў аматарскай фальклорнай творчасці абрадавых песень, у асобных вялікая цікаўнасць і да правядзення свят у натуральных умовах бытавання ("Жаніцьба Цярэшкі" у вёсках Аношкі Лепельскага раёна, Бабынічы Полацкага раёна, Купалле ў вёсцы Ракаў Валажынскага раёна, "Стрылка" ў вёсцы Ліпнікі Драгічынскага раёна, "Калядныя цары" у вёсцы Семежава Капыльскага раёна, "Гуканне вясны" у мінскім парку імя М.Горкага, шмат іншых).

Аднак варта вітаць і распрацоўваць іншыя формы правядзення мерапрыемстваў на каляндарнай святочнай аснове, а яны могуць быць досыць разнастайныя:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сучасныя **формы** актуалізацыі каляндарна-абрадавых традыцый:

- этнаграфічны і пост-фальклорны канцэрты
- тэматычная танцавальна-гульнёвая вечарына
- музычна-літаратурная гасцёўня
- фальклорны тэатр
- этнадыскатэка
- мастацкі перфомэнс
- кіналекторый,
- сезонны фальклорны лагер
- фальклорны фестываль.

Фестывальныя праекты паводле каляндарнага свята (цыкла): 1, 2, 3 рэспубліканскія змены этнакультурнага выхавання ў НДАЛ "Зубраня", якія ўключалі свята "Купалле" і "Гуканне вясны"; фестывальны праект "Па святах "Сонечнага крыжа" рэалізоўваўся ў рэспубліканскіх фальклорных фестывалях паводле каляднай ("Калядны фэст-2005) і веснавой святочнай абраднасці ("Веснавы танок-2008, 2010");

Фестывальныя праекты, якія ўключалі каляндарнае свята як форму масавага мерапрыемства: рэспубліканскі фестываль "Беларуская полька-2000" уключаў абрадавае шэсце "Страла", абласны фестываль "Радавод" быў адкрыты шэсцем гуртоў паводле траецкіх цырымоній "Ваджэнне Куста", рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацва "Берагіня" – свята "Купалле" (у 1999 і 2008 гадах).

Рэспубліканскія фальклорныя школы БДУКМ уключалі каляндарна-абрадавыя святы "Юр'я" (2006 г.), "Зялёныя святкі" (2007 г.) і "Каляды" (Абрадавая гульня "Жаніцьба Цярэшкі" (2008 г.) і "Абход казы" (2009 г.).

У краіне наладжана сістэма фестываляў народнага мастацтва, дзе фальклорныя калектывы маюць магчымасць заявіць пра сябе. Гэта міжнародныя фестывалі "Звіняць цымбалы і гармонік" у Паставах (усе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жанры), "Сожскі карагод" у Гомелі (харэаграфія), "Вясёлкавы карагод" і "Радавод" у Брэсце і Брэсцкай вобласці. Апошнім часам заявілі пра сябе як доўгатэрміновыя праекты, скіраваныя на этнічныя аўтэнтычныя формы фестывалі "Беларуская полька" (побытавы танец, народныя спевы, інструментальная музыка) у г. Чачэрску і "Берагіня" у г.п. Акцябрскі (прадстаўлены ўсе жанры фальклорнага мастацтва).Варта адзначыць, што гэтыя фестывальныя праекты стымулююць калектывы да ўдасканалення у выканальніцкай і пазнавальнай дзейнасці. Усім этапам фестывалю (раённаму, абласному, рэспубліканскаму) папярэднічаюць руплівая збіральніцкая (фальклорныя экспедыцыі), даследчая (фальклорныя чытанні, семінары, майста-класы), рэпетыцыйная праца і канцэртна-конкурсная практыка. Падчас экспедыцый "да бабулі ў госці" дзеці набываюць не толькі веды пра старажытную культуру свайго краю, але атрымліваюць і вялікі досвед народнай мудрасці, эмацыйны імпульс да творчасці на аснове роднай традыцыі, праз якую і магчыма повязь часоў і пакаленняў. У сваіх рэфератах юныя фальклярысты апісваюць пачутае і зразумелае сваёй мовай, але ад сэрца, чым фарміруецца кагнітыўны падыход да асэнсавання культуры і рэчаіснасці ў цэлым, навукова-творчы вектар развіцця асобы.

Напрацаваны вопыт у галіне этнакультурнага выхавання ў сістэме адукацыі таксама заслугоўвае увагі педагогаў і работнікаў культуры. Пачынаючы з 1997 года аддзел фальклору Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі праводзіў шэраг этнакультурных мерапрыемстваў канцэптуальнага зместу, што выбудавалася ў пэўную сістэму выхавання на падмурку традыцыйнай беларускай культуры. Гэта мастацкія праекты па папулярызацыіі беларускага фальклору сярод навучэнскай моладзі і метадычныя мерапрыемствы па іх аналітычным абагульненні. Праекты "Па Крывіі без баяна" (танцавальна-гульнёвыя вечарыны для дзяцей і моладзі ў дыска-клубах г. Мінска); "Па святах "Сонечнага крыжа" (адпраўленнеу

натуральных умовах бытавання асноўных каляндарна-абрадавых свят цыклаў “Вясна” – “Лета” – “Восень” – “Зіма”);“Фальклорны летнік” (фальклорныя “вучэнні” і адпачынак рэгіянальных дзіцячых гуртоў у НДАЛ “Зубраня”). Рэспубліканскія метадычныя мерапрыемствы: майстар-класы па розных відах традыцыйнага мастацтва (па традыцыйнаму побытаваму танцу, інструментальнай і вакальнай этнафоніі, правядзенні каляндарна-абрадавых свят, інш.);“круглыя сталы” па шэрагу этнапедагагічных праблем (арганізацыі вучэбна-выхаваўчай дзейнасці і адпачынку дзяцей-“фальклярыстаў”, рэпертуарнай палітыцы гурта на рэгіянальнай дакументальнай аснове, мастацкаму вырашэнню касцюма і атрыбутыкі, традыцыям і інавацыям выканальніцтва). У змястоўную аснову гадавога плана па вучэбна-выхаваўчай рабоце аддзела быў пакладзены прынцып пабудовы традыцыйнага беларускага календара, і бягучасць кожнага навучальнага года пападпарадкоўвалася яго цыклічнай зменлівасці. Менавіта народна-каляндарны прынцып арганізацыі вучэбна-выхаваўчай дзейнасці быў пакладзены ў выбудову *мадэлі этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі* яго распрацоўшчыкамі В.В.Калацэем і Т.А. Пладуновай [4, 14-17]. Паводле гэтай народна-каляндарнай канцэпцыі аддзелам быў распачаты рэспубліканскі ***фестывальны праект*** дзіцячых і маладзёжных фальклорных калектываў “Па святах “Сонечнага крыжа”. У рамках праекта “Па святах “Сонечнага крыжа” у 2002 годдзе прайшло рэспубліканскае свята “Купалле”, “Гуканне вясны на Нарачы” (НДАЛ “Зубраня”), у 2005 - “Калядны фэст”, а ў 2008 і 2010 гадах – фестываль-конкурс “Веснавы танок”.

Пошук форм і метадаў ўключэння дзяцей і моладзі ў святочна-абрадавую цыклічнасць традыцыйнай культуры працягваецца і зараз ва ўстановах культуры і адукацыі краіны. Гэта і святы, якія праводзяць кафедры этналогіі і фальклору, рэжысуры абрадаў і свят БДУКіМ, і рэгулярныя абрадавыя святы, якія на працягу каляндарнага года ладзяць супрацоўнікуі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Белдзяржмузея народнай архітэктуры і побыту, і шмат іншых установ. Фестывальны праект “Па святах “Сонечнага крыжа” НЦМТДМ быў удалым вопытам папулярызацыі ключавых каляндарана-абрадавых свят як асновы духоўнай еднасці грамадзян Беларусі. У рамках яго каляндарнай канцэпцыі нарадзіўся першы ў Беларусі інавацыйны праект Этнадыскатэк у горадзе.

**Феномен этнадыскатэк мяжы ХХ-ХХІ стагоддзяў.**

Традыцыя вечарынак, пасядзелак, ігрышч мае ў Беларусі сваю вялікую гісторыю, але працяг яе адбываецца і сёння, у ХХІ стагоддзі. Своеасаблівая “танцавальная рэвалюцыя”, якая адбылася ў Мінску с канца ХХ стагоддзя вельмі красамоўна засведчыла, што рэкрэацыйная практыка на аснове народных традыцый запатрабавана гараджанамі і нясе свой рэфлексійны патэнцыял ва ўрбанізаваных асяродках іншых гарадоў Беларусі.

Напрыканцы 1990-х гг. вечарыны традыцыйнага побытавага танца на Міншчыне практыкавалі адразу некалькі асяродкаў. Гэта фальклорны клуб Беларускай акадэміі мастацтваў «Маладзёвы» (кіраўнік Ірына Мазюк), грамадскае аб’яднанне «Зялёны крыж» (каардынатар Наталля Святкіна, адказны за дзейнасць ў галіне традыцыйнай культуры – Аляксей Галіч), Студэнцкае этнаграфічнае таварыства (старшыня Аляксей Глушко), Міханавіцкі Дом фальклору (дырэктар у той час Ларыса Рыжкова), аддзел фальклору і народных рамёстваў установы адукацыі «Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі» Міністэрства адукацыі Беларусі (загадчык у той час Вячаслаў Калацэй, метадыст па этнакультурным выхаванні Таццяна Пладунова).

У 1990-х завдатар гэтай “танцавальнай рэвалюцыі”, этнахарэограф Мікола Козенка непасрэдна знаёміў з побытавым танцам на сваіх семінарах (прысвечаных падрыхтоўцы рэгіёнаў да рэспубліканскіх фальклорных фестываляў) Ірыну Мазюк, Аляксея Галіча, Вячаслава Калацэя, Таццяну Пладунову, Любоў Сівураву. Яны, у сваю чаргу, перадавалі атрыманыя веды і набытыя навыкі асобным прадстаўнікам мінскай моладзі (якая цікавілася

этнаграфіяй, фальклорным мастацтвам, дударскпай і смыковай музыкай Беларусі), актывістам СЭТ і іншых грамадскіх аб’яднанняў. Як чалавек, які ніколі не лічыўся з уласным часам, калі справа тычылася фальклору, Козенка неаднаразова даваў майстар-класы на грамадскіх пачатках для студэнтаў фальkклуба «Маладзёвы», для асобных творчых калектываў аддзела фальклору і народных рамёстваў НЦМТДМ. Яго асветніцкая і кансультатыўная дзейнасць харэографа-практыка значна пашырала аўдыторыю спажыўцоў і транслятараў мастацтва побытавага танца Беларусі ў гарадскіх умовах, паўплывала на характар і рэпертуарную складовую творчасці шэрагу маладзёжных творчых калектываў Мінску.

Актыўная дзейнасць «ініцыяваных» Козенкам у 1990-х лідэраў вышэйпералічаных этнаграфічна арыентаваных суполак Беларусі напрамкі і ўскосна стварыла ўмовы, якія прывялі да сітуацыі, калі ў 2001 – 2010 гадах побытавы танец нечакана прадстаўніча (да некалькіх дзесяткаў, а часам, і звыш сотні танцавальных пар на кожнай імпрэзе) з’явіўся ў мінскіх дыскаклубах, на пленэрных танцавальных вечарынах сталічнай моладзі, на сустрэчах блогераў і актывістаў інтэрнэт-суполак, распрацоўваючых у працэсе ўласнай камунікацыі этнаграфічную тэматыку. Першая клубная танцавальная вечарына з дударскай музыкай (хэпенінг «Па-ва-да» гурта «Ветах» 28.03.2001г. у «Тунэлі») паклала пачатак праекту «Па Крывіі без баяна», які «ветахаўцы» з аднадумцамі доўжаць на розных клубных і канцэртных пляцоўках Мінку дагэтуль. Трэба адзначыць, што пасля наведвання чарговага ветахаўскага хэпенінгу 2002 г. у «Тунэлі» Зміцерам Сасноўскім, тут адбыўся адзін з першых клубных канцэртаў «Старога Ольсы» (своеасаблівага «авангарда» музыкаў мінскіх суполак гістарычнай рэканструкцыі), які пазней падоўжыў «клубны» вектар танцавальнай рэвалюцыі ў «Рэактары» сваімі «сярэднявечнымі дыскатэкамі». Развіваюць з 2008 г. «клубны» вектар і арганізатары танцавальных вечарын у кафэ «Жар-птушка», начале з актыўным удзельнікам фальклорнага руху Беларусі 1980-х

Іллём Арыставым, якія напачатку «нулевых» таксама наведвалі імпрэзы «Ветаха». Канцэптуальна вытокі гэтай з'явы можна шукаць у спантанных святах суполак 1970 – 1980-х «Майстроўня» і «Талака» і ветахаўскіх пленэрных імпрэзах «Юр'я» 24.04.2006, «Зялёныя святкі» 30.04.2007 ў мінскім парку Горкага. Класічную форму «пленэрнага» вектару танцавальнай рэвалюцыі яны набылі ў т.зв. «Карчы» ля Нацыянальнай бібліятэкі, які наладжваюць з 2007г. дудары гуртоў «Ліцьвінскі хмель», «Кудзьмень», «Тэстаментум Тэрра», «Кашлаты Вох», «Келіх кола».

Знаёмства з этнічным танцам у 1990-х выклікала ў XXI стагоддзі з боку крэатыўнай мінскай моладзі эксперыментальныя творчыя знаходкі, узбагаціла рэпертуарныя спісы маладзёжных гуртоў. Беларускія побытавыя танцы з'явіліся на выступах і хэпенінгах, у канцэртных праграмах, на аўдыё- і відэазапісах творчых калектывах розных жанраў (фальклор, постфальклор, медыеваль, фольк-рок і альтэрнатыўная музыка). Сёння пост-фальклорную танцавальную пляцоўку запаўняюць шматлікія творчыя праекты гарадскія і раённыя, а самыя значныя з іх – фестывалі традыцыйнага танца "Мяцеліца" і "Ветразь" праходзяць апошнія тры гады ў Мінску.

Калі прааналізаваць рэпертуар беларускіх танцаў, прадстаўленых на CD і DVD маладых сталічных калектываў 2001-2010 гг., заўважна, што збольшага ён «круціцца» вакол узораў, адабраных Міколам Козенкам для майстар-класаў, наладжаных ім у свой час у мэтах падрыхтоўкі да Рэспубліканскіх фестываляў фальклорнага мастацтва «Берагіня» і папулярызацыі танцавальнай культуры Беларусі ў маладзёжных асяродках. Найбольш часта ён развучваў такія танцы, як «Кракавяк», «Базар», «Падэспан», «Верабей», «Картузэ», «Грачанікі», «Лявоніха», «Вянгерка», «Полька-бабачка», «Субота». Да акампанементу ў час гэтых імпрэзаў ён запрашаў пачынаючых у сярэдзіне 1990-х выканаўцаў на дудзе (беларускай валынке) Алеся Журу (для вечарын клуба «Маладзёвы»), Вячаслава Калацэя (для трэнінгаў калектываў аддзела фальклору НЦТДМ), што прываблівала да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

імпрэзаў шмат моладзі. Культуртрэгерскія намаганні Міколы Козенкі прывялі да азнаямлення значнай часткі «гадаванай на асфальце» моладзі з уласнай этнічнай спадчынай, фарміравання ў яе пачуцця павагі і гонару за культуру ўласнага народа. Трэба адзначыць яшчэ адну перамогу Міколы Козенкі па «злучэнні» ўрбанізаванай моладзі з харэаграфічнай традыцыей. Ведаючы каласальны «ініцыяльны» патэнцыял аўтэнтычных форм фальклору, ён настойліва імкнуўся наладзіць непасрэдны (не завочны) кантакт носьбітаў з пераемнікамі. З сярэдзіны 1990-х ён сістэматычна запрашаў на рэгіянальныя фестывалі з удзелам носьбітаў актывістаў постфальклорных суполак. Моладзь слухала і назірала, часам спявала, танчыла і іграла з аўтэнтычнымі выканаўцамі. Козенка неаднаразова падкрэсліваў, што аўтэнтычны фальклор нашага народа – з'ява найвышэйшага мастацкага парадку, з уласным дасканалым стылем, распрацаванай вытанчанай мастацкай мовай, арыгінальнай сістэмай вобразаў і эстэтыкай. Непасрэднае знаёмства з ім запраграмавала становішча, пры якім выступы шэрагу мінскіх калектываў («Ветах», «Кудзьмень», «Гуда») сёння з'яўляюцца неблагім працягам традыцыі «на асфальце», а не бездапаможнай пародыей на беларускую музыку, што, на жаль, характэрна для многіх філарманічных і аматарскіх калектываў дагэтуль.

Напрыканцы варта зазначыць, што за два апошнія дзесяцігоддзі тымі, хто прапагандуе ва ўрбаністычных асяродках гістарычна і этнаэкалагічна апрабаваныя тыпы баўлення часу з арсеналу беларускай культуры – традыцыйны побытавы танец, перыядычныя, падпарадкаваныя традыцыйнаму календару святочныя сустрэчы з народнай танцавальнай культурай – былі дасягнуты наступныя пазіцыі:

1. Сярод мінскіх ўстаноў, што займаюцца педагагічнай і выхаваўчай дзейнасцю, суполак актывістаў грамадскага руху, створаны адносна новыя формы прапаганды традыцыйных для Беларусі формаў баўлення часу ў гарадскіх умовах: святочныя постфальклорныя канцэрты-хэпенінгі ў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыска-клубе (своеасаблівым аналаге традыцыйнай *карчмы*), пленэрныя танцавальныя імпрэзы з маладзёжнай аўдыторыяй.

2. Дзейнасць патэнцыяльна скіраваных на творчасць у галіне народага мастацтва і краязнаўства Беларусі прадстаўнікоў новай генерацыі крэатыўнай моладзі атрымала якасны штуршок, які, пры жаданні, магчыма расцэньваць як адаптаваную перадачу пасіянарнай напружанасці ад удзельнікаў грамадскіх суполак 1970-80-х «Майстроўня», «Талака» да моладзі XXI стагоддзя.
3. Энтузіясты, што сёння мэтанакіравана працуюць ў галіне этнакультурнага выхавання, атрымалі магчымасць даведацца пра дзейнасць сваіх аднадумцаў, якія актыўна выкарыстоўваюць найбольш патэнцыяльна моцныя, прывабныя для ўрбанізаванай моладзі бакі традыцыйнай беларускай культуры: траістую дударскую музыку (дуда, скрыпка, бубен), традыцыйныя гульні і побытавы танец.
4. Колькасць прыцягнутых да азнаямлення з побытавым танцам маладых гараджан у XXI стагоддзі ідзе на сотні і тысячы, што (пры параўнанні з адзінкамі 1980 – 1990-х) дазваляе весці гаворку пра сапраўдную «танцавальную рэвалюцыю» ў Мінску «нулевых».

У Беларусі вартыя ўвагі наступныя дзяржаўныя этнакультурныя праекты, скіраваныя на захаванне і развіццё народных мастацкіх традыцый у сістэме адукацыі і культуры. У канцы 90-х гадоў XX стагоддзя быў распачаты рэспубліканскі эксперыментальны праект “Танцавальны фальклор і дзеці”, распрацаваны лабараторыяй традыцыйнай беларускай культуры Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры (аўтар і кіраўнік праекта М.А.Козенка), у які ўключыліся аддзелы культуры і адукацыі тады амаль дваццаці раёнаў краіны.

Канцэптуальная ідэя праекта – эстэтычнае выхаванне дзяцей і моладзі сродкамі аўтэнтычнага мастацтва, уводзіны ў якое дзеці атрымліваюць праз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музыку і рух – абрадавы і побытавы танец. Менавіта ад традыцыйнага танца М.А. Козенкам была спраектавана мадэль уключэння дзяцей і моладзі ў шматсастаўны комплекс фальклорнага мастацтва. Праз танец у навучэнцаў фарміруецца патрэба самавыражэння і ў музыцы, у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. У пошуку сінтэза музычна-пластычнага мастацтва і сумежных відаў народнай творчасці калектывы і іх удзельнікі развіваюцца і дасканаляцца ў засваенні каляндарна-абрадавых традыцый, вакальнай і інструментальнай этнафоніі, вусна-паэтычнай спадчыны свайго краю, у даследчай дзейнасці па краязнаўству і этнаграфіі. З 1999 года гэты праект набыў больш высокі статус - “Традыцыная культура і дзеці” - адпаведна маштабнасці ахопленых ім відаў фальклорнага мастацтва. Вынікі ўключаных у яго дзіцячых і маладзёжных калектываў адсочваюцца на раённых аглядах-конкурсах і на рэспубліканскім фестывалі фальклорнага мастацтва “Берагіня”.

Напрацаваны вопыт у галіне этнакультурнага выхавання ў сістэме адукацыі таксама заслугоўвае увагі педагогаў і работнікаў культуры. Пачынаючы з 1997 года аддзел фальклору Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі праводзіў шэраг этнакультурных мерапрыемстваў канцэптуальнага зместу, што выбудавалася ў пэўную сістэму выхавання на падмурку традыцыйнай беларускай культуры. Гэта мастацкія праектыпа папулярызацыіі беларускага фальклору сярод навучэнскай моладзіі метадычныя мерапрыемствы па іх аналітычным абагульненні[5].У змястоўную

[5] Праекты “Па Крывіі без баяна” (танцавальна-гульнёвыя вечарыны для дзяцей і моладзі ў дыска-клубах г. Мінска); “Па святах “Сонечнага крыжа” (адпраўленнеу натуральных умовах бытавання асноўных каляндарна-абрадавых свят цыклаў “Вясна” – “Лета” – “Восень” – “Зіма”);“Фальклорны летнік” (фальклорныя “вучэнні” і адпачынак рэгіянальных дзіцячых гуртоў у НДАЛ “Зубраня”). Рэспубліканскія метадычныя мерапрыемствы: майстар-класы па розных відах традыцыйнага мастацтва (па традыцыйнаму побытаваму танцу, інструментальнай і вакальнай этнафоніі, правядзенні каляндарна-абрадавых свят, інш.);“круглыя сталы” па шэрагу этнапедагагічных праблем (арганізацыі вучэбна-выхаваўчай дзейнасці і адпачынку дзяцей-“фалькларыстаў”, рэпертуарнай палітыцы гурта на рэгіянальнай дакументальнай аснове, мастацкаму вырашэнню касцюма і атрыбутыкі, традыцыям і інавацыям выканальніцтва) [4, 55-58].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аснову гадавога плана па вучэбна-выхаваўчай рабоце аддзела быў пакладзены прынцып пабудовы традыцыйнага беларускага календара, і бягучасць кожнага навучальнага года пападпарадкоўвалася яго цыклічнай зменлівасці. Менавіта народна-каляндарны прынцып арганізацыі вучэбна-выхаваўчай дзейнасці быў пакладзены ўвыбудову *мадэлі этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі*[6] яго распрацоўшчыкамі В.В.Калацэем і Т.А. Пладуновай.Паводле гэтай народна-каляндарнай канцэпцыі аддзелам быў распачаты рэспубліканскі фестывальны праект дзіцячых і маладзёжных фальклорных калектываў "Па святах "Сонечнага крыжа"[7].

З 2006 года вопыт працы аддзела фальклору НЦМТДМ, праекта "Традыцыйная культура і дзеці" акумуліруе кафедра этналогіі і фальклору БДУ культуры і мастацтваў праз дзейнасць рэспублінаскай сезоннай фальклорнай школы (2006-2010 гады) і штогадовую навукова-практычную канферэнцыю "Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання і пераймання" (з 2007 года).

У кантэксце выбудовы сістэмы народнай адукацыі падаецца значным эксперыментальны праект "Этнашкола", які быў распрацаваны прафесарам БДУ культуры і мастацтваў І.І. Сучковым у 90-я гады ХХ стагоддзя і ахапіў шэраг гарадскіх і вясковых сярэднеадукацыйных школ усіх рэгіёнаў Беларусі. Распрацаваныя вучэбныя праграмы па розных фальклорных дысцыплінах былі разлічаны на дзесяць гадоў навучання і мелі значны вынік у набыцці сучаснымі школьнікамі ведаў па традыцыйнай культуры і развіцці творчых здольнасцей на яе аснове. Нават пасля заканчэння праекта вопыт

---

[6]Э т н а к у л ь т у р н а е  в ы х а в а н н е – духоўнае ўдасканаленне асобы шляхам развіцця творчых здольнасцей дзіцяці сродкамі этнічнага мастацтва . Яго сутнасць магчыма акрэсліць як мэтанакіраваную дзейнасць, у выніку якой навучэнец мае магчымасць далучыцца да форм паводзін і мыслення, якія дазваляюць яму не толькі аўтаматычна ўвайсці ў соцыум, але і самаўсведамляць, недвухсэнсоўна адчуць уласную прыналежнасць да пэўнага этнасу.

[7]У рамках праекта "Па святах "Сонечнага крыжа" у2002 годдзе прайшло рэспубліканскае свята "Купалле", "Гуканне вясны на Нарачы" (НДАЛ "Зубраня"), у 2005 - "Калядны фэст", а ў 2008 і 2010 гадах – фестываль-конкурс "Веснавы танок".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

працы этнашкол застаецца актуальным і перспектыўным ў галіне этнакультурнага і эстэтычнага выхавання.

У сістэме мастацкай адукацыі варты ўвагі вопыт Стайскай школы традыцыйнага мастацтва Лепельскага раёна Віцебскай вобласці, у якой навучанне ўсім яго відам адбываецца на мясцовым фальклорным матэрыяле. Каля дзвухсот вучняў засвойваюць народныя песні, гульні, танцы, традыцыі адзення і гаспадаркі рэгіёну і здольны выкарыстоўваць набытыя “фальклорныя” веды і ўменні ў сваім уласным творчым жыцці, падлеткавым асяроддзі і сямейным побыце, што непазбежна вядзе да фарміравання этнічнай свядомасці маладых лепельчан, пераемнасці роднай культуры ў пакаленнях.

## Раздзел ІІ. Мастацкая рэканструкцыя каляндарных, сямейна-родавых абрадаў і пазаабрадавыхпобытавых практык

### 8. Праблемы бытавання і рэканструявання традыцыйных абрадаў іпазаабрадавых побытавых практык на сучасным этапе

Пытанні

1. Сучасны стан аўтэнтычных абрадавых традыцый на Беларусі
2. Мастацкая рэканструкцыя абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык
3. Асноўныя прынцыпы і этапы мастацкай рэканструкцыі абрада

Літаратура па тэме:


1. Алексеев Э.Е Фольклор в контексте современной культуры. Рассуждения о судьбах народной песни. – М., ”Сов. композитор”, 1988 г.
2. Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. – Мн.: Полымя, 1996. – 270 с.: іл.
3. Кавалёва Р.М., Пладунова Т.А.Беларуская каляндарная абраднасць: рэтраспектыва, сучаснасць, праблемы захавання, аднаўленя, рэканструкцыі // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў: матэрыялы Міжнароднай


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навукова-практычнай канферэнцыі; 10-11 лістапада 2011 г., г. Мінск/гал. рэд. А.І.Лакотка; Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы Нацыянальнай акадэміі навукБеларусі. – Мінск: Права і эканоміка, 2011. – 398с. – С.260-264.

4. Конан У. Праблемы адраджэння традыцыйнай народнай культуры //Традыцыйная культура і дзеці: праблемы этнавыхавання. Вып.2. Матэрыялы ІІІ Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі (19-20 крас. 2006 г., г.п. Акцябрскі) / аўт. праекта і ўклад. М.А.Козенка. – Мн.: БелДІПК, 2006. – С. 6-10.

5. Купальскі спеўнік: метадычны дапаможнік // аўтар-укл. Т.А.Пладунова. – Мінск: Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 160 с. : іл.

6. Матыліцкая, Н.В. Вопыт музейнай рэкрэацыі на аснове традыцыйных каляндарных свят 1998 – 2001 гг. / Н.В. Матыліцкая // Штудыі рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы. – Мінск: БДУКіМ, 2007. – С. 59 – 61.

7. Т. Пладунова. Рухомы фэст "Па святах "Сонечнага крыжа": сацыяльны запыт і канцэпцыя // Штудыі Рэспубліканскай сезоннай фальклорнай школы/ укладальнік В.В.Калацэй. – Мн.: БДУ культуры і мастацтваў, 2007. – С. 22-26.

8. Пладунова Т. Засваенне і актуалізацыя каляндарна-абрадавых традыцый у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы// Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, пераймання: зборнік навуковых прац удзельнікаў IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 29-30 красавіка 2010 г.) / БДУКМ; рэдкал.: Мажэйка М.А. (адк. Рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2010. – 168 с. – С. 126-129

9. Пладунова Т.А. Мастацкая рэканструкцыя этнафоніі Купалля на святах і фестывалях//Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зборнік навуковых прац удзельнікаў VIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 25-27 красавіка 2014 г.) / БДУКМ ; рэдкал.:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Языковіч В.Р. (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУКМ, 2014. – 216 с. – С. 168-170..
10. Якімовіч В. “А йшла Купалка сялом.,сялом”. Князь – Купаліш і Купалінка.// Роднае слова – 1998 г. - № 6 .

Згодна з канцэпцыяй вядомага амерыканскага філосафа Элвіна Тофлера , свет фарміруецца своеасаблівымі хвалямі сацыяльнага развіцця. У сваёй кнізе “ Трэцяя хваля” ( 1980), ён адзначае, што сельскагаспадарчая рэвалюцыя, якая здарылася дзесяць тысяч гадоў таму назад, запусціла Першую хвалю змяненняў чалавечай гісторыі, прамысловая рэвалюцыя трохсотгадоўнасці дала Другую хвалю, а сёння мы зазнаем уздзеянне Трэцяй хвалі перамен. Кожная хваля несла з сабою новы від цывілізацыі”. Не будзем паглыбляцца ў нетры тэрміналогіі або параўнальнага аналізу канцэпцыі Э. Тофлера, а прымем да ведама яго вытворчую сімволіку: цывілізацыю Першай хвалі, на яго думку сімвалізуе матыга, Другой – зборачная лінія, Трэцяй – камп’ютар.

Каляндарная абраднасць з’яўляецца часткай класа абрадавых і генетычна належаць першай хвалі цывілізацыі. Яна ўласцівы не толькі славянам, і не толькі індаеўрапейцам, а самым розным народам – земляробам. Хваля сельскагаспадарчай цывілізацыі была самамй працяглай і шырокамасштабнай. Далёка не апошняе месца ў яе культуры займала аграрная магія. Паўсюдна ўзнікалі, развіваліся, прыходзілі ў заняпад або адраджаліся на старой эканамічнай аснове культуры, якія, нягледзячы на значныя адрозненні, тым не меньш мелі агульныя рысы. Лад жыцця ў Кітаі, Індыі, Мексіцы, Еўропе – у грэкаў і рымлян, германскіх і славянскіх плямёнаў, а пазней і ў беларусаў, быў абумоўлены працай на зямлі. Месца чалавека ў соцыуме вызначалася яго паходжаннем. Як ні дзіўна, але ў старажытнм Кітаі фігурай нумар1 лічыўся менавіта селянін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Кожная сялянская абшчына паасобку выконвала разнастайныя абрады ўрадлівасці. Важнай часткай абрадаў былі спевы, якія лічыліся сродкам сувязі з вышэйшымі сіламі і надавалі вербальна-музычную форму рытуальнаму зместу абрада. Ядро спеваў у беларусаў, як і ў іншых славянаў, складалі песні. Каляндарна-абрадавыя песні шчыльна звязаны з тым ці іншым абрадам – зімовым, веснавым, летнім, восеньскім, прычым не толькі функцыянальна, але і змястоўна. Дадзены тэзіс тычыцца двух тыпаў песень – рытуальна маркіраванных і тых, чыя цвёрдая рытуальная структура прыхавана пачуцёва-вобразнай абалонкай. Часам іх не зусім карэктна адносяць да прымеркаванных, або класіфікуюць як абрадавыя лірычныя.

Пазначаныя тыпы твораў заставаліся ў межах абрадаў нават тады, калі тыя страчвалі свой сэнс, пераходзілі ў звычай, часам дакладна захоўваючы былую форму, прыкладам, абходную, і ключавыя атрыбутыйныя знакі.

Цывілізацыя Другой хвалі стварыла новы вобраз рэальнасці. З аграрнымі паселішчамі і палеткамі сталі суседнічаць гарады з прамысловасцю, а не проста з рамесніцтвам. Усіх па-ранейшаму карміла зямля, у вёсках па традыцыі выконваліся ранейшыя абрады, гучалі песні, кампазіцыйнай часткай якіх заставалася закліканне ўраджаю і прыплоду свойскай жывёлы.

Напачатку 21 ст. сумесь Першай, Другой і Трэцяй хваляў цывілізацыі ва ўмовах глабалізацыйных працэсаў стварае своеасаблівы культурны кантэкст з вылучэннем у ім нацыянальнага вектара і павышанай увагі да традыцыйнай нематэрыяльнай культуры як дасканалага эстэтычнага ўзору.

У беларускім вясковым асяродку традыцыя каляндарнай абраднасці, сапраўднага дыяменту духоўнасці і мастацкай прыгажосці, працягвае існаваць у дзьвюхформах – актыўнай і пасіўнай, адсюль актуальнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

збіральніцкай дзейнасці фалькларыстаў розных кірункаў. Пад актыўнай формай мы разумеем, штогод узнаўляемую традыцыю бытавання каляндарных свят і абрадаў. Яскравы прыклад – абрад ваджэння і пахаванне "Стралы" на Гомельшчынне. Яго сучасны стан прадстаўлены ў кнізе В. С. Новак " Абраднасць і паэзія " Пахаванне стралы"" ( Гомель, 2002г.).

Пры пасіўнай форме абраднасць захоўваецца ў памяці выканаўцаў як гісторыя. Часам яна вяртаецца да жыцця ва ўзноўленнай форме, дзякуючы мясцовым энтузіястам, разумнай рэгіянальнай культурна-асветніцкай палітыцы, скіраванай на падтрымку аўтэнтычнага фальклору, несапсаванага культуртрэгерамі з боку. Так, напрыклад, адбылося з абрадам ваджэння Маі ў Лельчыцкім р-не Гомельскай вобласці. Пасля знікнення ён аднавіўся да жыцця, дзякуючы гурту жанчын з вёскі Новае Палессе на падставе сведчання трох інфармантаў, апошніх, хто памятаў пра абрад і ведаў галоўную майскую песню.

Прыклады аднаўлення (рэвіталізацыі) абрадавых свят заўважны ў асобных раёнах. У Любанскім раёне дзіцячыя фальклорныя гурты і іх педагогі падтрымоіваюць жывую традыцыю свят "Юр'я" і "Русальная нядзелька", у вёсцы Маркавічы Гомельскага раёна – "Ваджэння Сулы", у вёсках Казацкія Балсуны, Стаўбун, Неглюбка – "Пахавання стралы", у вёсцы Семежава Капыльскага раёна – "Калядныя цары". Аднак варта разгледзіць у якоіх формах адбываецца гэта аднаўленне.

**Рэстаўрацыя** (ад лац. *restauratuo*) **-** узнауленне ранейшага першапачатковага зместу або формы частак традыцыйнай абрадавай дзеі на аснове захаваўшагася вуснапаэтычнага, музычнага, песеннага, харэаграфічнага матэрыялу.

**Рэканструкцыя** (ад лац. *re нанава + construction = пабудова*) **-** форма карэннай перабудовы, адраджэння абрадава-рытуальнага комплексу на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аснове рэшткаў захаваўшыхся фальклорных матэрыялаў і этнаграфічнага апісання.

**Трансфармацыя** (ад лац. *transformatio*) **-** пераўтварэнне традыцыйнай формы, зместу, вербальных схем, мастацка-вобразных асаблівасцей, элементаў карнавалізацыі і маскіравання абраду. Гэту форму ўвасаблення фальклору магчыма разумець як **стылізацыю,** дзе аўтарскае прачытанне (хормайстрам, харэографам, рэжысёрам, мастаком) яго відаў і жанраў галоўнае, і аўтэнтычны дакумент служыць асновай для творчага самавыражэння яго інтэрпрэтатараў.

Мастацкая рэканструкцыя абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык як сучасна адаптаванае узнаўленне традыцыйных дзей на рэгіянальнай дакументальнай аснове, с захаваннем іх драматургічнай асновы, вербальных, этнафанічных, пластычных і драматычных кампанентаў актуальна і сёння.

Распрацоўцы тэарэтычных падыходаў да рэканструкцыі традыцыйных абрадаў, пошуку шляхоў і сродкаў пераймання і адэкватнай іх прэзентацыі прысвечана праца шматлікіх педагогаў і аматараў, клубных устаноў Беларусі, вой навукова-творчы накірунак прапаноўвае кафедра этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

- Асноўныя прынцыпы мастацкай рэканструкцыі абрада:
  – дакладнасць увасаблення абраду,
  – вуснасць пераймання ўсіх яго кампанентаў,
  – актуальнасць функцыянальнага зместу абраду ў сацыяльна-культурным і эстэтычным запатрабаванні грамадства.
- Этапы мастацкай рэканструкцыі абрада:
  – складанне абрадавай карты сістэматызацыі кодаў абраду (святочнай дзеі),
  – сцэнарнае практаванне на яе аснове,
  – рэжысёрскі аналіз і мізансцэніраванне абрадавай дзеі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– фарміраванне фанатэкі і рэпертуарнага зборніка да сцэнарыя,
– рэпетыцыйная і пастановачная работа з гуртом-ілюстратарам абрадавай дзеі па яе ўвасабленні.

**Першы прынцып**: дакладнасць увасаблення абраду.

Галоўная мэта – наблізіць рэканструкцыю да аўтэнтычнага ўзору, поўна і сістэмна ўвасобіць у ёй усе вядомыя аўтару аўтэнтычныя характарыстыкі і асаблівасці. Праца павінна быць накіравана на ўвасабленне абраду ва аўтэнтычнай форме, а не на яго стылізацыю. Гэты прынцып з'яўляецца самым галоўным, таму што вельмі важна дасканала перадаць усе асноўныя кампаненты абраду:

– час (адпаведна абраду);
– месца правядзення абраду (у нашым выпадку – хата маладой);
– паслядоўнасць абрадавых дзеянняў (абрад – гэта адзінае цэлае. Нельга мяняць месцамі адпаведныя дзеянні, а тым больш выразаць іх зусім);
– кола ўдзельнікаў (нельга ўводзіць новыя персанажы);
– наяўнасць дыялогаў, заклікаў, замоў у абрадзе (перадача мясцовай гаворкі);
– выкарыстанне абрадавых атрыбутаў, адзення;
– тыпавыя напевы з адмысловымі этнафанічнымі прыкметамі і гукаідэал інструментальнай этнафоніі (брэсцкая манера выканання).

**Другі прынцып**: вуснасць пераймання ўсіх яго кампанентаў: песні, тэксты песень, дыялогі, мясцовы дыялект і г. д.

Тут актыўна ўжываецца метад імітацыі («як чую, бачу, так і ўвасабляю»). Шлях імітацыі – перайманне (з аўдыё- і відэазапісаў).

**Трэці прынцып**: адлюстраванне зместу абраду, яго функцыянальнай накіраванасці і семантыкі (канцэнтрацыя ўвагі рэканструктара на самых важных функцыях абраду і іх эмацыйным змесце). Вельмі важна данесці да недасведчанага гледача ўсю цікавасць і важнасць абраду.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, падсумоўваючы вопыт у галіне рэканструкцыі традыцыйнай абраднасці, мы вызначаем, што пад тэрмінам «рэканструкцыя» ў навукова-даследчай рабоце разумеецца вывучэнне і практычнае ўвасабленне абрадавага дзеяння ва ўсіх яго асноўных этапах, з захаваннем вербальных і спеўных кампанентаў, выкананнем асноўных роляў удзельнікаў абраду.

Тэрмін «сцэнарый» трактуецца як пісьмовы выклад напрацаванага аўтарам рэканструкцыі матэрыялу, дакументальная аснова пастаноўкі абраду. Сцэнарый адлюстроўвае вылучэнне галоўных этапаў і прадстаўленне этнафанічнага матэрыялу. Мова абрадавых тэкстаў перадаецца з захаваннем дыялектных асаблівасцей.

## 13. Традыцыі бытавання і перспектывы мастацкага рэканструявання сямейна-родавых абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык

Пытанні

1. Абрадавыя і побытавыя традыцыі сямейна-родавага цыклу як эмацыйна збалансаваная сістэма жыццядзейнасці соцыума.
2. Перспектывы мастацкага рэканструявання сямейна-родавых абрадаў і пазаабрадавых побытавых практык
3. Узоры адаптацыі сямейных свят і побытавых практык у сучаснае мастацкае жыццё грамадства

Літаратура па тэме:


1. Вяселле: абрад / уклад., уступ. арт. і камент. К.А. Цвіркі; муз. дадат. З.Я. Мажэйка; рэд. тома В.К. Бандарчык, А.С. Фядосік. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 2-е выд. – 683 с.
2. Вяселле: песні: у 6 кн. / склад. Л.А. Малаш; муз. дадат. З.Я. Мажэйка; рэд. М.Я. Грынбалт, А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Кухаронак Т. І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: Канец XIX – XX ст. / Т. І. Кухаронак. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. — 126 с.
4. Кухаронак, Т.І. Сямейныя абрады / Т.І. Кухаронак // Беларусы. Сям’я – Мінск : Беларус. навука, 2008. – С. 218–370.
5. Прыказкі і прымаўкі ў дзвух кнігах, кн. 1. Рэд. А. С. Фядосік. Мн., “Навука і тэхніка”, 1976
6. Прыказкі і прымаўкі ў дзвух кнігах, кн. 2. Рэд. А. С. Фядосік. Мн., “Навука і тэхніка”, 1976
7. Радзіны : Абрад. Песні / Нац. акад. навук Беларусі, Ін–т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. – Мн. : Бел. навука, 1998. – 635 с. (Беларуская народная творчасць).
8. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў: вучэб.-метад. дапам. / аўт.- склад. Т. І. Кухаронак, В. Г. Кухаронак. – Мн.: БДПУ, 2005.- 108 с.
9. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX – XX стст. / Л. В. Ракава. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 31 с.

Сямейна-абрадавая практыка як адна з традыцыйных форм арганізацыи мыслення і паводзін людзей рэгуліруе асноўныя этапы жыццёвага цыклу чалавека: нараджэнне, уступленне ў шлюб, смерць. Адлюстраванне гэтых этапаў у трох абрадавых цыклах сямейна-родавага круга: Радзінах, Вяселлі, Пахаванні.

Абрадавыя і побытавыя традыцыі сямейна-родавага цыклу выступаюць як эмацыйна збалансаваная сістэма жыццядзейнасці соцыума ў працы, абрадавых камунікацыях з наваколлем, пазаабрадавых сітуацыях ( побытавых і рэкрэацыйных).Паззабрадавыя формы жыццядзейнасці і камунікацыі выступаюць як калектыўная, сямейная і індывідуальная праца і рэкрэацыйна-святочныя зборы: працоўная талака, хатняя праца, вячоркі, попрадкі, ігрышчы, гасцяванні, танцавальна-гульнёвыя вечарынкі, бяседы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пасядзелк. Яны ў традыцыйнай супольнасці, як і абрадавыя практыкі, забясечваюць збалансаванасць быцця соцыума ў рытме з жыццёвымі цыкламі чалавека.

Даследчыкі, як правіла, падзяляюць вяселле на тры асноўныя часткі: давясельную (выгледзены, даведкі, сватанне, запоіны, агледзіны, заручыны), уласна вясельную (суборная субота, запросіны, каравай, вясельнае дрэва, пасад, прыезд дружыны маладога да маладой, выпраўленне маладых да шлюбу, вясельнае застолле, вясельныя музыканты, шлюб, пераезд да маладога, камора, пасаг, завіванне, выпрабаванне здольнасцей і характару маладой, падзел каравая, дарэнне маладым) і паслявясельную («цыганы», пярэзвы).

Канешне, радзіны нельга параўнаць з вяселлем па багацці і выразнасці абрадавых дзеянняў і сымвалаў. Аднак яны таксама прадстаўлялі сабой стройны рытуал, які быў насычаны разнастайнымі магічнымі і увесялялынымі дзеяннямі і прыёмамі.

Вялікае значэнне на радзінах меў абмен падарункамі. З ім было звязана вельмі цікавае абрадавае дзеянне, якое выконвала баба-павітуха. Так, атрымаўшы падарунак, яна станавілася на ўслон і, прыгаворваючы разнастайныя пажаданні нованароджанаму, тры разы перакручвалася, а затым саскаквала з яго. Абрад гэты быў вядомы ў пауночна-ўсходніх і цэнтральных раёнах Беларусі ў сярэдзіне і канцы XIX ст. На Міншчыне павітуха выконвала абрад ачышчэння усіх прысутных на хрэсьбінах, заклікаsuccessive паўплываць на здароўе і дабрабыт гасцей. Спарадычна на тэрыторыі Беларусі ў час хрэсьбін адбываўся і абрад ачышчэння парадзіхі і павітухі.

Для традыцыйнай радзіннай абраднасці беларускага народа, таксама як і для вясельнай, было характэрна арганічнае ўключэнне ў ход дзеяння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абрадавых песень.Пераапрананне ж толькі зрэдку сустракалася на радзінах («бусел», «дзед», «баба», «задзеланыя»).

Кульмінацыйным момантам на хрэсьбінах быў падзел спецыяльнай абрадавай стравы — «**бабінай кашы**» (грэчневая, аўсяная, ячменная, прасяная каша, яечня, разнастайныя вырабы з мукі).

У паўднёва-усходніх, цэнтральных і некаторых заходніх раёнах адбываўся абрад разбівання гаршка з кашай, з якім у народнай свядомасці звязваліся шматлікія ўяўленні магічнага характару. Абрад быў насычаны разнастайнымі жартоўнымі дыялогамі, імправізаванымі сцэнамі. Госці, атрымаўшы кавалачак «бабінай кашы», выказвалі разнастайныя пажаданні для дзіцяці.

У паўночна-заходніх раёнах за абрадавую страву — яечню — госці кідалі грошы ў талерку або калыску дзіцяці. У заходнім Палессі гаршчок з кашай не разбівалі, падзел абрадавай стравы адбываўся вельмі проста і сціпла. Падзел «бабінай кашы» азначаў канец урачыстасці, і госці пачыналі разыходзіцца па хатах, неслі па кавалачку стравы дзецям, у якіх яна лічылася вялікім ласункам, як і «хлеб ад зайца».

Трэба адзначыць, што дзеці прымалі самы актыўны удзел у святкаванні і таксама выконвалі пэўныя абрадавыя дзеянні.

У цэнтральных раёнах Беларусі быў спецыяльны завяршальны абрад пад назвай «**цягаць бабу на баране**». Ён выконваўся наступным чынам: госці выходзілі на двор, рыхтавалі санкі, калёсы, на якія клалі барану, засланую кажухом,. садзілі бабу і вазілі яе па вуліцы. У ранейшыя часы ў абрадзе выкарыстоўвалася толькі адна барана, накрытая кажухом.

Адлюстраванне ў музычна-паэтычным змесце радзінных песень асноўнага сэнсу сямейна-абрадавай цырымоніі – далучэння дзіцяці да родавай і сямейнай абшчыны. Асноўныя групы песень: велічальныя, лірыка-эпічныя, жартоўныя, застольныя - маюць узвышаны, велічальна-віншавальны характар выканання і адрасаваны пераважна нованароджанаму, яго бацькам і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

родным. Жартоўныя  інтанацыі характэрны для песень да бабкі-павітухі, кума і кумы.  Дынамічна стрыманы,плаўна-апавядальны, дэкламацыйны стыльінтанавання адрознівае ўсе радзінныя песні, аднак ёсць і рэгіянальныя адметнасці радзінна-хрэсьбіннага меласу:мелодыі пераважна бяседна-застольнага плана на Поўдні Беларусі, большсамастойныя па сваіх тыпах і музычным стылі напевы Віцебшчыны, Гродзеншчыны, Магілёўшчыны.

### 17. Пазаабрадавыя побытавыя практыкі сямейна-родавага цыклу

Пытанні

1. Творы фальклорнага дзяцінства
2. Танцавальна-гульнёвыя ігрышчы
3. Пазаабрадавыя і прымеркаваныя па часе і абставінах побытавыя і рэкрэацыйныя практыкі
4. Перспектывы рэвіталізацыі пазаабрадавых побытавых практык

Літаратура па тэме:


1. Гуд П. А., Гуд Н. І. Беларускі кірмаш. – Мн.: Полымя, 1996. – 270 с.: іл.
2. Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал.: А.с. Фядосік [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 1996. – 534 с.
3. Дзіцячы фальклор /Уклад. Г.А.Барташэвіч, уклад.муз.часткі В.І.Ялатаў.-Мн.:Навука і тэхніка,1972.-736с.:нот.
4. Жарты, анекдоты, гумарэскі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; склад. А. С. Фядосік; уступ. арт. А. С. Фядосіка; камент. Л. Р. Барага, А. С. Фядосіка; навук. рэд. В. К. Бандарчык. – 2-е выд., дапрац. – Мн.: Бел. навука, 2005. – 502 с. (Бнт: Беларуская народная творчасць).
5. Смирнова , И. Ю. Неглюбские молодежные вечера зимнего периода / И. Ю. Смирнова // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Гомель, 20 – 21 мая 2004 г.: у 2 ч.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– Ч. 1. – Гомель, 2004. – С. 193 – 196.
6. Талака: тэкст і кантэкст // Весці Акадэміі навук Беларусі. Серыя грамадскіх навук. 1994, № 3. / на беларускай мове/.
7. Сямейна–бытавыя песні / [Склад. І.К.Цішчанка. – Мн. : Навука і тэхніка, 1984. – 421 с. (Беларуская народная творчасць).

Творы фальклорнага дзяцінства: пацешкі, калыханкі, лічылкі, дражнілкі, гульні, каргоды, казкі - сапраўдная школа маральнага, эстэтычнага выхавання, псіхафізічнага развіцця дзіцяці і першасныя формы інкультурацыі дзіцяці.

Выбар каштоўнасных арыенціраў этнакультурнага выхавання звязаны з каштоўнасна-арыентацыйным кампанентам. Па меркаванні В. С. Бараздзіной, каштоўнасныя арыенціры, якія ляжаць у аснове этнакультурнага выхавання дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту, вызначаюць фарміраванне у *іх маральна-сэнсавай дамінанты* карціны свету, якая потым праяўляецца ў жыццядзейнасці як аднаго дзіяці, так і супольнасці дзяцей і дарослых.

Пры гэтым неабходна адзначыць, што маючае месца самавызначэнне дзіцяці ажыццяўляецца шляхам яго асобаснага выбару пэўных каштоўнасных арыенціраў і спаса- баў узаемадзеяння з сацыякультурным акружэннем. Сацыякультурная ідэнтычнасць дзіцяці спрыяе стварэнню ў яго вобраза Радзімы, які ўключаны ў цэласны вобраз усяго свету. Іншымі словамі, этнакультурнае выхаванне дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту заарыентавана на полікультурнае адукацыйнае асяроддзе.

Найбольш наглядна дадзеная думка ілюструецца сцвярджэннем К. Дз. Ушынскага, які адзначае, што у кожнага народа ёсць свая ***нацыянальная сістэма выхавання***. Вопыт іншых народаў ёсць каштоўная спадчына для ўсіх, але кожны народ ўзбагачае сваю ўласную культуру. Пры гэтым ён сам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пракладвае сабе дарогу ў будучыню. Што да выхавання, то яно ідзе па гэтай дарозе і ўздзейнічае на дзіця разам з іншымі грамадскімі сіламі.

Цэласны вобраз карціны свету, якая акружае дзіця, ўключае такія абавязковыя ***камапаненты этнакультурнага выхавання***, як валоданне роднай мовай, прытрымліванне ў жыцці традыцый продкаў. Найбольш зручным сродкам, які дазваляе ўвесці дзіця ў атмасферу жывога слова з'яўляецца вусная народная творчасць. У адпаведнасці з вызначэннем фалькларыстаў, самыя натуральныя і самыя неабходныя формы маўлення ў іх прыгожым мастацкім аздабленні з экалагічнай чысцінёй захаваліся менавіта ў фальклоры.

Слухаючы фальклорныя творы, дзіця вучыцца мове, заўважае выразныя сродкі маўлення, запамінае пастаянныя эпітэты, адчувае прыгажосць паэтычнай метафары, гучнасць рыфмаванага радка.

Эмацыянальная насычанасць фальклорных твораў мноствам выразна-выяўленчых сродкаў выклікае ў дзяцей жаданне гаварыць трапна і прыгожа. І гэта натуральна, таму што жывое народнае слова прайшло праз сапраўдную маўленчую лабараторыю, у якой нараджаліся, адпрацоўваліся і выпрабоўваліся фанетычныя, лексічныя і сінтаксічныя скарбы нацыянальнай мовы. Менавіта таму вусна-паэтычная творчасць і вызначаецца такім шырокім колам вобразнасці і мастацкай дасканаласці, увогуле з'яўляецца невычэрннай крыніцай красамоўства, што пацвярджаецца навуковымі даследаваннямі беларускіх фалькларыстаў і мовазнаўцаў А. Аксамітава, Л. Барага, Г. Барташэвіч, Н. Гілевіча, Л. Салавей, М. Янкоўскага, Ф. Янкоўскага і інш. На неабходнасць дачынення дзіцяці да фальклору, навучання роднай мове ўказвалі славутыя беларускія пісьменнікі, педагогі, грамадскія дзеячы В. Вітка, У. Ф. Луцэвіч, Я. Колас і інш.

У сваіх педагагічных артыкулах Я. Колас адзначаў, што дзецям неабходна старанна вывучаць сваю родную мову, ведаць і любіць творы беларускай літаратуры і фальклору. Пры гэтым ён падкрэсліваў, што знаёмства з родным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

словам ўзбагачае дзіця духоўна, з'яўляецца першай крыніцай, праз якую яно пазнае жыццё і акаляючы свет.

Спроба стварыць цэласную сістэму выхавання і навучання дзяцей беларускай мове сродкамі фальклору была зроблена Ул. Ф. Луцэвіч. Яна сцвярджала, што вусная творчасць з'яўляецца для дзіцяці тым чароўным светам, праз які яно пазнае лепшыя ўзоры слоўнага мастацтва.

Абавязковым лічыць уключэнне твораў мастацкай літаратуры і фальклору ў выхаванне і навучанне дзіцяці беларускі дзіцячы пісьменнік В. Вітка. Фальклорныя творы, на яго думку, дазваляюць маленькаму слухачу з найболынай сілай адчуць хараство, мілагучнасць, музыку, жывую душу мовы.

У той жа час вусная народная творчасць беларускага народа, выступаючы ў якасці універсальнай педагагічнай сістэмы, з'яўляецца першавытокам сацыяльна-культурнай самаідэнтычнасці падрастаючага чалавека, спрыяе актыўнаму пазнанню ім навакольнага свету. Праз творы вуснай паэтычнай творчасці маленькае дзіця набывае першыя веды аб нацыянальнай гісторыі і культуры, уваходзіць ў цудоўны свет мастацкіх вобразаў.

Спецыфіка дзіцячага фальклору абумоўлівае эфектыўнасць інкультурацыі: за перыяд дзяцінства чалавек асвойвае нацыянальную культуру, фармуе карціну свету, характэрную для ментальнасці свайго народа.Менавіта фальклор спрыяе закладванню ментальнага падмурку ў маленстве. У дашкольным дзяцінстве, закладзеныя ў працэсе інкультурацыі сэнсы, пачынаюць пераўтва- рацца ў асабісты жыццёвы вопыт дзіцяці.

На працягу дзяцінства жанры фальклору размяркоўваюцца па ўзростам не толькі ў адпаведнасці са ступенню педагагічнай прыдатнасці, але і ў адпаведнасці з паступовым ускладненнем закладваемых стэрэатыпаў.

Апавядальныя жанры беларускага фальклору, у якіх адлюстроўваюцца асаблівасці быту і светапогляду нашых продкаў, іх грамадскія і сямейныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адносіны, а таксама асобныя гістарычныя падзеі, выступаюць для дзяцей адной з крыніц вывучэння этналогіі і гісторыі роднага краю.

Па меркаванні вядомага расійскага псіхолага В. Т Кудраўцава, значнасць казкі ў выхаванні дзіцяці заключаецца яшчэ і ў тым, што ў індывідуальным развіцці сучаснага ма- ленькага дзіцяці казка істотна дапаўняе гульню, пашырае перспектыву засваення дзіцём сферы «незвычайнага», уводзіць яго ў мэтафарычны свет яшчэ не рэалізаваных чалавечых магчымасцей і задумаў, дапамагае скласці сваю самабытную дзіцячую карціну свету, сфарміраваць спецыфічную сістэму поглядаў на ўніверсальныя прынцыпы пабудовы і развіцця рэчаіснасці.

Казка дапамагае дзіцяці назапасіць творчы вопыт агульначалавечага жыцця, што з'яўляецца неабходнай умовай актуалізацыі культуратворчай функцыі дзяцінства.

Казачны эпас беларусаў вызначаецца багатай вобразнай сістэмай, глыбокім зместам, арыгінальным сюжэтна-тэматычным складам. Пры гэтым беларускія народныя казкі пра жывёл лічацца жамчужынамі ўсяго ўсходнеславянскага эпасу, з'яўляюцца буйнейшым набыткам нацыянальнай духоўнай культуры, які і сёння захоўвае сваё эстэтычнае, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне.

Беларускія народныя казкі маюць шмат агульных рыс з казкамі іншых народаў свету, у першую чаргу ўсходніх славян. Агульныя вытокі ўсходнеславянскага фальклору, падобныя сюжэты і вобразы не прывялі да стварэння ўсеагульнага фальклорнага адзінства. Менавіта ў фальклоры інтэрнацыянальнае (усеагульнае) не выключае, а наадварот, захоўвае нацыянальнае, індывідуальнае. У беларускіх казках акрэсліваюцца нацыянальныя традыцыі, адлюстроўваецца беларускі быт і акаляючы навакольны свет.

Разам з казкамі захавальнікамі гістарычнай памяці народа выступаюць легенды і паданні. Праз легенды маленькае дзіця спасцігае такія маральна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

этычныя нормы паводзін у грамадстве, як сумленнасць, праўдзівасць, працавітасць. Легенды распавядаюць дашкольнікам пра розныя падзеі і з'явы, у іх часам апісваюцца амаль неверагодныя здарэнні, паказваюцца незвычайныя героі і іх дзівосныя ўчынкі і прыгоды і, разам з тым, у гэтых фальклорных творах акрэсліваюцца пэўныя маральна-этычныя нормы і сацыяльныя ідэалы: добрасумленнае стаўленне чалавека да працы, справядлівыя і добразычлівыя адносіны паміж людзьмі. Легенды акрэсліваюць многія маральна-этычныя нормы паводзін у грамадстве, якія патрабуюць ад людзей сумленнасці, праўдзівасці, працавітасці і многіх іншых якасцей, якія адносяцца да агульначалавечых каштоўнасцей.

Што да паданняў, то яны пазбаўлены фантастычнага, чароўнага элемента. Паданні скіраваны ў мінулае, асновай іх сюжэтаў звычайна служаць гістарычныя падзеі. Азнаям- ленне з імі дае магчымасць дзіцяці дакрануцца да гістарычнай памяці народа, да крыніц этналогіі і гісторыі роднага краю, адчуць свае духоўныя карані.

Гэтыя фальклорныя творы выступаюць для дзяцей як узор маральных паводзін, скарбніца розных лёсаў і характараў, сімвал чысціні і міласэрнасці. Яны дапамагаюць дзіцяці не толькі не згубіць, а нават і далей развіць той, дараваны ім ад самога нараджэння, дар дзяцінства, дзе душа і сэрца накіраваны на іншага чалавека.

Важнымі жанрамі ў фарміраванні эмацыйна-пачуццёвай сферы дзіцяці выступаюць музыныя жанры: песня, танец і ігра на народных інструментах. Гульня і танец выступаюць як важныя чыннікі ў гендэрным выхаванні дзяцей і моладзі.

Фарміравнню ўсіх вышэй акрэсленых якасцей у дзяцей прысвечана дзейнасць шэрагу установ нашай краіны – дзіцячыя садкі, сярэднія адукацыйныя школы і цэнтры дадатковай адукацыі. Такім чынам дзіця развіваецца і спасцігае “свет у сабе і сябе ў свеце” у так бы мовіць ва ўмовах фармальнага і нефармальнага навучання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Народныя гульні - адзін са старажытнейшых пластоў народнай творчасці; адна з сімвалічных форм паводзінаў чалавека, якая падтрымлівала яго увесь час. Шмат навукоўцаў лічуць, што **гульня** — від непрадуктыўнай дзейнасці, звязаны з дзеяннямі, абмежаванымі правіламі, якія накіраваныя на стварэнне, развіццё і падтрымку працэсу ў вызначаных межах. І што, задача працэсу — даставіць удзельнікам шэраг перажываньняў і эмоцыяў, даць працэсы, у якіх можна набыць новы досвед праз непасрэдны практычны ўдзел. Так, гульні звычайна звязаны з разумовай ці фізічнай стымуляцыяй, а часцей і з адным і другім, але ж многія гульні дапамагаюць не толькі развіць практычныя навыкі, яны служаць не толькі формай фізічных практыкаванняў ці выкананням адукацыйнай, стымуляцыйнай або псіхалагічнай ролі, разам з тым гульні, асабліва каляндарна-абрадавыя разумецца як сукупнасць народнай творчасці, як сістэма поглядаў на навакольны свет, традыцыйная духоўная культура ў цэлым у шматлікіх яе выяўленнях. Яны знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці ад абраднасці, і разглядаюцца не толькі ў мастацкім аспекце, але і як функцыянальны складнік народнага жыцця.

На працягу многіх стагоддзяў гульні жылі ў асяроддзі сваіх стваральнікаў, чуйна рэагуючы на ўсе змены, што несла з сабой гістарычнае развіццё і ў быце, і ў светапоглядзе, і ў сацыяльных стасунках.

Многія гульні паўсталі са старажытных часоў з абрадаў, але ў бытаванні яны на сёння на жаль не ўспрымаюцца як сродак былых вераванняў, а успрымаюцца толькі як сродак адпачынку і здабыцця карысных навыкаў.

Вылучаюць рытуальныя гульні (ігрышчы), якія з’яўляюцца неад’емнай часткай каляндарных і сямейных абрадаў, і ўтылітарна-практычныя (забавы), што былі сродкамі баўлення вольнага часу, маральна-эстэтычнага і фізічнага выхавання. Пазаабрадавая гульня (якіх была

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

большасць), нягледзячы на свой сімвалічны характар, прынцыпова адрозніваецца ад рытуалу — вышэйшай формы сімвалічных паводзін чалавека. Паводле функцыянальна-тэматычнага і каляндарнага прынцыпу, традыцыйныя беларускія гульні можна класіфікаваць наступным чынам:

**Каляндарна- і сямейна-абрадавыя гульні *(“ігрышчы”)***

1. ***Зімовыя*** («Жаніцьба Цярэшкі», «Яшчар», «Бахар», «Галка», «Падушачка», «Дрэма», «Закрытае шыла», «Лунёк» і інш.), што ўваходзілі ў структуру калядных святкаванняў;
2. ***Веснавыя*** («А мы ляда капалі», «Проса», «Мак», «Старац», «Жоравы», «Тур», «Цар», «Перапёлка», «Лука»), якія, як правіла, з'ўляліся часткаю абраду «Гуканне вясны» і выконваліся моладдзю ў форме разнастайных карагодаў;

***Летнія і восеньскія*** («Ваджэнне куста», «Кумаванне», «Цяцерка», «Збіванне конскай галавы», «Выкінь», «Яшчар», «Абразы», «Пячэнне ката» і інш.);

3. ***Сямейна-абрадавыя*** («Скраданне лялькі», «Цяганне доўбні», «Чобаты», «Цыганы»)

**Пазаабрадавыя гульні**

1. Гульні з інвентаром: з палкамі («Крэглі», «Чыжык-немец», «Пікар» і інш.), з мячом («Салавей», «Горад-поле», «Вышыбайла», «Гаротнік»), з іншымі прадметамі («Заганяка», качанне кола, качанне кружка, «Каменьчыкі», «Костачкі», «Бабкі»);
2. Гульні без інвентара: з бегам навыперадкі, лоўляй, пошукам з элементамі барацьбы і іншымі сілавымі прыёмамі, гульні, што патрабуюць назіральнасці і кемлівасці, з перавагай элементаў інтэрмеды і харэаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларуская каляндарна-абрадавая гульня — захавальнік працоўнага вопыту, які перадаваўся з пакалення ў пакаленне, і ў той жа час узбуджальнік творчай энергіі, новых ідэй і нават пэўных тэхнічных рашэнняў, якія з цягам часу рэалізоўваліся ў адпаведных умовах, а таксама, што гульні замацоўвалі многія маральна-этычныя нормы, якія рэгулявалі адносіны людзей у грамадстве і ў сям'і.

З усяго вышэй адзначанага можна вылучыць асноўныя традыцыйныя складаючыя ўласцівасці народнай гульні: *забаўляльнасць, выхаваўчы характар, утылітарнасць, магізм*. У гульнях моладзі ярка праяўляюцца *гендарная дыферэнцыяцыя роляў удзельнікаў* і *скіраванасць на выбар/усталяванне шлюбнай пары*. У гульнях дарослых адначаецца іх *выразная сувязь з хрэсьбінным або вясельным абрадам*, а таксама *імітатыўны і імправізацыйны характар дзеянняў удзельнікаў*. На аснове гэтага можна даць такое азначэнне паняццю *народная гульня* – гэта традыцыйны від дзейнасці чалавека, які вызначаецца спалучэннем разнастайных элементаў імітавання практычнай і духоўнай дзейнасці чалавека, мае забаўляльную накіраванасць і праводзіцца па пэўных правілах. А зыходзячы з накіраванасці дамінуючай функцыі народнай гульні, можна вылучыць асобныя групы народных гульняў: *магічныя (абрадавыя), утылітарныя, выхаваўчыя і забаўляльныя.*

Асобнай увагі варты танцавальна-гульнёвыя ігрышчы, якія спрыялі знаёмству хлопцаў і дзяўчат. Гэта абрадавыя і прымеркаваныя па часе і абставінах гульні нежанатай моладзі "Яшчар", "Бахар", "Жаніцьба Цярэшкі", "Халімон", "Падушачка", "Удавец", "Цяцерка", "Баяры", інш. Напрыклад, "Жаніцьба Цярэшкі" уяўляе сабой вясельна- тэатральную дзею ў якой спалучаецца тэатр, спевы, танцы, музыка, імправізацыя. Сутнасць гульні заключаецца ў магчымасці для моладзі праявіць сваю прыхільнасць для знаёмства, знайсці сабе пару. З боку старэйшых выбіраюць "бацьку" і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“матку”, якія сочаць за парадкам правядзення абраду “Жаніцьба Цярэшкі”, рытуальна-абрадавым частаваннем і агульным вяселлем, дзе няма гледачаў і выканаўцаў, усе з’яўляюцца ўдзельнікамі. Даволі часта пары-удзельнікі каляднай абрадавай гульні, потым спраўляюць сапраўднае вяселле.

На працягу стагоддзяў беларускі народ стварыў разнастайныя формы традыцый, якія адлюстроўваюць розныя бакі яго сацыяльнага жыцця. Найважнейшымі характарыстыкамі звычаёвых норм і стэрэатыпаў паводзін былі калектывізм і дапамога, дабрачыннасць, якая ў многімгрунтавалася і на хрысціянскай маралі. Гэта яскрава адлюстравалася не толькі ў традыцыйных беларускіх абрадах, розных жанрах славеснага і песеннага фальклору, але і ў шматлікіх звычаях прыцоўных і святочных збораў.

Уся гаспадарчая дзейнасць селяніна была зарыентаваная на пэўныя даты народнага календара і суправаджалася сістэмай звычаяў, абрадаў, магічных дзеянняў і павер’яў, накіраваных на забеспячэнне добрага ўраджаю і павелічэнне статку хатняй жывёлы. Пад уплывам хрысціянскай рэлігіі многія элементы народнай аграрнай абраднасці трансфарміраваліся і сталі прымяркоўвацца да пэўных дат царкоўнага календара, такіх як Ражаство, Вялікдзень, Тройца (Духа, Сёмуха) і г.д. Вылучым два асноўныя віды збораў членаў сялянскай грамады –*працоўныя* і *святочныя*.

Да *працоўных* адносяцца папрадкі ці піліпаўскія вячоркі, веснавыя (гнаявыя) талокі, дажынкавыя талокі. Да *святочных* збораў у народнай традыцыі, бясспрэчна, належаць вячоркі моладзі на Каляды, Масленіцу (Бабскі Аўлас), Саракі, гасцяванне і гулянне «ў біткі» на Вялікдзень, супольнае памінанне памерлых на Радаўніцу, архаічнае свята “Навіна”, Багач.

Акрамя таго, былі лакальныя мясцовыя святы – храмавыя святы, фэсты. Яны адзначаліся толькі ў пэўнай мясцовасці, але рэгулярна. Перыядычны характар насілі таксама *сходы сялян у карчме*, дзе вырашаліся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сялянскія пытанні. *Кірмашы* ў сістэме працоўных і святочных збораў займаюць своеасаблівае месца, чаму будзе прысвечаны спецыяльны параграф курсавой работы.

Пры характарыстыцы *працоўных* збораў у фальклорна-этнаграфічным аспекце мы выкарыстоўваем наступнае азначэнне: *працоўныя збор у сістэме сялянскай супольнасці – гэта сход людзей пэўнай полава-ўзроставай групы для сумеснага выканання пэўнага віду дзейнасці, светапоглядныімі асновамі працоўнага збору з'яўляюцца працоўная мараль, калектыўнасць, неабходнасць трансляцыі працоўнага вопыту і ўзаемадапамога.*

Да зімовых працоўных збораў мы адносім *Піліпаўскія вячоркі*. Пачыналіся яны ў праваслаўных з наступленнем перыяду посту перад святам Ражства Хрыстова з 28 лістапада па 6 студзеня. Удзельнікамі працоўных збораў былі змешаныя жаноча-дзявочыя пола-ўзроставыя катэгорыі. Узрост дзяўчат вагаўся ад 15-17 да 25 год. В. Бацяеў піша, што часам прысутнічалі замужнія жанчыны, бывала і такое, што старэйшая жанчына кантралявала ход працы. Некаторыя даследчыкі адзначаюць, што менавіта на гэтых зборах таксама маглі прысутнічаць і хлопцы. Іх прыход быў звязаны з мэтай унясення элементу адпачынку на так званых попрадках, падчас якіх разам выконваўся нялёгкі і манатонны працэс прадзення.

Галоўнымі атрыбутыўнымі сродкамі на гэтым працоўным зборы з'яўляліся *верацяно, лён, кудзеля, калаўрот ці прасніца*. Таксама немалаважным і вартым для ўзгадання з'яўляецца такі атрыбут, як *святочнае адзенне моладзі*. Дзяўчаты апраналі самыя лепшыя сарочкі, спадніцы, гарсэцікі, у асобных месах падпярэзваліся паясамі. Заплялі валасы ў адну і дзве касы, на шыю адзявалі розныя пацеркі. В. Бацяеў вылучае таксама і тое, што хлопцы таксама апраналі сваю лепшую вопратку і абутак. Галаўны ўбор упрыгожвалі нярэдка кветкай.

Падчас піліпаўскіх збораў выконваліся паставыя і прадзільныя песні. Як адзначае А. Гурскі, для паставых песен характэрна сур'ёзная тэматыка,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апавядальная ці дыялагічная форма і пераважна мінорны характар напеву. Асноўная тэматыка піліпаўскіх песень – хатняя жаночая праца, гаротнае сямейнае жыццё жанчыны-сялянкі, нядобразычлівасць з боку сваякоў мужа, нялюбы муж, муж п’яніца, смутак, туга па родным доме. Нязначнае месца сярод іх займалі песні жартоўнага зместу, якіх падвяргалася асмяянню няўменне прасці. Гучалі таксама песні любоўна-лірычныя і балады. Варта адзначыць, што песні, якія выконваліся на Піліпаўку суправаджаліся розным эмацыйным настроем, у тым ліку, і вясёлым. Удзельніцы папрадак атрымоўвалі душэўную раўнавагу за прасніцай, выказаючы свае думкі і пачуцці ў песнях.

Як ужо адзначалася, піліпаўскія песні прадстаўлены сюжэтамі сямейна-бытавога характару. У цэнтры ўвагі жанчын-папрадух – вобраз маладой жанчыны-праллі, лёс якой несчаслівы. Можна пагадзіцца з меркаваннем А. Ліса, што «мастацкія вобразы жартоўных піліпаўскіх песень ствараюцца найчасцей з выкарыстаннем травесці, прыёму абсурду».

У розных крыніцах паведамляецца, што пад канец вячорак, нягледзячы на пост, ладзілі танцы і гульні. Гулялі пераважна ў «Фанты», «Кальцо», «Явар», «Рэпу» і інш. Варта прыгадаць апісанне А. Гурскага аб тым, што калі дзяўчына хлопцу падабалася, то ён імкнуўся правесці яе да дому, прапанаваў паднесці прасніцу. У адказ дзяўчына таксама магла выказаць свае адносіны да хлопца. Напрыклад, калі пэўны хлопец не падабаўся, то дзяўчына пазбягала провадаў дахаты, не давала паднесці прасніцу.

Мэта піліпаўскіх працоўных збораў заключалася ў наступным: сумеснае выкананне пэўнага віду гаспадарчай дзейнасці (*прадзенне*), трансляцыя працоўнага і маральна-этычнага вопыту ў жаночым асяроддзі. Таксама вячоркі выконвалі камунікатыўную функцыю ў коле дашлюбнай моладзі.

Да веснавых працоўных збораўмы адносім *гнаявыя талокі*. Некаторыя даследчыкі пішуць, што гнаявыя талокі ладзіліся пераважна ў веснавы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перыяд (больш пэўнай даты збораў намі не выяўлена). Удзельнікамі гэтага працоўнага збору былі пераважна мужчыны, але, як адзначаюць некаторыя даследчыкі, збіраліся таксама жанчыны, моладзь і нават дзеці з шасці-сямі гадоў.

Удзень гнаявой талакі вывозілі арганічныя ўгнаенні разам на прыбраныя ад зімовага збожжа полі. Неад’емнымі атрыбутамі з’яўляліся гаспадарчыя прылады працы – *вілы, воз* і іншыя. Па словах В. Цітова, да абеду праца спынялася, і гаспадар павінен быў частаваць працаўнікоў. Таму важнымі атрыбутамі на частаванні былі *пірагі, бліны, капуста ды піражкі*. Абавязкова на стол падаваўся *квас*. Пасля адпачынку праца аднаўлялася. А ўжо пасля заканчэння працы гаспадар зноў частаваў памочнікаў, але да ўсяго пачастунку варылася яшчэ і каша, якую падавалі ў гаршках, да яе належыла выставіць масла і піва, частавалі таксама віном і брагаю.

Што тычыцца гулянняў і песень, то варта адзначыць, што яны спраўляліся, менавіта для працаўнікоў, якія ўгнойвалі палі і звычайна заканчваліся баляваннем. Але ў літаратуры не ўзгадваецца, якія пераважна гульні ладзілі. А вось, што тычыцца менавіта песень, то Т. Валодзіна ў сваёй працы «Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў» адзначыла, што талочныя песні выконваліся як падчас сумеснай работы, так і пасля яе. Яны ўваходзяць у сістэму розных каляндарных абрадаў і цыклаў, а таксама могуць выконвацца сітуатыўна, як, напрыклад, на талочным застоллі. Увогуле, найменне «талака» азначае і тэматычныя групы бяседных песень, якія ўваходзяць у веснавы, летні, асенні і зімовы цыклы, і жанравую падгрупу веснавых песень часу вывазкі гною (Усходняе Паазер’е).

Т. Валодзіна вылучае наступную ўнутрыжанравую класіфікацыю талочных песень: песні з міфічнымі матывамі; песні, якія перадаюць характар талочнай працы, талочнага застолля, адметнасць талакі як гаспадарча-абрадавай з’явы; пераважна лірычныя песні, традыцыйна замацаваныя за талочнай працай, талочнай урачыстасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам мэтай гнаявых талокаў як працоўных збораў з'яўляецца выкананне гаспадарчай дзейнасці ў кансалідаваным сялянскім соцыуме. Талака, садзейнічае яднанню абшчыны, дае ўдзельнікам фізічную, псіхалагічную разрадку, фарміруе, як ужо адзначалася, унутранае адзінства і своеасаблівую працоўную культуру.

Варта аднесці да летніх працоўных збораў *жніўную (дажынкавую) талаку,* як від сумеснай працы, талокі ладзіліся ў канцы жніўня, да хлебнага Спаса. Як паведамляў П. Шпілеўскі, у Беларусі дажынкі адзначаліся вельмі ўрачыста, а на апошні дзень жніва збіралася талака ці па просьбе гаспадара, ці па загаду пана, ці па ўласнай ініцыятыве. Удзельнікамі збораў былі пераважна дзяўчаты і жанчыны. Але некаторыя даследчыкі пішуць, што на талаку да канкрэтнага гаспадара прыходзілі яго суседкі, родныя, сябры, а на панскае поле – амаль уся жаночая палова сялянскай грамады. Галоўным атрыбутам быў *серп*, а таксама *дажынкавы сноп, кветкі (пераважна васількі), вянок, каласкі жыта, стужкі*. Таксама да атрыбутаў адносім стравы: *каша з усякім прыдаткам і смачнай заправай, віно, хатняя брага, хлеб* і шмат іншых.

Дажынкавая талака суправаджалася вялікай колькасцю песень. Урачысты і ўзнёслы тон дажынкавых песень адпавядаў настрою хлебаробаў, якія па-сапраўднаму маглі адчуваць і разумець урачыстасць і значнасць свята заканчэння жніва. Вяртаючыся з поля ў вёску і на застоллі яны былі значна весялейшыя за жніўныя песні, бо ў апошніх спявалася пра нялёгкую працу і долю жней і іх дзяцей. Вечарам адбывалася бяседа, ладзілі танцы. Выконвалі жнеі ў час дажынак і абрадавы танец «Талакуха», наперадзе ўсіх кружылася «Багіня», а іншыя дзяўчаты, стоячы, топалі нагамі і падскоквалі, не сыходзячы са свайго месца і размахваючы хусткамі. Потым усе дзяўчаты даганялі «Багіню» і, абкружыўшы яе, кланяліся ёй, а яна, седзячы на зямлі, спявала: «*Да іграла сонейка, // небагата іграла, // у хмарку схавалася, // дажджу баялася. // Камарочкі вы мае, // не кусайце вы мяне, // а кусайце вы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*жнеек, што мне ўстаць неяк...».* Важным момантам з'яўляецца яшчэ і тое, што, разыходзячыся пасля дажынак дадому, жнеі дзякавалі гаспадару за пачастунак, пры гэтым «Багіня», звяртаючыся да яго, казала: «Дай божа табе, нябожа, абсяваць, насяваць, а нам жаць, дажынаць». Што тычыцца гульняў, то пра іх у навуковай літаратуры не ўпамінаецца. Мэтай дажынкавых талочных збораў з'яўляецца ўзаемадапамога ў надзвычай важнай гаспадарчай дзейнасці (*збор ўраджаю жыта*), услаўленне гаспадара і саміх удзельніц талакі, пажаданне ўрадлівасці на будучы год.

Пры характарыстыцы *святочных* збораў у фальклорна-этнаграфічным аспекце мы выкарыстоўваем наступнае азначэнне: *святочны збор у сістэме сялянскай супольнасці – гэта прымеркаваны да пэўнага свята народнага календара сход людзей некалькіх полава-ўзроставых груп з рэкрэатыўна-камунікатыўнымі мэтамі.*

Да зімовых святочных збораў мы адносім зборы моладзі на *Каляды*, якія адзначаюцца з 6 па 25 студзеня. Калядныя вячоркі ладзілі на працягу Каляд практычна кожны вечар, прычым часта у карчме. Як адзначаюць некаторыя даследчыкі, удзельнікамі гэтага святочнага збору з'ўлялася пераважна моладзь, але ў якасці назіральнікаў маглі таксама прысутнічаць і старэйшыя члены абшчыны. На калядныя зборы адбываўся своеасаблівы агляд патэнцыйных жаніхоў і нявест. Вызначым атрыбуты, якія выкарыстоўваліся ў гэты час. Па-першае, можна указаць *святочныя строі моладзі,* па-другое, пачастункі (*цукеркі, абаранкі, піва*). Пра святочныя вячоркі найбольш клапаціліся хлопцы, таму яны збіралі грошы на частаванне і музыкантаў, дамаўляліся наконт месца.

На святочных калядных зборах гучала вельмі многа песень, прыпевак, загадак, жартаў, напоўненых народным гумарам і вымыслам. Акрамя гэтага гулялі ў гульні, а таксама ладзілі танцы. Што тычыцца загадак і жартаў, то ў беларусаў іх загадванне і адгадванне адбывалася пераважна ў восеньскія вечары, але даследчык А. Гурскі адзначае, што іх выконвалі пераважна на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каляды. Вельмі важнае значэнне мелі калядныя песні на зборах. Можна сказаць, што без іх не абыходзіліся святочныя вячоркі. У многіх песнях даволі часта можна пачуць такія матывы: *«Ражство - Калядам прыхажство, // Васілле - Калядам красілле, // Святое Крашчэнне - Калядам прашчэнне».* Без танцаў святочныя калядныя зборы не абыходзіліся. Асабліва папулярнымі былі кадрыля, полька. Танцавалі таксама вальс, мазурку, кракавяк. На гулянні захоўвалася поўная роўнасць, і дзяўчаты не мелі права адмовіцца ад танцаў нават з нялюбым хлопцам. Танцы маглі доўжыцца некалькі дзён запар, а «калі моладзь разыйдзецца, то – аж да чатырох сутак».

Мэтай святочных калядных збораў была камунікацыя рознаполавых груп дашлюбнай моладзі з гульнёва-забаўляльнымі і матрыманіяльнымі мэтамі.

Да святочных збораў таксама адносіцца *«Бабскі Аўлас» на Масленіцу.* Не мае пэўнай прымеркаванасці. У навуковай літаратуры адзначаецца, што удзельнікамі былі пераважна замужнія жанчыны, а часам і дзяўчаты «спраўлялі Ўласа». А. Райкова заўважае: « «Бабскі Аўлас» адзначаўся толькі жанчынамі, што збіраліся разам і балявалі ўсю ноч (своеасаблівыя рэшткі жаноцкіх пола-ўзроставых хаўрусаў), мужчыны на святкаванне не дапускаліся, а калі і сустракаліся па дарозе, то павінны былі адкупіцца. Каб павялічыць надоі малака ў кароў, жанчыны пілі піва ў гэты час толькі з дайніц».

Атрыбутыўнымі сродкамі служылі сані, якія былі ўпрыгожаны папяровымі кветкамі, на іх садзілася гаспадыня якога-небудзь двара і аб’язджала ўсю вёску. Астатнія дзяўчаты яе везлі, некаторыя ішлі ззаду. Збруя таксама ўпрыгожваліся кветкамі і стужкамі. У беларусаў дзень Аўласа лічыўся і «каровіным святам», і каб не наклікаць на сваю жывёлу бяду, яе карміліі аладкамі, спецыяльна спечанымі гаспадыняй зранку, рогі кароў упрыгожвалі верасам, а пазней і папяровымі кветкамі. Да іконы Святога Аўласа ў час збору прыносілі масла – гэтыя элементы таксама будуць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

служыць атрыбутамі і ў іншых рытуалах. Прымаўкі пра Аўласа пацвярджаюць сказанае вышэй, напрыклад: *«Аўлас на масла лас», // «У Аўласа барада ў масле», // «На Аўласа бяры каўшом масла».*

У гэты тыдзень пераапранутыя адпраўляліся ў якую-небудзь вялікую хату і там гулялі ўсю ноч, спявалі песні, танцавалі. У Шумілінскім раёне Віцебскай вобласці жанчыны яшчэ клалі чапялю на падлогу, скакалі над ёй і спявалі наступную песню: «*Гоп, мае дранічкі, // Гоп, мае ячны. // Чаго, мае драчанікі, // Горкія, нясмачны»*. Мэта такіх збораў заключаецца ў тым, што сваім эмацыянальным кліматам, яркасцю, незвычайнасцю, весялосцю і багаццем абмяжоўваюцца чалавечыя паводзіны. Існуюць разнастайныя формы: гульнёвыя, вярбальныя, сімвалічныя, метафарычныя, ці драматычныя – усё гэта падаецца ў мінулае пэўнага сацыяльнага калектыву, групы.

Да веснавых святочных збораў таксама патрэбна аднесці *Саракі*, якія адзначаюцца 22 сакавіка. Удзельнікамі святочнага збору былі пераважна дзеці, моладзь, а вось наконт старэйшых ўзроставых груп інфармацыі прасочваецца вельмі мала. Некаторыя даследчыкі пішуць, што старэйшыя жанчыны заставаліся дома, гатуючы абрадавае печыва – «жаваранкі».

Важнымі атрыбутамі былі *арэлі*, на якіх гушкалася моладзь, а вось што тычыцца дзяцей, то ім рабіліся меншыя *гойданкі*. Так, у Шумілінскім раёне Віцебскай вобласці казалі, «каб камары не елі». Некаторыя даследчыкі адзначаюць, што гушканні на арэлях суправаджаліся залівістым смехам, гучнымі рытмізаванымі заклічкамі і нават невялікімі песеннымі творамі, якія выконвалі ролю замовы. Таксама В. Цітоў піша пра тое, што гушканне на арэлях заўсёды звязвалася з дабрабытам і новым ураджаем.

Варта ўзгадаць і ролю калыханак на Саракі. Яны ўтрымлівалі ў сабе выразную эратычную функцыю. Дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту мовай асацыятыўных сімвалаў «уцягвалі» хлопцаў у вір кахання, заляцання і спадзявання (фактычна напрошваецца прамая паралель з абрадам дзяльбы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

караваю на вяселлі і тымі эратычнымі пажаданнямі, якія яго суправаджалі). У такт рытмічнаму калыханню (у якім бачылася сімволіка сексуальных зносін і апладнення) дзяўчаты ў рэчытатыўным стылі выкрыквалі наступныя магічныя словы: «*Калышы, калышы // Мяне, старую! // А будзеш калыхаць // Пасля мяне, старой, // Маладую».* Сакральны сэнс гэтых слоў празрысты і зразумелы: дзяўчына перадшлюбнага ўзросту – «старая» для дзіцячых люлянняў-калыханняў. А вось пасля замужжа, калі ў іх народзіцца дзяўчынка, то якраз яе і трэба будзе калыхаць.

Мэтай збораў моладзі на *Саракі* было камунікацыя дашлюбнай моладзі з гульнёва-забаўляльнымі і матрыманіяльнымі мэтамі, варажба і прадуцыраванне дабрабыту на будучы год.

Таксама давеснавых святочных збораў адносім *гасцяванне і гулянне ў біткі на Вялікдзень*. Гэтае свята не мае пэўнай, пастаяннай прымеркаванасці ў народным календары. А. Ліс піша, што адзначалі свята ўрачыста, гатавалі багата страў. Даследчыкі адзначаюць, што ўдзельнікамі з’яўлялася моладзь, якая ўвечары збіралася ў карчме і ладзіла вечарынку. Пазней падыходзілі і дарослыя – паглядзець, як іх дзеці гуляюць, якія яны прыгожыя, ладныя, спрытныя ў скоках.

Галоўнымі атрыбутам на Вялікдзень былі *фарбаваныя яйкі, булкі, пірагі*. Кожная гаспадыня рыхтавала святочныя стравы: смажыла мяса, каўбасу, варыла цыбульнае шалупінне і фарбавала ў яго адвары велікодныя яйкі. «*Свята Вялічка — з красным яічкам*», — гаворань у народзе. Яйка з'яўляецца вельмі важным атрыбутам велікодных дзён. Яно сімвалізавала сабой, з аднаго боку, сусветную прастору, нашу галактыку, а з другога — кругаварот і бясконцасць жыцця, пачатак усякага адраджэння да жыцця. Як і ў большасці іншых славянскіх народаў, нашы продкі афарбоўвалі велікодныя яйкі ў зялёны, блакітны, чырвоны, жоўты колер, рабілі яйкі-пісанкі, расчэрчаныя або расфарбаваныя рознымі сімвалічнымі ўзорамі і колерамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На другі дзень Вялікадня адбывалася гасцяванне. Сваякі, суседзі, знаёмыя пачыналі хадзіць і ездзіць адзін да аднаго ў госці. Асаблівасцю велікодных баляванняў была наяўнасць вялікай колькасці страў і напояў. Сяляне з апошніх сіл імкнуліся зрабіць святочны стол і прыём гасцей вельмі шчодра. Не прыйсці ў гэты святочны дзень у госці да сваіх хроснікаў і не прынесці ім падарункі лічылася ў беларускай вёсцы мінулага стагоддзя ганебным, а таму ўсе трымаліся гэтага звычаю.

Вельмі важна прыгадаць зборы менавіта на гульню ў біткі, калі стукаліся велікоднымі яйкамі і пераможцам быў той, у каго яно заставалася цэлым. Туканкі гэтыя прадаўжаліся амаль увесь тыдзень. Абавязковым элементам свята былі велікодныя песні.Гэта народныя творы каляндарна-абрадавай паэзіі, прысвечаныя да*Вялікадня*. Калі валачобныя песні мелі абрадавы характар і выконваліся на першы дзень свята, то да велікодных песень звярталіся даўжэй, і яны мелі не толькі абрадавае, але і гумарыстычнае значэнне.
Некаторыя даследчыкі ўсё ж не зусім аддзялялі адна ад адной тыпы гэтых песень, тым больш, што паступова велікодныя песні растварыліся ў іншых цыклах і пачалі страчваць самастойнасць.Даследчык А. Ліс адзначае, што да Вялікадня былі прымеркаваны велікодныя песні, якія спявалі больш доўгі час. Яны мелі бытавы, пераважна гумарыстычны характар.

Мэтай гэтых збораў было памінанне памерлых родзічаў, рытуальныя трапезы, велічанне гаспадароў.

Варта ўзгадаць супольнае памінанне памерлых на *Радаўніцу* (у большасці рэгіёнаў Беларусі адзначаецца праз тыдзень пасля Вялікадня ў аўторак). Удзельнікамі гэтага святочнага збору з'яўляліся практычна ўсе полава-ўзроставыя катэгорыі насельніцтва. Урачыста апранутыя людзі: старыя, малыя, дзеці – маўкліва рассаджваліся вакол магілы, дзе гаспадыня на бялюткім абрусе выставіла шматлікія стравы. Мужчыны ў час памінання сядзелі без шапак. Далей памінальнае дзеянне развівалася паралельна з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

частаваннем, успамінамі, месцамі – галашэннямі. Атрыбуты Радаўніцы можна выразна падзяліць на дзве часткі: для памерлых і для жывых.

Атрыбутамі для ўшанавання памерлых служылі*сподак, чарка*, у якую налівалі гарэлку і закрывалі (перакрывалі) *лусткай хлеба, асвячонае ў храме яйка.* А таксама традыцыя патрабавала *ручнік, фартух, вянок,* што прыстасоўвалі на крыж. Павязвалі белы ручнік, калі пахаваны мужчына, невялічкі белы фартушок — калі жанчына, прымацоўвалі белы вянок — калі дзяўчына.

Тыя, хто прыйшоў на могілкі, прыносілі абрус, які засцілалі на магілу, яго выкарыстоўвалі толькі адзін раз на год і потым захоўвалі да наступнай Радаўніцы. У некаторых хатах, як паведамляюць этнографы, захоўвалася да 20 абрусаў, па колькасці магіл родных і сваякоў. Шырока вядомы звычай ад кажнай стравы адкладаць пакрысе на магілу, гарэлка і мядовая сыта выліваліся тут жа. Абрадавую ролю выконвала чарка, якая заставалася на магіле і ніколі не ўжывалася для піцця з яе.

На Радаўніцу выконваліся своеасаблівыя формулы-запрашэнні душ памерлых: «*Святыя радзіцелі, хадзіце да нас хлеба і солі кушаць, старыя і малыя*». Аднак мы дададзім, што абавязковымі былі аповеды-ўспаміны аб лёсе канкрэтнага продка і рысах яго асобы. Да магілы час ад часу запрашалі сваякоў і знаёмых, якія праходзілі міма, для таго каб разам памянуць. Трапеза працягвалася даволі доўга, на свежых магілах галасілі. Галашэнне з'яўляецца важнай састаўной часткай вербальнага комплексу Радаўніцы. Іншых узораў народнай творчасці на Радаўніцу практычна не зафіксавана.

Правядзенне Радаўніцы завяршалася вечарам у сям'і, некаторыя ішлі ў карчму. Пасля вяртання ўсе імкнуліся быць разам дома. Прыказка "Раніцай працуюць, удзень плачуць, а ўвечары скачуць" выразна характарызуе настрой і характар правядзення Радаўніцы. Можна сцвярджаць, што мэтай гэтага святочнага збору было ўшанаванне ўласных памерлых родзічаў і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкананне маральна-этычнага абавязку перад сялянскай абшчынай (аддане даніны памяці і іншым памерлым).

Да восенькіх святочных збораў адносім архаічнае свята *Навіна*, якое не мае пэўнай прымеркаванай даты. Але Л. Салавей адзначае той факт, што яно адбывалася восенню, менавіта ў паўночна-заходніх раёнах Беларусі у верасні блізка да восеньскага раўнадзення, перад святам *Багач* (*Багатуха*). Удзельнікамі гэтага святочнага збору была радня, якая, як адзначаў С. Салавей, нейкім чынам папярэдне дамаўляліся, да каго ехаць. Атрыбутамі служылі стравы, усё, што вырасла за лета: ягады, садавіна, гародніна і іншыя. Таксама на навіну клікалі тады, як закалолі свінню (*на свежаніну*). У навуковай літаратуры няма звестак пра тое, ці спяваліся якія-небудзь песні, ці ладзіліся танцы, гульні на святочны збор. Верагодна, на святочным застоллі выконваліся і бяседныя, і жартоўныя песні, і песні пра каханне, а таксама – прыпеўкі. Мэтай збору *Навіна* з'яўляецца ўшанаванне ўраджаю, здабытку ці плёну дзеля дабрабыту роду і ўсёй сялянскай грамады.

Да восеньскіх святочных збораў адносім свята *Багач*, якое адзначаецца 21 верасня. Удзельнікамі гэтага збору былі амаль усе полава-ўзроставыя групы. У многіх беларускіх вёсках на Багача адзначалі прастольнае свята, да якога прымяркоўваўся кірмаш, куды з'язджаліся сваякі і сябры з навакольных вёсак, прывозілі сельскагаспадарчыя прадукты на продаж, узамен куплялі мануфактурныя вырабы, абменьваліся навінамі, адпачывалі, весяліліся.

Атрыбутыўнымі сродкамі з'яўляецца святочнае адзенне і стравы, прыгатаваныя для застолля, а таксама сявенька з жытам і пшаніцай, васковая свечка. Л. Мінько і М. Піліпенка пішуць, што з багачом абыходзілі двары ў вёсцы, а на заканчэнне зганялі на выгане статак і абносілі вакол яго Багач. Пасля свята яго ставілі ў хаце пэўнага гаспадара і пакідалі да наступнага жніва. За гэта ён частаваў удзельнікаў урачыстага абыходу. Цікавы момант адзначае В. Бацяеў: «к вечару жанчыны перааранаціся ў «цыганоў»



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(мужчынскае адзенне, старцоўскае) і пачыналі хадзіць па хатах. Зайшоўшы на сядзібу, жадалі здароўя, добрага ўраджаю, шчасця і прасілі дары: *«Можа, хазяечка, дасі што для душы»*. Усе гаспадыні давалі што-небудзь «цыганам». Яны збіралі гэта ў фартухі».

Урачыста апранутыя людзі  дзяліліся на групы па ўзросту і полу: старэйшыя гутарылі, успаміналі розныя жыццёвыя здарэнні, падлеткі гулялі ў розныя гульні, а маладыя хлопцы і дзяўчаты наладжвалі танцы.

У этнаграфічнай літаратуры звесткі пра гэтыя зборы амаль што адсутнічаюць. Але за падставу можна ўзяць прыказкі і прымаўкі, якія звязаныя са святам Багач. Вось, напрыклад: *«Багач — бярыся за рагач (саху), ідзі пад авёсарацьь», // «Прыйшоў Багач — кідай рагач, бяры сявеньку, сей памаленьку»*. Ад цяжкіх работ пад восень сяляне добра стамляліся, асабліва жанчыны*: «Да Багача баба рабача, па Багачы — хоць за плот валачы»*. Адзначаецца, што традыцыйнае застолле суправаджалася не толькі песнямі і жартамі, але і танцамі. На жаль, звестак практычна няма, пераважна якія песні спяваліся, але даследчык В. Бацяеў сцвярджае, што ў беларусаў былі спецыяльныя кірмашовыя, або «піўныя» песні, якія спявалі і ў час застолля, і па дарозе з кірмаша. А вось, што тычыцца танцаў,  то па звестках В. Цітова яны ладзіліся наступным чынам: «танцы пад час фэстаў адрозніваліся ад танцаў, што наладжваліся кожную нядзелю. Для святочных гулянняў абавязкова нанімалі музыкаў з іншай вёскі і не толькі гарманістаў, але і скрыпача, і цымбаліста. Ім плацілі грошы, сабраныя моладдзю, яшчэ давалі прадукты харчавання і кармілі на працягу свят».

Мэтай гэтага святочнага збору была акцэнт на сацыяльна-абшчынная камунікацыя.

Адметнаю з’явай у культурным жыцці павятовай шляхты, сялян, гарадскіх і месцячковых жыхароў з’яўляліся кірмашы. *Кірмаш – святочна абстаўлены расшыраны гандаль, што адбываўся перыядычна ў пэўнай*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*мясцовасці. Прымяркоўваўся да пэўнага прастольнага або храмавага свята (фэсту), ад якога часта атрымліваў назву* (троіцкі, ільінскі, спасаўскі, пакроўскі і інш.).

З выразных праяў гульнёвай, музычнай і харэаграфічнай народнай творчасці на вясковых кірмашах танцы, песні, гульні складалі неад’емную частку забаў.

Пазаабрадавыя і прымеркаваныя па часе і абставінах бяседы, гасцяванні, вячоркі і вечарыны садзейнічалі кансалідацыі грамадства і выконвалі псіха-тэрапеўтычную функцыю для грамады і кожнага чалавекапаасобку (душэўныя шчыраванні і спавядані ў лірычных песнях; вясёлыя, задзірыстыя прыпеўкі, артыстычныя гумарэскі і гульні, г.д.)

## Раздзел III. Сцэнарна-рэжысёрская распрацоўка і ўвасабленне традыцыйных абрадаў і пазаабрадавыхпобытавых практык

### 18. Рэжысёрскі аналіз традыцыйнага абраду

Пытанні

1. Гісторыка-рэтраспектыўны аналіз развіцця народных свят і абрадаў як старажытных містэрый
2. Рэжысёрі рэжысёрскае майстэрства
3. Рэжысёрскае бачанне абрадавай дзеі

Літаратура па тэме:

1. Аляхновіч, А. Методыка работы рэжысёра з фальклорнымі калектывамі / А. Аляхновіч // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зб. навук. прац удзельнікаў IV Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 29–30 красавіка 2010 г.) / БДУКМ; рэдкал.: М.А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2010 – С. 104 – 105.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Блок В., Система Станиславского и проблемы драматургии, М., 1963. – С. 31.

3. Горчаков Н., Режиссёрские уроки К. С. Станиславского, 3 изд., М., 1952. – С. 68.

1. Гуд П. А. Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей./П.А. Гуд – 2-е выд., стэрэатып. – Мн.: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2006. – 137 с.
2. Камінскі, А.Я. Рэжысура традыцыйнага абраду: вучэб.-метад. дапам. / А.Я. Камінскі. – Мінск: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009.– 112 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каляндарна-абрадавую традыцыю варта разглядаць як эмацыйна збалансаваную сістэму жыццятворчасці соцыума ў прыродным асяроддзі, адну з галоўных форм арганізацыі мыслення і паводзін людзей у сумеснай працы, маленні звышнатуральным сілам аб ураджаі, плёне ў гаспадарцы і сям'і, абагаўленні сіл прыроды.

Матывацыя абрадавых практык (вербальных, этнафанічных, пластычных, маскіравання) у традыцыйнай супольнасці закладзена псіха-фізічнай патрэбай у забеспячэнні збалансаванасці быцця чалавека ў рытме з прыродай, касмічнымі і жыццёвымі цыкламі.

Старажытнымі формамі пакланення, ушанавання, услаўлення звышнатуральных сіл, адказных за парадак у сусвеце, выступае абрад (рытуал як яго частка), а таксама буйныя святы, містэрыі.

**Містэрыя, містэрыі**(грэч.mysterion- таямніца). 1.Сакраментальная дзея, сістэма рэлігійныхабрадаў, здзяйсняецца ўзамкнёныхрэлігійныхбрацтвахўантычныхнародаўі народаўстаражытнагаУсходу ўгонартыхабо іншыхбагоў (Элевсинскиемістэрыі, Орфическиемістэрыі).

2.Сярэднявечнаярэлігійнаядрамаз сюжэтам, запазычанымзсастарэлагаабо новагазапавету3.Рэлігійна-містычная сімвалічнаядрама,разгледжвальнаясімвалістаў, як вышэйшаяформасінкрэтычнымастацтва (нясконачаная містэрыяСкрабіна).

Таксама гэтым слова абазначаецца служэнне, абрад.

Містэрыі Старажытнай Грэцыі ўяўляюць арыгінальны эпізод у гісторыі рэлігій і ў многіх адносінах да гэтага часу з'яўляюцца загадкамі. Самі старажытныя надавалі вялікае значэнне містэрыя: толькі прысвечаныя ў іх, па словах Платона, атрымліваюць асалоду пасля смерці, а па сцвярджэнні Цыцэрона - містэрыі вучылі і жыць добра, і паміраць з добрымі надзеямі. Усталяванне іх узыходзіць да часоў аддаленай старажытнасці; ў гістарычныя часы, асабліва з VI стагоддзя н. э., іх колькасць ўсё больш і больш павялічвалася; а ў канцы IV ст. да н. э. не быць прысвечаным ў якія-небудзь містэрыі з'яўлялася прыкметай няверы або індэфернтызма.

Асобныя віды містэрый, якія называліся ***«святамі прысвячэння»*** (грэч. τελεταί όργια) у грэкаў, ***ініцыяцыі*** (лац. initiatio) у рымлян, паказваюць на прысутнасць у містэрыях вышэйшых рэлігійных ведаў і абнаўлення праз іх, а таксама моцнай узбуджанасці ці экстазу. Ачышчэнне, ахвяраванні і збольшага пакаянне ў грахах, з аднаго боку, працэсіі, песні, танцы, розныя іншыя праявы экстазу - з другога, складалі істотнае ўтрыманне містэрый. Сюды далучаецца элемент сімвалізму і алегорыі, які атрымлівае выраз у «дзеяннях» і «словах» містэрый. Пад імі трэба разумець сам богаслужбовы рытуал містэрый - з яго відовішчамі, спевамі, музыкай і танцамі. Само пранікненне ў змест містэрыяй для ўдзельнікаў у іх быў паступовым ў працэсам «прысвячэння». Звычайна адрозніваліся 2 ступені - папярэдняе ***прысвячэнне***, якое надавала ўдзельніку статус *міста* (грэч. μύστις), і канчатковае ***сузіранне*** містэрый (грэч. έποπτεία), якое робіць яго эпоптом («сузіральнікі»). Толькі апошні мог зрабіцца мистагогом (грэч. μυστᾰγωγός), гэта значыць быць ***кіраўніком*** іншых у містэрыях (гэта значыць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***рэжысёрам!***). Вучэнне, што праводзілася ў містэрыях, было, відаць, больш адухоўленым і магчыма збольшага спэкулятыўным, у параўнанні з народнай верай; яно не прапаведвала дагматычна, але ўводзілася ў свядомасць удзельнікаў містэрый шляхам розных відовішчаў і драматычных дзеянняў. Абавязковая таямніца ставяцца ў абавязак ўдзельнікам містэрый. Павага да містэрый была такая вялікая, што ў той час як звычайныя міфы маглі беспакарана падвяргацца пародыям ў камедыях і т. п., адносна містэрый такія ўчынкі лічыліся блюзнерствам і мелі наступствы ў цяжкім пакаранні. Містэрыі былі ці дзяржаўныя, якія адбываліся згодна з дзяржаўным пастановаў (напрыклад, Элеўсінскія), або дазволеныя выключна для асоб аднаго полу (Дыянісіі, Фесмафорыі), або, нарэшце, незаконныя, якія часам нават пераследваліся (Арфічныя містэрыі, містэрыі Мітры, Кібелы і інш.).

***Элевсинские містэрыі***здзяйсняліся штогод у гонар Дземетры (багіні ўрадлівасці і земляробства) і Коры (Персефоны - багіні ўрадлівасці і царства мёртвых), у Элеўсіне; месцам паходжання іх лічаць Старажытны Егіпет; ў Грэцыі яны былі вядомыя яшчэ ў дагістарычныя часы. Галоўнае ўтрыманне іх - міф аб выкраданні Персефоны (альбо Дземетры). Прысвячацца маглі ўсе эліны, без адрознення грамадскага становішча, полу, племені або дзяржавы, пазней доступ атрымалі і рымляне. Асобы заганныя і злачынцы не маглі быць прысвечаны. Жадаючы прысвяціцца браў у кіраўнікі містагога з афінскіх грамадзян і дапускаўся да малых містэрый, затым ужо да вялікіх; паміж гэтымі двума прысвячэннямі існаваў прамежак не менш за год. Пасля прысвячэння яны здзяйснялі ахвярапрынашэнні і затым уступалі ў храм, дзе ў глыбокім змроку ночы здзяйснялі пераходы з адной часткі сьвятыні ў іншую; па часах разлівалася асляпляльнае святло і раздаваліся страшныя гукі. Гэтыя эфекты выраблялíся рознага роду тэхнічнымі прыстасаваннямі, але тым не менш пакідалі ўражанне. Страшныя сцэны змяняліся светлымі, заспакойлівымі: адкрываліся дзверы, за якімі стаялі статуі і ахвярнікі; пры яркім святле паходняў прысьвячаных прадстаўляліся упрыгожаныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

